КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №35 (163)
◂ 25 ВЕРАСНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



ЧАС ВАЕННЫХ РАЗМІНАК

Стар. 4

**НАЙВЯЛІКШАЯ МАДЭЛЬ У ГІСТОРЫІ**

60 гадоў таму нарадзілася дзяўчынка, якая зрабіла рэвалюцыю ў мадэльным бізнесее

Стар. 20

**ПАЧАТАК КАНЦА**

У XVI стагоддзі Маскоўскае княства і Польскае каралеўства сышліся ў вайне за перадзел земляў Вялікага княства Літоўскага

Стар. 23

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АўтаSTOPам па Еўропам**

Нататкі Рамана Абрамчука

▸ СМІ

# ПАДЗЕЛЕНАЯ СВЯДОМАСЦЬ

Вольга ХВОІН

**Нас прызвычаіліся дзяліць на «чэсных» і «нячэсных», вызначаць, каму дзе стаяць і з якога ракурсу здымаць, каго прапусціць на мерапрыемства, а каго адправіць «пагуляць». Тым, хто знаходзіцца па адзін бок умоўнага, але дастаткова адчувальнага падзелу, наўрад ці зразумець іншых, па-за акрэсленай рысай. Адсюль і рознае асэнсаванне ўмоў, у якіх мы працуем, вызначэнне значнасці тых ці іншых нормаў, якія рэгулююць нашу працу і ў выніку само быццё, бо журналіст — не прафесія, а стыль жыцця.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Злева направа: Марыюс Лукашунас, дарадца па камунікацыі і інфармацыі Маскоўскага офіса ЮНЭСКА; Андрэй Аляксандраў, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў; Рохан Асока Джайасякера, намеснік дырэктара і асістэнт рэдактара арганізацыі Index on Censorship («Індэкс цэнзуры»); Марк Грубер, Еўрапейскі судырэктар Міжнароднай федэрацыі журналістаў; Джэйн Мёлер Ларсэн, праграмны каардынатар арганізацыі International Media Support («Міжнародная медыя падтрымка»)

«Мы — не палітычная місія, а група арганізацый, якія маюць досвед і веды ў працы з міжнароднымі стандартамі. Наша мэта — ацаніць сітуацыю з прэсай і ўмовы працы журналістаў», — заявілі на брыфінгу прадстаўнікі міжнароднай журналісцкай місіі ў складзе прадстаўнікоў розных арганізацый (сярод якіх Дацкі саюз журналістаў, Міжнародная федэрацыя журналістаў, «Міжнародная медыя-падтрымка», ЮНЭСКА ды іншыя), што на працягу трох дзён вывучала сітуацыю са сродкамі масавай інфармацыі ў Беларусі. Самі ўлады зрабілі ўчынак, які мусіць дапамагчы ўдзельнікам місіі асэнсаваць сапраўдны падыход да прэсы, свабоды слова і доступу да інфармацыі. Адной з удзельніц дэлегацыі — сябру арганізацыі Civil Rights Defenders (былога Шведскага Хельсінкскага камітэта) Ёане Кураш — не далі беларускай візы. Выбарачнасць і нераўназначнасць у адносінах як да сваіх, так і да чужых.

У шэрагу сустрэч, якія мелі медыя-эксперты ў Беларусі, варта адзначыць візіт у Адміністрацыю прэзідэнта да першай намесніцы кіраўніка гэтай установы Наталлі Пяткевіч. Чыноўніца запэўніла міжнародных экспертаў, што ў бліжэйшы час будзе вырашана пытанне лібералізацыі працэдуры вылучэння частот для электронных СМІ. Аднак жа дакладнага тэрміну гэтай знакавай падзеі не акрэсліла, што ў беларускіх рэаліях можна трактаваць як абяцанне ўсяго толькі падумаць на гэтую тэму.

Паводле спадарыні Пяткевіч, зараз «сітуацыя ў СМІ змяняецца, хай сабе не моцна і павольна». І тут у журналістаў, што працуюць па-за лініяй, якую даўно акрэсліла дзяржава, узнікае заканамернае пытанне: у чым сітуацыя змянілася? Ты, шаноўны чытач, трымаеш зараз у руках нумар газеты «НЧ». Але ці падпісаўся ты на газету на пошце, ці, можа, набыў у кіёску па дарозе на працу? Не. Дзяржаўныя ўстановы ставяць выдаўцоў незалежных СМІ ў няроўныя ўмовы, у становішча жабрака, які вымушаны прасіць чыноўнікаў аб міласці — друкавацца, распаўсюджвацца, увогуле працаваць. А спадарыня Пяткевіч, паводле слоў Еўрапейскага судырэктара Міжнароднай федэрацыі журналістаў Марка Грубера, не згодная, што ў Беларусі дзяржаўныя і недзяржаўныя СМІ знаходзяцца ў няроўных умовах. Па старой завядзёнцы, чыноўніца ўнікала адказваць на такія нязручныя для яе пытанні, як пра ролю аддзелаў дзяржаўнай ідэалогіі ў працы сродкаў масавай інфармацыі.

Пацікавіліся эксперты ў Наталлі Пяткевіч і перспектывамі магчымай прыватызацыі беларускіх СМІ, у першую чаргу, з вялікай доляй дзяржавы ва ўстаўным капітале. Чыноўніца, паводле іх слоў, быццам бы і не супраць такіх новаўвядзенняў, бо «прыватызацыя дазволіць эканоміць дзяржаўныя сродкі». Аднак жа зноў ніякай канкрэтыкі.

Намеснік дырэктара арганізацыі «Індэкс цэнзуры» Рохан Асот Джайасякера лічыць, што «акрамя асобных момантаў, у экспертаў адбыўся адкрыты абмен меркаваннямі з намесніцай кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта», што і было мэтаю экспертаў. Але ці не выглядае гэта самападманам?

Беларускія журналісты без перабольшвання жывуць у іншым, адрозным ад еўрапейскіх калег вымярэнні. Нас часцей хвалюе не што напісаць, а як знайсці інфармацыю, як абараніць сябе і сваё выданне ад магчымых судовых позваў, штрафаў і закрыцця, як не сесці на «суткі», калі пайшоў асвятляць вулічную акцыю. А ў высновах місіі часта гучалі словы «адкрыта, шчыра». Не ў піку еўрапейскім экспертам, але, відаць, не прызвычаіліся, што іх суразмоўцы могуць трымаць за пазухай камень.

Паказальнай з'яўляецца заўвага, што ў суразмоўцаў экспертаў (а гэта чыноўнікі, рэдактары і журналісты як дзяржаўных, так і недзяржаўных СМІ) розныя прыярытэты. Два бакі падзелу журналісцкай супольнасці (дэфакта ў Беларусі ён надзвычай выразна акрэслены) па-свойму ставяцца да праблемы доступу да інфармацыі, маюць нятоеснае разуменне таго, што для грамадства важна. Быццё вызначае свядомасць. Марк Грубер лічыць, што мусяць існаваць празрыстыя і зразумелыя правілы. Ды найперш, відаць, гэтыя правілы павінны быць аднолькавыя і абавязковыя для ўсіх.

Папярэдняя справаздача еўрапейскіх экспертаў у галіне СМІ будзе падрыхтавана на працягу некалькіх дзён. Затым яе прадставяць у Стакгольме 16 кастрычніка кіраўніцтву Швецыі, якая цяпер старшынствуе ў Еўрасаюзе. Дакумент мусіць быць узгоднены з кожнай арганізацыяй, чые прадстаўнікі знаходзіліся ў складзе дэлегацыі. Адзнака місіі будзе грунтавацца на міжнародных нормах. І хочацца верыць, што эксперты мелі дастаткова часу, каб скласці для сябе аб'ёмную карціну з сапраўднай сітуацыяй у галіне сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі, а не адлакіраваны для еўрапейскага вока лубок.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### АСТРАВЕЦ. «EKOTOPFILM 2009»

Рэпартаж «Атамны Астравец» Мікалая Ваўранюка прайшоў адбор да ўдзелу ў конкурсе 36-га Міжнароднага фестывалю фільмаў, звязаных з тэматыкай збалансаванага развіцця, «Ekotopfilm 2009», які адбудзецца 19–23 кастрычніка ў Браціславе. Рэпартаж знаёміць гледачоў з праблемай будоўлі атамнай электрастанцыі. Тэма АЭС у Беларусі — краіне, што пацярпела ад Чарнобыльскай катастрофы, нікога не пакідае абыякавым. Мікалай Ваўранюк у сваёй стужцы падае меркаванні жыхароў Астравецкага раёна: як сябраў пратэстнага камітэту, так і прыхільнікаў будоўлі АЭС, якія спадзяюцца на новыя месцы працы і развіццё рэгіёна. У «Атамным Астраўцы» гучаць аргументы фізікаў, якія падтрымліваюць развіццё атамнай энергетыкі, эколагаў і медыкаў, што даследуюць наступствы катастрофы ў Чарнобылі. Мікалай Ваўранюк вось ужо два гады супрацоўнічае з тэлеканалам «Белсат». Ён вядомы сваім шматгадовым досведам журналісцкай працы ў Беластоцкім аддзеле Польскага грамадскага тэлебачання TVP S.A.

### ВІЛЕЙКА. ЗНОЎ ПРА КРЫЖЫ

19 верасня ў вілейскую міліцыю былі запрошаны вілейскія актывісты спадары Малярчук, Наркевіч, Сюдак. Яны 15 верасня падпісалі заяву супраць зносу крыжоў на месцы расстрэлу Расціслава Лапіцкага, стваральніка ў пасляваенны час маладзевай антыбальшавіцкай арганізацыі супраціву. Але ж замест разбору самой заявы ў міліцыі ім паведамілі, што ідзе адміністратыўны працэс. Вілейскі райвыканкам звярнуўся ў РАУС, каб міліцыя разабралася з удзельнікамі несанкцыянаванага мітынгу. Менавіта так райвыканкамаўскія ідэолагі назвалі мерапрыемства па ўсталёўцы крыжоў. Туды ж прыкладзена заява і дырэктара Вілейскага лясгасу, які патрабуе «разабрацца» з крыжамі на тэрыторыі яго ўгоддзяў. Супраць актывістаў заведзена справа.

Нагадаем, што 1 верасня, на дзень нараджэння Расціслава Лапіцкага, людзі ўсклалі кветкі на месца расстрэлу, усталявалі крыжы.

### МАСТЫ. ПА СВЕЦЕ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Шасцідзесяцігадовы старшы трэнер мастоўскай ДЮСШ па лёгкай атлетыцы, былы настаўнік фізкультуры, дванаццаціразовы чэмпіён Беларусі і сярэбраны прызёр чэмпіянату свету па паліятлону Іосіф Лісай шмат падарожнічае. Сёлета на веласіпедзе «Аист» паехаў на Азоўскае мора. Па словах спартсмена, паездка заняла 39 дзён, ён праехаў 3850 кіламетраў, з'еў каля 300 кілаграмаў памідораў і схуднеў на 12 кілаграмаў. Першая паездка на вялікую адлегласць адбылася ў 1992 годзе, калі Іосіф паехаў на заробкі ў Польшчу і даехаў на веласіпедзе да Мазурскіх азёраў. З 1998 года ён стаў падарожнічаць рэгулярна. У 2002 годзе Лісай пабываў на месцы Грунвальдскай бітвы, праз год даехаў да Сопату. У 2006 годзе аб'ехаў увесь Крым. На наступны год плануе паездку зноў на Грунвальд, дзе адбудзецца святкаванне 600-годдзя бітвы, пасля чаго марыць з'ездзіць у Грэцыю.

Багаж падарожніка просты, і ў ім усё неабходнае — намёт, спальнік, цёплыя рэчы, парасон, рэмкамплект, відэакамера, фотаапарат. З ёжы — толькі сала. Садавіну, гародніну, хлеб купляе ў мясцовых жыхароў.

## ЗВАРОТ

# СУПРАЦЬ ПАДАЎЛЕННЯ МІРНЫХ АКЦЫЙ

**Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінскі камітэт» (БХК) звярнуўся да міністра ўнутраных спраў Анатоля Куляшова з просьбай аб асабістай сустрэчы для абмеркавання наяўнай практыкі падаўлення мірных акцый. Пра гэта паведаміў кіраўнік БХК Алег Гулак.**

«БХК у адпаведнасці са статутам, а таксама дзеючым заканадаўствам праводзіць назіранне за правядзеннем масавых мерапрыемстваў у Рэспубліцы Беларусь. Згодна са справаздачамі назіральнікаў БХК, большасць праведзеных у Мінску ў 2009 годзе масавых мерапрыемстваў, арганізаваных палітычнымі партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі і групамі грамадзян, былі прымусова спынены супрацоўнікамі міліцыі, у некаторых выпадках прымянялася фізічная сіла. Назіральнікі зафіксавалі шматлікія выпадкі збівання, некаторыя з удзельнікаў акцый атрымлівалі цялесныя пашкоджанні. У разгонах бралі ўдзел людзі ў цывільным і без апазнавальных знакаў, што з'яўляецца недапушчальным; яны перашкаджалі працы журналістаў», — гаворыцца ў лісце.

«БХК лічыць, што разгон і прымяненне фізічнай сілы супрацоўнікамі міліцыі да ўдзельнікаў мірных акцый з'яўляліся незаконнымі, паколькі грамадзяне рэалізоўвалі свае канстытуцыйныя правы на свабоду сходаў... Удзельнікамі акцый не ўчынялася дзеянняў, якія дазвалялі б сілам аховы правапарадку спыняць акцыі... Факт правядзення сходаў без адпаведнага дазволу органаў улады сам па сабе не азначае, што быў парушаны грамадскі парадак. Дзеянні ўдзельнікаў сходаў не мелі вынікам часовага спынення нармальнай дзейнасці ўстаноў, прадпрыемстваў, грамадскага транспарту, а таксама не наносілі шкоды здароўю, законным правам і інтарэсам грамадзян. Гэта азначае, свабода сходаў не магла быць абмежавана супрацоўнікамі міліцыі», — піша БХК.

«Мы думаем, што асабістая сустрэча з Куляшовым будзе найбольш эфектыўным спосабам абмеркавання існуючай сітуацыі з забеспячэннем свабоды мірных сходаў і дазволіць знайсці шляхі вырашэння ўзнятых у звароце праблем з улікам інтарэсаў усіх бакоў», — лічыць Гулак.

Нагадаем, вечарам 16 верасня ў Мінску была разагнана акцыя ў сувязі з 10-годдзем зніknення палітыка Віктара Ганчара і бізнесмена Анатоля Красоўскага. Усе ўдзельнікі (прыкладна 35 чалавек) былі затрыманы і дастаўлены ў Цэнтральнае РУУС Мінска. Назіральнікі БХК зафіксавалі выпадкі збівання ўдзельнікаў акцыі. Супрацоўнікі праваахоўных органаў і людзі ў цывільным перашкаджалі працы журналістаў і назіральнікаў.

**Паводле БелаПАН**

## ПРАЦА

# ДАМАГЛІСЯ АСВЯТЛЕННЯ ВУЛІЦ

*Алесь ЗАРЭМБЮК*

**Актывісты Руху «За Свабоду», у рамках грамадскай кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну», дамагліся асвятлення Чыгуначнага мікрараёна ў Мастах. Днямі на вуліцах мікрараёна было дадаткова ўсталявана 30 новых вулічных ліхтароў.**



Як паведаміў адзін з ініцыятараў кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» Васіль Клімовіч, людзі жылі б са сваімі праблемамі яшчэ доўга, каб не звярнуліся да іх па дапамогу: «Мы разам з жыхарамі напісалі калектыўны зварот, дзе выклалі ўсе свае прапановы, сабралі 230 подпісаў пад ім і працягвалі з мясцовай уладай перапіску наконт гэтых праблемаў. З цяжкасцямі, але ж праблемы жыхароў Чыгуначнага раёна пачалі вырашацца».

Паводле словаў Васіля Клімовіча, каб дамагчыся вырашэння праблемы дарог, асвятлення, ліквідацыі сметнікy актывістам кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» давялося накіроўваць у Мастоўскі райвыканкам і раённы Савет калектыўны зварот і пісаць у дзяржаўныя інстанцыі на працягу 5 месяцаў. «У выніку нам удалося дамагчыся ўсталявання 30 дадатковых ліхтароў», — адзначыў Клімовіч.

Грамадская кампанія «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» стартавала ў лістападзе 2008 года. У рамках яе актывісты дэмакратычных арганізацый Мастоўскага раёна займаюцца вырашэннем актуальных для раёна праблемаў. У Чыгуначным раёне Мастоў, акрамя дадатковага асвятлення, грамадскія актывісты дамагліся рамонту кавалка дарогі, якая злучае Чыгуначны мікраёрэн з цэнтральнай часткай горада Масты, ліквідацыі сметніку па вул. Чкалава, невялікага ямачнага рамонту вуліцы Янкі Купалы. Зараз актывісты кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» дамагаюцца правядзення газіфікацыі раёна, рамонту дарогі, па якой транспартуюцца мінеральныя ўгнаенні на базу дачнычага прадпрыемства «Мастоўскай сельгастэхніка», і займаюцца вырашэннем іншых актуальных для горада праблем.

## ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

### НЕ СТАЛА ЯШЧЭ АДНАГО ШЧЫРАГА БЕЛАРУСА

**Не стала пастаўскага паэта, журналіста і публіцыста Алеся Касценя.**

Ён вядомы многім далёка за межамі Паставаў па сваіх публікацыях на старонках газет «Звязда», «Вольнае Глыбокае» і іншых выданняў, да якіх Алесь спрычыніўся. Ягоная апошняя кніга «Каменчыкі ў кірзавым боце» выйшла ў свет у 2009 годзе. Фактычна кніга — аўтабіяграфія аўтара, яна распавядае пра тыя гады, калі Алесь служыў у войску.

Выказваем шчырыя спачуванні родным і сваякам Алеся Касценя.

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### БРАСЛАЎ. АМАТАРСКАЯ ВЫШЫЎКА

20 верасня ў адной з выставачных залаў Музея традыцыйнай культуры Браслава адбылося адкрыццё выставы аматарскай вышыўкі «Чароўнае майстэрства». На ёй было прадстаўлена некалькі дзесяткаў прац мясцовых майстроў у тэхніцы вышывання крыжыкам. Як адзначылі наведвальнікі, на першы погляд нельга было сказаць, што маляўнічыя палотны — прадукт звычайнай вышыўкі. Майстры і сапраўды прадставілі работы, якія можна параўнаць з шэдэўрамі выяўленчага мастацтва. Тэхніка выканання работ самая разнастайная: ад вышыўкі бісерам, з падборам нахілу і каларыстыкі бісерын, да вышыўкі звычайнымі ніткамі рознага колеру з вельмі дакладным падборам адценняў. Уражвае на выставе і тое, што ўзрост вышывальшчыкаў таксама разнастайны: гэта і малыя дзеткі са сваімі сюжэтамі і бачаннем свету, і людзі сталага ўзросту, якія адкрылі для сябе мастацтва вышыўкі даўно.

### ГЛЫБОКАЕ. «ПРЭФЕКТ-ІНФО»

У крамах і грамадскіх месцах Глыбокага з'явілася новая газета «Прэфект-інфо». Яна рэкламная, распаўсюджваецца бясплатна і павінна выходзіць штотыдзень. Газета — поўнакаляровая, друкуецца ў Мінску. Выдавец газеты — Яраслаў Бернікові, вядомы ў горадзе палітык, былы кандыдат у дэпутаты. Мяркуецца, што газета будзе выходзіць не толькі ў Глыбокім, але і ў суседніх раёнах.

### ПЕРАБРОДДЗЕ. «УСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ НА МЯСЦОВЫМ УЗРОЎНІ»

Перабродскі сельскі савет выбралі для ажыццяўлення праекта ЕС/ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Высокакласныя эксперты на ягонай тэрыторыі правядуць трэнінгі па падрыхтоўцы неабходных змен для паляпшэння ўзроўню жыцця. Самае важнае, што ініцыятыва з месцаў можа атрымаць істотную фінансавую падтрымку, калі будуць распрацаваны рэальныя праекты. Дарэчы, у гэтым рэгіёне падтрымкай еўрапейскіх арганізацый заручыўся і самы маленькі горад краіны Дзісна, які хоча развіваць замежны турызм і палепшыць экалагічную сітуацыю.

### КОХАНАВА. ПАПЯРЭДЖВАЮЧЫ СПІС

Пасёлак Коханава рыхтуецца адзначыць сваё 500-годдзе. Аднак стан яго вельмі занядбаны, як, дарэчы, і многіх іншых населеных пунктаў Беларусі, дзе яшчэ не праходзілі «Дажынкі». Актывісты грамадзянскай кампаніі «Наш дом», каб дапамагчы ўладам давесці Коханава да прыстойнага выгляду, стварылі фотатэку мясцінаў, небяспечных для жыцця і здароўя грамадзян. Першае месца займаюць незачыненыя люкі калодзежаў водаправодаў, другое — разбураныя ходнікі, на трэцім — адсутнасць папярэджваючых знакаў перад так званымі «ляжачымі паліцэйскімі».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, ДЗЕНЬ ПРЫЙДЗЕ НОВЫ!

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Хто казаў, што ў Беларусі крызіс не дасягнуў дна? Дзе тыя эканамісты, якія абвяшчалі новую хвалю крызісу? Не дачакаецеся! У нас усё добра, а будзе яшчэ лепш! Прынамсі, такія высновы можна зрабіць за мінулы тыдзень.**

Беларусь мае добрую антыкрызісную праграму, якая апраўдала сябе часам. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі 22 верасня ў Мінску на сустрэчы з кіраўнічым дырэктарам нямецкага банка АКА «Аўсфуркрэдыт-Гезэльшафт мбХ» Хансам-Йоргам Тотам.

Сідорскі адзначыў, што сусветны фінансавы крызіс не абышоў бокам Беларусь. Антыкрызісную праграму давялося карэктаваць. Цяпер, прагнуў кіраўнік урада, многія краіны заяўляюць пра выхад з рэцэсіі.

«Але мы ставімся да гэтага пытання аб'ектыўна і робім усё, каб эканоміка Беларусі адчувала сябе больш упэўнена ў такіх умовах. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца тое, што ВУП Беларусі сёлета знаходзіцца ў межах 100% узроўню 2008 года, гэта значыць, фактычна мы ідзем па планцы мінулага года», — сказаў прэм'ер-міністр.

Ён таксама падкрэсліў, што ўрад не здымае амбіцыйных задач, якія пастаўлены перад эканомікай. «Мы працягнем рэалізацыю інвестыцыйных і інавацыйных праграм на найбліжэйшыя тры-пяць гадоў. Пры агульным спадзе эканомік суседніх дзяржаў тэмп росту інвестыцый у Беларусі складае сёлета каля 117 працэнтаў», — сказаў прэм'ер-міністр.

А лепш нам будзе таму, што рэалізацыя праектаў у рамках праграмы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» можа быць пачата ў 2010 годзе. Пра гэта заявіў намеснік міністра замежных спраў Валерый Варанецкі, адказваючы 22 верасня на пытанні дэпутатаў падчас пасяджэння камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Паводле слоў дыпламата, у праектах, якія падрыхтаваны Беларуссю, акцэнт робіцца на развіцці транзітнай інфраструктуры, стварэнні транспартных калідораў, а таксама пытаннях, звязаных з транспартным забеспячэннем і спрашчэннем мытных працэдур.

Намеснік міністра паведаміў, што гэтыя праекты цяпер абмяркоўваюцца з Літвой, Латвіяй, Украінай, Польшчай, але пакуль Еўракамісія толькі выпрацоўвае механізмы іх зацвярджэння і магчымай рэалізацыі.

Варанецкі таксама адзначыў, што восенню гэтага года ў Стакгольме павінна адбыцца сустрэча старшыняў камітэтаў па міжнародных справах парламентаў краін — удзельніц праграмы «Усходняга партнёрства». Паводле яго слоў, на сустрэчы плануецца разгляд падыходаў да арганізацыі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння паміж структурамі Еўрасаюза і дзяржавамі — удзельніцамі «Усходняга партнёрства».

Але не толькі ў дзяржаўных структурах расце аптымізм. Здаецца, што і на вуліцы беларускіх прадпрымальнікаў перакуліўся грузавік з цукеркамі. Ці, прынамсі, частка яго рассыпалася.

Падрыхтаваны шэсць нарматыўна прававых актаў, якія спрашчаюць дзейнасць суб'ектаў малога бізнесу. Частка з іх знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі прэзідэнта, частка — ва ўрадзе. Пра гэта на прэс канферэнцыі 22 верасня ў Мінску паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Аляксандр Тапілін.

«Гэтыя ўказы таксама вырашаць праблемы дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, якія тычацца мытнага афармлення і падатковай нагрузкі, што ў канчатковым выніку будзе ўплываць на кошт, — адзначыў Тапілін. — Але ў цэлым яны будуць закранаць дзейнасць суб'ектаў малога бізнесу».

Паводле слоў спецыяліста, адзін з дакументаў будзе звязаны са зменай умоў падаткаабкладання з мэтай паніжэння падатковай нагрузкі на прадпрыемствы, у тым ліку ПУПы, якія будуць пастаўляць прадукцыю на экспарт.

«Магчыма, будзе паніжана стаўка падатку ўдвая, можа быць выключаны з базы падаткаабкладання аб'ём выручкі ад рэалізацыі прадукцыі на экспарт», — адзначыў Тапілін. Паводле яго слоў, пакуль гэта праект, і ў якім выглядзе ён будзе прыняты, ён не ведае.

Ён таксама адзначыў, што ўсе прапановы, якія ўнеслі прадстаўнікі бізнесу, у праектах дакументаў улічаны.

Тапілін нагадаў, што ў адпаведнасці з распараджэннем прэм'ер-міністра створана рабочая група для аператыўнага аналізу сітуацыі, выпрацоўкі мер і аказання суб'ектам малога прадпрымальніцтва падтрымкі па рэалізацыі беларускіх тавараў на ўнутраным і знешнім рынках. Пасяджэнні гэтай групы праходзяць кожны тыдзень, і пра выніку паведамляецца прэм'ер-міністру. «Група створана для арганізацыйнай і нарматворчай працы для зняцця перашкодаў у дзейнасці суб'ектаў малога прадпрымальніцтва пры набыцці і рэалізацыі беларускіх тавараў», — адзначыў Тапілін.

І, нарэшце, здаецца, у нас будзе беларускамоўны універсітэт. У Беларусі існуюць грамадскія ініцыятывы, якія ставяць задачу стварыць універсітэт у сферы нефармальнай адукацыі, паведаміла эксперт Агенцтва гуманітарных тэхналогій Святлана Мацкевіч на пасяджэнні «круглага стала» ў Мінску 22 верасня.

Паводле слоў Мацкевіч, у Беларусі значная колькасць прафесіяналаў высокага ўзроўню не могуць працаваць у сферы дзяржаўнай вышэйшай адукацыі. Краіна дагэтуль дэманструе «дастаткова высокую эфектыўнасць каманднa-адміністрацыйных метадаў работы з чалавечым рэсурсам ва ўмовах пераходнай і змяшанай эканомік», аднак пры абмеркаванні колькасных ацэнак, структуры сістэмы адукацыі не фіксуецца якасны бок пытання. На думку эксперта, у Беларусі шмат пісьменных людзей, але «сістэма адукацыі культывуе стары тып савецкага мыслення».

Былы прарэктар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, прафесар Уладзімір Дунаеў адзначыў, што такі універсітэт мог бы знайсці сваё месца ў нацыянальнай сістэме адукацыі і пры пэўных умовах дабіцца эканамічнай эфектыўнасці. На думку Дунаева, перспектыўным рынкам адукацыйных паслуг можа стаць электроннае навучанне, якое ў Беларусі «знаходзіцца на засмучальна нізкім узроўні». Менш чым 1 працэнт студэнтаў вучацца праз электронную дыстанцыйную адукацыю. Вызначальным рэсурсам развіцця для незалежнай ВНУ магла б стаць беларускамоўная адукацыя, лічыць Дунаеў. Ён падкрэсліў, што гэтая ніша застаецца пустой, нягледзячы на даволі выражаную грамадскую патрэбу ў такой ВНУ.



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЕГ РАЖКОЎ



Журналіст з Гомеля Алег Ражкоў атрымаў другое папярэджанне ад пракурора за супрацоўніцтва з тэлеканалам «Белсат». Пракурор абласной пракуратуры Алеся Рабцава запатрабавала ад журналіста тлумачэнняў да заявы галоўнага лекара абласнога псіхіятрычнага шпіталя Віктара Маторанкі. Апошні паскардзіўся ў пракуратуру на тое, што Алег Ражкоў разам з Таццянай Бублікавай прыйшлі ў шпіталь з бэджамі «Белсат» і папрасілі пракаментаваць спыненне кантракту з лекарам-псіхіятрам, сябрам аргкамітэту партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Сяргеем Трыфанавым. Пракурор Рабцава зрабіла журналісту вуснае папярэджанне, маўляў, калі надалей будуць нейкія скаргі ад грамадзян, то пракуратура прыцягне журналістаў да адміністрацыйнай адказнасці. Быў таксама зроблены запыт у Міністэрства замежных спраў наконт таго, ці маюць Алег Ражкоў і Таццяна Бублікава акрэдытацыю. Тэлеканал «Белсат» раней звяртаўся па акрэдытацыю для журналістаў у МЗС Беларусі, але ім адмовілі з-за няпоўнага камплекту пададзеных дакументаў.

### ІРЫНА БАБЕЦКАЯ



Беларуска Ірына Бабецкая заваявала золата на чэмпіянаце свету па летнім біятлоне, які стартаваў у нямецкім Аберхофе. У жаночай кросавай гонцы на 3 кіламетры беларускія спартсменкі выступілі выдатна. Ірына Бабецкая заваявала залаты медаль, пераадолеўшы дыстанцыю за 11 хвілін і 43,1 секунды пры адным промаху на дзвюх агнявых межах. Другой фінішавала яшчэ адна наша біятланістка Вольга Назарава, якая прайграла пераможцы адну секунду, таксама дапусціўшы адзін промах. Трэцяе месца заняла немка Юліяна Доль. Ірына Бабецкая нарадзілася ў Лагойску, у біятлоне з пяцігадовага ўзросту (ад 1991 года). Сёлета спартсменка таксама выйграла масавы старт летняга чэмпіянату Еўропы, які праходзіў у Чэхіі.

### УЛАДЗІМІР АРЛОЎ

У свет выйшла чацвёртая кніга паэзіі Уладзіміра Арлова пад назвай «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся». У зборнік увайшлі творы, напісаныя цягам аднаго года. «Шмат якія вершы нарадзіліся, калі я быў яшчэ ў аддзяленні рэанімацыі пасля прыгодаў з маім сэрцам. А потым вершы працягвалі пісаца ў шпіталі. І таму гэта кніжка адлюстроўвае не толькі мой светапогляд апошняга года, але ў нейкім сэнсе і маё новае светабачанне, светаразуменне і светаўяўленне», — тлумачыць спадар Уладзімір сэнсавае напаўненне кнігі. На вокладках — гравюра «Літва XV стагоддзя» і партрэт паэта, напісаны мастаком Арленам Кашкурэвічам. Адкрываецца кніга вершам «Полацак». «Гэта кніга амаль да апошняга дня перад друкарняй мела іншую назву. Яна называлася «Востраў Полацак», — падзяліўся паэт з «Радыё Свабода» гісторыяй стварэння кнігі. — Але мой сябар Валянцін Акудовіч да апошняга настойваў, каб я змяніў назву. Вось раптам прыйшла назва «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся». А назву «Востраў Полацак» я пакінуў у запасе і мару напісаць кнігу прозы, у якой будуць новыя полацкія апавяданні. Бо для мяне Полацак — гэта сапраўды востраў, выспа ў гэтым акіяне, куды нас закінула жыццё».

Пра сябе і свой жыццёвы шлях Уладзімір Арлоў, надзвычай вядомы і папулярны ў Беларусі пісьменнік, расказвае так: «Я нарадзіўся ў год змяі паводле ўсходняга календара, у год смерці Сталіна паводле календара савецкага. Паз знакам Дзевы, у радзільні насупраць Сафійскага сабору. Я марыў у дзяцінстве стаць дзяўчынкай, потым вадалазам, потым паталагаанатамам, потым шпіёнам. Але лёс склаўся так, што насуперак волі бацькоў, якія хацелі, каб я стаў хірургам, я стаў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ ў далёкім 1970 годзе. Калі нічога беларускага апроч назвы ў БДУ ўжо не заставалася. Я ўдзячны сваёй альма-матэр не за атрыманыя там веды з нацыянальнай гісторыі, а за атрыманае там разуменне, што якраз гэтых ведаў нам і не давалі. Але, на вялікае шчасце, тады да нас прыйшлі кнігі Уладзіміра Караткевіча, і гэта быў адзін з тых знакаў лёсу, якія прадвызначылі мой далейшы шлях».

Фота Юрыя Дзядзінкіна



З НАГОДЫ

## ЗША РАЗМЕСЦЯЦЬ У ПОЛЬШЧЫ БАЯВЫЯ КОМПЛЕКСЫ

**Зенітныя ракетныя комплексы Patriot, якія ЗША абяцалі размясціць на тэрыторыі Польшчы па просьбе Варшавы, будуць баявымі, а не навучальнымі, як было агаворана раней.**



Па словах польскага міністра замежных спраў Радэка Сікорскага, прапанова аб размяшчэнні баявых комплексаў сыходзіла ад Вашынгтона. Варшава ўхваляе гэту ініцыятыву і спадзяецца, што комплексы Patriot стануць часткай польскай абароннай сістэмы.

17 верасня стала вядома, што ЗША адмаўляюцца ад размяшчэння на тэрыторыі Польшчы і Чэхіі элементаў сістэмы СРА. Раней меркавалася, што ў Польшчы будуць размешчаныя ракеты-перахопнікі. Адміністрацыя прэзідэнта ЗША растлумачыла, што змена планаў звязана з новымі ацэнкамі ракетнай пагрозы з боку Ірана.

Афіцыйны прадстаўнік Пентагона Джэф Морэл у сваю чаргу растлумачыў, што сістэма СРА ў Еўропе задумвалася як сродак процідзеяння іранскім міжкантынентальным ракетам. Аднак апошнія дадзеныя выведкі паказваюць, што Іран засяродзіўся на распрацоўцы ракет малой і сярэдняй дальнасці, і таму сістэма СРА ў тым выглядзе, у якім яна была запланаваная, павінна быць зменeная.

Разам з тым, па дадзеных крыніцы Пентагона, змены ў планах ЗША ў дачыненні да СРА ва Усходняй Еўропе не азначаюць, што Польшча і Чэхія застануцца па-за справамі. «Папросту будзе размешчаная іншая сістэма», — заявіў Морэл. Міністэрства абароны ЗША мае намер замяніць сістэму СРА ва Усходняй Еўропе універсальнай сістэмай эшаланаванай абароны.

Стварэнне еўрапейскай сістэмы супрацьракетнай абароны ЗША было пачата ў 2002 годзе пры Джорджы Бушы-малодшым. Размяшчэнне ракет СПА на польскай тэрыторыі планавалася ў адпаведнасці з дамовай аб стратэгічным партнёрстве, падпісанай паміж ЗША і Польшчай у жніўні 2008 года. Меркавалася, што спачатку зенітна-ракетныя комплексы будуць увозіцца на тэрыторыю Польшчы часова, а з 2012 года іх размесцяць там на пастаяннай аснове разам з амерыканскім кантынгентам вайскоўцаў.

Ініцыятыва выклікала рэзкую рэакцыю Расіі, якая абвінаваціла ЗША ў пагрозе бяспецы і прыстрашыла ў адказ размясціць у Калінінградскай вобласці ракетныя комплексы «Іскандэр».

**Паводле www.lenta.ru і www.rosbalt.ru**

З НАГОДЫ

## NATA ПРАПАНУЕ СУПРАЦУ РАСІІ

**NATA не адмаўляецца ад планаў прыняць у свае шэрагі Украіну і Грузію, але пакуль гэтыя краіны не адпавядаюць крытэрам Паўночнаатлантычнага альянсу, заявіў генеральны сакратар NATA Андэрс Фог Расмусен.**



«Мы прынялі вельмі выразнае рашэнне падчас сустрэчы ў Бухарэсце ў 2008 годзе, у адпаведнасці з якім Грузія і Украіна стануць сябрамі NATA. Вядома ж, пры гэтым маецца на ўвазе, што яны будуць выконваць усе неабходныя крытэры. Мы выдатна ведаем, што ў дадзены момант яны гэтым крытэрам не адпавядаюць», — адзначыў генсек Паўночнаатлантычнага ваеннага альянсу.

Па словах генсека, цяпер «вельмі актыўна вядзецца супрацоўніцтва ў рамках камісіі Грузіі і NATA, робіцца неабходныя крокі для будучага сяброўства краіны ў альянсе, задзейнічана штогадовая праграма супрацоўніцтва NATA з Грузіяй». «Спадзяюся, што падчас майго знаходжання на пасадзе генеральнага сакратара NATA будзе сур'ёзны прагрэс у гэтым накірунку», — сказаў Расмусен.

Адначасова Андэрс Фог Расмусен прапанаваў Расіі і ЗША аб'яднаць свае сістэмы супрацьракетнай абароны. Ва ўмовах, калі ЗША адмаўляюцца ад размяшчэння элементаў СРА ва Усходняй Еўропе, генеральны сакратар NATA паведаміў, што блок гатовы разгледзець любую прапанову па глабальнай бяспецы, якую зробіць прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. Са свайго боку альянс накіруе свае прапановы Маскве адносна новай дамовы па еўраатлантычнай бяспецы.

У NATA разлічваюць, што Расія паўплывае на Іран з тым, каб гэтая краіна адмовілася ад спробаў атрымаць ядзерную зброю і спыніла ўзбагачэнне ўрану. Па меркаванні Расмусена, альянс павінен рэанімаваць партнёрства з Масквой па пытаннях сусветнай бяспекі.

ВУЧЭННІ



Photo.ByMedia.Net

# ЧАС ВАЕННЫХ РАЗМІНАК

**Да канца верасня ў Беларусі ладзяцца сумесныя беларуска-расійскія аператыўна-стратэгічныя вучэнні «Захад–2009». У іх прымаюць удзел каля 12,5 тысячы чалавек. Адначасова ў Казахстане адбываюцца вучэнні атрадаў хуткага рэагавання АДКБ, у якіх Беларусь дэманстратыўна адмовілася ўдзельнічаць, так і не падпісаўшы пагадненне аб стварэнні атрадаў хуткага рэагавання.**

Раней кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка аператыўна-стратэгічныя вучэнні «Захад–2009» назваў чарговым «значным крокам у падрыхтоўцы Узброеных Сіл Беларусі і ўдасканаленні дзеючай сістэмы забеспячэння бяспекі дзяржавы».

У баявых вучэннях задзейнічана звыш 220 баявых танкаў, каля 470 баявых браніраваных машын, 230 самаходных буксіруемых артылерыйскіх гармат, мінамётаў і рэактыўных сістэм залпавага агню, а таксама 60 самалётаў і 40 верталётаў. Вучэнне пройдзе ў два этапы, падчас якіх будуць адпрацаваныя падрыхтоўка і ўжыванне рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі. «Баявыя дзеянні» разгорнуцца на 230-м агульнавайсковым палігоне Заходняга аператыўнага камандавання (Абуз-Лясноўскім), 227-м агульнавайсковым палігоне Сухапутных войскаў (Барысаўскім), 174-м навучальным палігоне ВПС і войскаў СПА «Даманава», 210-м авіяцыйным палігоне «Ружаны», а таксама на палігонах 38-м (Брэсцкім), 6-й мабільных брыгад і авіяцыйным палігоне 206-й штурмавой авіябазы. Акрамя таго, вучэнне пройдзе на асобных участках мясцовасці з мэтай разгортвання рухомых пунктаў кіравання і адпрацоўкі практычных дзеянняў войскаў.

Цяпер завяршыўся першы этап вучэнняў, на якім былі адпрацаваныя задачы ўсебаковага забеспячэння войскаў і воінскіх фармаванняў, было арганізавана кіраванне вылучэннем і разгортваннем войскаў; выкананы шэраг мерапрыемстваў па барацьбе з дэсантна-дыверсійнымі сіламі праціўніка.

Падчас другога этапу вучэнняў будуць адпрацаваныя пытанні кіравання рэгіянальнай групоўкай войскаў непасрэдна падчас правядзення абарончай аперацыі. Асноўная ўвага будзе нададзена ацэнцы эфектыўнасці функцыянавання Адзінай рэгіянальнай сістэмы СПА Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па адбіцці ўдараў з паветра, кіраванню групоўкамі войскаў пры вядзенні баявых дзеянняў за ўтрыманне абарончых межаў, а таксама ўдасканаленню практычных навыкаў службовых асоб аб'яднанага камандавання рэгіянальнай групоўкі войскаў.

Палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі адзначае, што часткова згодны з выказваннем першай асобы Беларусі наконт таго, што вучэнні — «значны крок у падрыхтоўцы Узброеных сіл». Аднак не выключае і моманту арганізацыі паказальнай акцыі — вайсковай сілы і сяброўства з Расіяй. «Нейкі пасыл Еўропе ў назве вучэнняў «Захад–2009» я б не стаў шукаць, бо варажыць — справа няўдзячная. Раней таксама ладзіліся розныя «захады». Адзінае, што цяпер гэтыя вучэнні самыя буйныя — упершыню з 12,5 тысячы вайскоўцаў расійскіх удзельнічае шэсць тысяч чалавек», — гаворыць эксперт.

Ад 15 верасня ў Казахстане ідуць маштабныя ваенныя вучэнні атрадаў хуткага рэагавання Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы пад назвай «Кааперацыя–2009». Гэта першыя вучэнні пасля стварэння атрада хуткага рэагавання АДКБ. Як паведаміла Міністэрства абароны Казахстана, першы этап вучэнняў пройдзе на сушы і вадзе. А ў сярэдзіне кастрычніка вучэнні адбудуцца на поўдні Казахстана.

«Галоўная мэта вучэнняў — ацаніць здольнасць органаў вайсковага кіравання да сумесных дзеянняў ва ўмовах тэрарыстычнай пагрозы на поўдні Расіі, — заявіў начальнік службы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Сухапутных войскаў МА РФ палкоўнік Ігар Канашанкаў інтэрнэт-рэсурсу www.utro.ru. — У той жа час у сувязі з абвастрэннем становішча ў зонах грузіна-абхазскага і грузіна-асецінскага канфліктаў падчас вучэнняў таксама будуць адпрацоўвацца пытанні ўдзелу ў адмысловых аперацыях па прымусу да міру ў зонах узброеных канфліктаў». Усяго ў вучэннях задзейнічаная каля васьмі тысяч чалавек.

Сёлета ў чэрвені пяць дзяржаўсябраў АДКБ — Расія, Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан і Арменія — падпісалі пагадненне аб стварэнні атрадаў хуткага рэагавання. Беларусь і Узбекістан пагадненне не падпісалі. У жніўні паведамлялася, што затрымка з боку Беларусі з падпісаннем пагаднення па стварэнні КСАР носіць «тэхнічны» характар і хутка мусіць быць выпраўлена. Аднак шэраг экспертаў сышліся на думцы, што для Лукашэнкі КСАР — адзін з магчымых інструментаў для гандлю з Расіяй, таму ён надалей будзе адцягваць падпісанне пагаднення, вымагаючы наўзамен пэўных саступак і выгоды.

ВОЙСКА

# ШЧЫТ АЙЧЫНЫ ЦІ ЛПП У ФОРМЕ

**Ад зімовага вайсковага прызыву трох лідэраў грамадскага руху — Франака Вячоркі, Змітра Хведарука і Івана Шылы — прайшло паўгода. Хлопцы за гэты час не толькі паспелі падвысіць свае нефармальныя вайсковыя «статусы», але і мінімальна нешта змяніць на месцы службы. Адзін дамогся, каб адрамантавалі прыбіральню ды памянялі ўнітазы, па заяве другога ў частцы паставілі таксафон... Ці магчымая дынаміка ў статычнай ваеннай сістэме, высвятляла Вольга Хвоін.**


Іван Шыла


Франак Вячорка


Зміцер Хведарук

Паводле ацэнак экспертаў, штогадовы памер ваенных выдаткаў Беларусі не дасягае і 1,5 працэнта ад аб'ёму ВУП, сёлета гэта складзе 1,73 трыльёна рублёў. Цяпер больш за 20 працэнтаў пасадаў салдат і сяржантаў у беларускім войску ўкамплектаваныя кантрактнікамі. Пры гэтым кантрактнікі складаюць 10 працэнтаў ад усіх вайскоўцаў Узброеных сіл нашай краіны, салдаты тэрміновай службы — 40 працэнтаў. Усяго беларускае войска налічвае каля 65 тысяч чалавек, з якіх 50 тысяч — вайскоўцы, а 15 тысяч чалавек — цывільны персанал.

Міністэрства абароны Беларусі мае намер прытрымлівацца абранага раней змяшанага прынцыпу камплектавання Узброеных сілаў — за кошт прызыўнікоў на тэрміновую ваенную службу і вайскоўцаў, якія праходзяць службу па кантракце. У далейшым прадугледжваецца толькі падвышэнне якасці гэтага працэсу, сцвярджаюць чыноўнікі сілавога ведамства. Раней заяўлялася, што беларускае войска да 2010 года мусіць на 50 працэнтаў быць укамплектаванае салдатамі і сяржантамі кантрактнай службы. Аднак у Мінабароны падлічылі, што гэта выкліча «яшчэ большую празмернасць прызыўнога рэсурсу, які і так ужо назіраецца ў рэспубліцы на працягу некалькіх гадоў». Не апошнюю ролю ў бліжэйшым будучым войска адыграе і спад у эканоміцы.

Працэс мадэрнізацыі беларускага войска сучаснай зброяй і баявой тэхнікай (што, натуральна, не менш важна за прафесійны чалавечы рэсурс) можа паскорыцца дзякуючы Дамове аб сумеснай ахове знешняй мяжы Саюзнай дзяржавы ў паветранай прасторы і стварэнні Адзінай рэгіянальнай сістэмы супрацьпаветранай абароны Беларусі і Расіі.

Калі ў Беларусі бракуе ўласных грошай на новую тэхніку, то з чалавечым рэсурсам праблем няма. Пад прызыў патрапляюць каля 80 тысяч чалавек, армія гатовая прыняць толькі 10. Атрымаць адтэрміноўку юнаку ад службы не так складна. Але ёсць такія, каго ў кабінетах Мінабароны і нават вышэйшых хочуць бачыць у шэрагах жаўнераў па-за конкурсным адборам і не зважаючы на магчымыя фактары выбракоўкі.

Адзін з лідэраў «Маладога Фронту» Зміцер Хведарук служыць у вайсковай частцы ў Жодзіна. Праўда, перыядычна патрапляе ў ваенны шпіталь на лячэнне. Франак Вячорка — кіраўнік моладзевай арганізацыі Партыі БНФ «Моладзь БНФ» — знаходзіцца ў ваеннай частцы пад Мазыром, маючы супрацьпаказанні для службы. Актывіст «Маладога Фронту» Іван Шыла служыць у ракетнай брыгадзе на Віцебшчыне.

Што беларускае войска атрымала ад палітычна актыўных жаўнераў і што дало ім за гэты час? Іван Шыла падчас свайго адпачынку падзяліўся назіраннямі пра прыстасаванства сярод афіцэраў і салдат тэрміновай службы, выгоды вайсковай прафесіі ды тое, на што трацяцца грошы падаткаплацельшчыкаў.

— Сёння ў войску служаць няўдачнікі, — лічыць Іван, — і я адзін з іх. Ніхто служыць не хоча. Тут найперш важнае пытанне катэгорыяў мыслення. Калі чалавек жыве ў вялікім горадзе, мае адукацыю, у яго іншыя жыццёвыя мэты, мы — пакаленне прагматыкаў. А войска — абсалютна ірацыянальная з'ява, на выхадзе ты атрымліваеш толькі характарыстыку. Раней яно каціравалася, цяпер прываблівае ў асноўным толькі вясковых хлопцаў з сярэдняй ці сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Сёння быць добрым салдатам — гэта быць прыстасаванцам, умець знайсці падыход да афіцэраў, тонка падманваць. І гэтым многія жаўнеры займаюцца ў войску, каб атрымаць не пяць, а дваццаць пяць дзён адпачынку. Канешне, сярод салдатаў ёсць тыя, хто вырашыў паступіць у ваенную акадэмію. Калі ты абіраеш кар'еру вайскоўца, то ў цэлым не прагадаеш. Ты не працуеш фізічна, але і інтэлектуальна не надта напружваешся, маеш пастаянны заробак, жыллё. Я б назваў гэта прымальным варыянтам для тых, хто мае «нізкі старт».

Грамадска актыўныя прызыўнікі паспелі паактыўнічаць і ў сваіх вайсковых частках. Вынік — невялікі, затое ўвагі начальства цяпер праз меру. Выдзяляцца ў страі нельга.

— Войска — адна з найбольш інертных, закрытых дзяржаўных інстытуцыяў. — працягвае Іван Шыла. — Змяніць яго намаганнямі адзінак салдат немагчыма. Патрэбна, каб гэтыя пытанні ставіліся на высокім узроўні, а таксама самімі грамадзянамі Беларусі. Яны павінны ведаць і мець магчымасць уплываць на тое, куды і як трацяцца іх падаткі. А гэта — змена сістэмы светаўспрымання. Сённяшнія сяржанты аднойчы стануць генераламі, але ці будуць мець матывацыю для рэформаў? Такі генерал будзе жыць у Мінску, мець жыллё, будзе ездзіць з нейкімі рэвізіямі па вайсковых частках і рабіць выгляд, што ўсё нармальна, бо ён памятае, як дваццаць гадоў таму служыў сам і гэтак жа імітаваў сваю дзейнасць. І вось яму трэба пісаць канцэпцыю развіцця войска, прабівацца праз бюракратычныя працэдуры, нешта некаму даказваць. А да пенсіі пару гадоў, дык навошта тады нервавацца? Гэта вялікая праблема, што ўсе ў гэтай сістэме ваенныя: дактары, журналісты і гэтак далей. Прыходзіць дзесяць тысяч салдат, сыходзіць... Нехта ў гэты час рухаецца па службовай лесвіцы, атрымлівае кватэры, даслужваецца да пенсіі.

Армія — школа маладых мужчынаў. Падаткаплацельшчыкі плацяць грошы, каб мы вынеслі нешта станоўчае выключна для сябе, сталі больш арганізаванымі, стрыманымі, разважлівымі. Я вось кніжкі чытаю, фізічнай падрыхтоўкай займаюся. Баявых вучэнняў у нас амаль няма. Таму і баяздольнасць маёй вайсковай часткі аб'ектыўна нізкая. Армія цяпер — ЛПП у вайсковай форме.

Што тычыцца адстойвання правоў, дык нехта ж мусіць пра гэта гаварыць. Даводзіцца пісаць міністру абароны, бо не прынята, каб жаўнер задаваў пытанні ці публічна іх агучваў. З пазітыўных вынікаў такой перапіскі — паставілі таксафон у частцы, перасталі прымяняць падвойнае спагнанне за адну правіннасць.

Кіраўніка «Моладзі БНФ» Франака Вячорку ў войска забіралі як у сапраўдным блокбастэры — з міліцыяй, з захопам у шпіталі, дзе праходзіў абследаванне, ды іншым эпатажным антуражам. У войску Франак разгарнуў уласную кампанію за рамонт прыбіральняў ды беларусізацыю камандаў. У выніку — унітазы памянялі, інтэрнэт-карыстальнікі палюбаваліся на ўзорную дабітасць ваенных санвузлоў, а камандзіры вывучылі новую каманду «Зважай!».

Франак адпачынку пакуль не меў, таму пра акалічнасці яго службы падзяліўся бацька Вінцук Вячорка:

— Тры гады таму, калі заходнія эксперты пыталіся ў мяне, ці варта супрацоўнічаць з беларускім войскам, у якой ступені яно заангажаванае ў беларускую палітыку, я з чыстым сумленнем адказваў, што яно абсалютна не заангажаванае і займаецца выключна сваімі вайсковымі справамі. Аднак, пачынаючы з інцыдэнту са Змітром Жалезнічэнкам, па невядомых мне прычынах, міністр абароны Мальцаў здаўся і пагадзіўся выкарыстоўваць армію як заменнік турмы для палітычна актыўных людзей. Войска як спосаб ізаляцыі грамадскага актывіста — вельмі эфектыўны інструмент. Яно спыняе адукацыю, выкідвае з кантэксту падзей. Трэба катэгарычна выступаць за спыненне выкарыстання войска як рэпрэсіўнага органа ў першую чаргу самім вайскоўцам, міністэрству. Армія заўжды мела свой гонар, і трэба гнаць адтуль тых спецслужбістаў, якія чужымі рукамі робяць сваю брыдкую справу. Калі нешта здарыцца з жаўнерам, хворым на артэрыяльную гіпертанію, то не спецслужбы будуць адказваць, а камандзір, у якога служыць хлопец.

Кантактуючы са многімі афіцэрамі, я пабачыў, што абсалютная большасць з іх — этнічныя беларусы. Гэты фактар мог быць добрым грунтам для патрыятычнага выхавання ў войску, калі б не цалкам пазасталая савецкая сістэма прапаганды і мозгапрамыўкі. Калі этнічныя беларусы з беларускімі прозвішчамі пачынаюць цкаваць салдата-беларуса за яго беларускую мову, гэта маланазваць абсурдам, гэта дыскрэдытуе армію. Калі ў вайсковай адзінцы беларускай арміі забараняюць жаўнерам чытаць Васіля Быкава, і пасля доўгай бюракратычнай цяганіны такі дазвол атрымлівае толькі адзін салдат, прычым кніга захоўваецца ў недаступным для астатніх месцы. Для мяне гэта выглядае абсалютным абсурдам, бо Быкаў у свой час панюхаў рэальнага пораху і мае поўнае права быць маральным аўтарытэтам для беларускіх салдат. Гэты абсурдны адрыў зместу, якім напаўняюць галовы салдат і афіцэраў, ад задачаў войска як галоўнага патрыятычнага інстытуту крайне небяспечны ва ўмовах маральнага выбару.

Калі гаварыць пра побытавыя варункі, то думаю, што яны ў цэлым адпавядаюць таму стану, у якім знаходзіцца эканоміка. Недзе могуць паказаць еўрарамонты, а недзе не могуць зрабіць і звычайнага. Мой сын здолеў апублікаваць свой дзённік у інтэрнэце з фотаздымкамі, на якіх ушчэнт разламаныя душавыя кабіны і дзіркі ў падлозе з вайсковага шпіталя ў Баранавічах. У мазырскай частцы, дзе ён цяпер служыць, адрамантавалі прыбіральню. Але не ў кожнай частцы ёсць свой Франак, які нешта напіша, каб падштурхнуць кіраўніцтва да пераменаў. Я з павагай стаўлюся да нашых афіцэраў-прафесіяналаў, думаю, што яны знаходзяцца далёка не ў ідэальных матэрыяльных варунках. І выйсце з гэтага — змены ў самой эканоміцы ды пераход да прафесійнага войска. Няма чаго штучна зацягваць у войска вялізную колькасць жаўнераў, калі большасць з іх займаецца гаспадарчай дзейнасцю, мала звязанай з падтрымкай абароназдольнасці дзяржавы.

Войска сёння — гэта своеасаблівы «сацыяльны ліфт» для цэлага пласта насельніцтва. Бальшыня саслужыўцаў Франака шчыра марыць у працяг сваёй кар'еры застацца на кантрактную службу ці патрапіць, напрыклад, у АМАП. Гарантаваная вопратка, жытло, заробак — вяршыня жаданняў, як пяецца ў песні: «Ну і што, што я вучыўся плоха, затое я цяпер круцей любога».

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ

# ПІЎНЫ БУНТ ІП

Вольга ХВОІН

**Канферэнцыя прадпрымальнікаў «Усебеларускі саміт прадпрымальнікаў «За права прадпрымаць!» прайшла пад знакам піва. ІП выступаюць за вяртанне дазволу на гандаль пенным напоем праз шапікі і гандлёвыя павільёны. Нагадаем, у Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях рашэннем аблвыканкамаў быў забаронены продаж піва ў шапіках і гандлёвых павільёнах.**




Фота Юрыя Дзядзінкіна




Фота Юрыя Дзядзінкіна

## «Перспектыва»

Канферэнцыя з удзелам прыкладна двухсот прадпрымальнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, на якой мусілі абмяркоўвацца многія праблемы ІП, збольшага звялася да абмеркавання сітуацыі з забаронай гандляваць півам праз шапікі ды дробныя павільёны. Паводле ацэнак некаторых прадпрымальнікаў, забарона ўраду вылілася для іх у істотнае скарачэнне выручкі. Так, прадстаўнікі гомельскіх ІП заявілі, што ад пачатку года прыблізна 40 працэнтаў уладальнікаў дробных шапікаў былі вымушаныя згарнуць сваю дзейнасць. Забарону на рэалізацыю піва ў шапіках індывідуальныя прадпрымальнікі лічаць «спланаванай акцыяй па знішчэнні дробнарознічнага гандлю». «Мясцовыя ўлады спасылаюцца на тое, што продаж піва ў шапіках вядзе да алкагалізацыі насельніцтва. Гэта абвінавачванне тэндэнцыйнае і прадузятае. Нас проста знішчаюць, пазбаўляюцца ад канкурэнтаў вялікага бізнесу з дапамогай чыноўнікаў», — лічыць кіраўнік РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Перспектыва» прапаноўвае Аляксандру Лукашэнку правесці ў бліжэйшы час першы агульнанацыянальны з'езд прадпрымальнікаў для абмеркавання праблемаў малога бізнесу. Шумчанка лічыць, што з'езд неабходны, каб кіраўнік дзяржавы змог пагаварыць з прадпрымальнікамі без пасярэднікаў. Шумчанка выступае за цывілізаванае вырашэнне пытанняў і пошук кампрамісу з уладамі. Адна з удзельніц канферэнцыі не выключае, што магчымы выхад прадпрымальнікаў на вуліцу з акцыямі пратэсту, але спадзяецца на вырашэнне праблем мірным шляхам. «Я думаю, што магчымая акцыя на вуліцах. Яны маладыя, мусяць жыць, круціцца, працаваць. Таму, я лічу, калі не вырашыцца пытанне, гэта будзе кепска для нас. Сёння цяжка з працай. Знайсці працоўнае месца чалавеку пісьменнаму, з дзвюма вышэйшымі адукацыямі цяжка. Але ж спадзяюся, што да вуліцы не дойдзе», — лічыць прадпрымальніца з Віцебска.

У шэрагу праблем, з якімі цяпер сутыкаюцца ІП, не толькі забарона на продаж піва, але і абмежаванні па найму работнікаў, праверкі, штрафныя санкцыі і канфіскацыя тавараў.

## Невыгоднае рашэнне

Рэалізацыя піва і спадарожных тавараў разам складалі да 70 працэнтаў ад выручкі аб'ектаў дробнай розніцы. Летась праз сетку дробнарознічнага гандлю было прададзена каля 35 працэнтаў агульнага аб'ёму рэалізацыі піва. «Забарона прывядзе да поўнага краху дробнай розніцы, дрэнна паўплывае на выкананне прагнозных паказчыкаў, прывядзе да росту беспрацоўя і да памяншэння падатковых паступленняў у бюджэт», — лічыць кіраўнік РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка.

Цяпер піваварная галіна краіны перажывае не самыя лепшыя часы. Брэнд-менеджэр піўзавода «Аліварыя» Сяргей Рубец паведаміў, што аб'ёмы продажу піва сёлета ўпалі на 9,3 працэнта. Летась праз кіёскі рэалізоўвалася каля 30 працэнтаў прадукцыі піўзавода «Аліварыя». «Экспарт у беларускага піва невялікі, — расказвае спецыяліст. — Гэтаму ёсць многа прычын. Асноўны рынак для нас — мясцовы. Я не магу сказаць, што скарачэнне продажу адбылося толькі з-за закрыцця шапікаў. Важна, каб у людзей было яшчэ за што набываць. Аднак магу сказаць, што для нас шапікі — важны канал, і яго варта захаваць». Чакаецца, што да новага года магчыма яшчэ падзенне рэалізацыі піва на дзесяць працэнтаў».

Сяргей Рубец зазначыў, што продажы прадукцыі прадпрыемства не падаюць пакуль так, як агульны рынак Беларусі. «Нашае прадпрыемства перадавое, мы ўваходзім у сістэму прадпрыемстваў Carlsberg. І ў нас сітуацыя дастаткова нядрэнная, празмерных запасаў прадукцыі на складах пакуль не маем. Але, як і любыя іншыя бізнесмены, мы хочам, каб сітуацыя была стабільная», — падкрэсліў спецыяліст. Паводле яго слоў, найбольшым попытам карыстаюцца гатункі піва «мэйнстрым» — сярэднецэнавай катэгорыі — «Аліварыя залатое» і «Аліварыя дзесятка». Апошнія паўтара гады прадпрыемства займалася інавацыямі, выпусціла піва «экстра», якое атрымала шэраг узнагародаў на міжнародных выставах. Дастаткова вялікай папулярнасцю карыстаецца нефільтраванае піва «Белае золата».

Брэнд-менеджэр «Аліварыі» паведаміў, што кіраўніцтва завода мела «дыялог на ўзроўні апытанняў меркавання». На пытанне: «Ці важны для нас такі канал збыту, як шапікі?» адказалі, што «так важны». На пытанне: «Ці адбілася на нас забарона продажу?» такса ма атрыманы станоўчы адказ. «Я не валодаю падрабязнай інфармацыяй, але, магчыма, выказвалася пазіцыя, што ад закрыцця гэтага канала збыту страціць і вытворцы, і гандляры. Як звычайны спажывец, я магу сказаць, што шапікі — важныя гандлёвыя кропкі, бо не хочацца ісці за нейкай дробяззю ў супермаркет», — сказаў спецыяліст піўзавода.

Што тычыцца рэакцыі прадпрымальнікаў, то яны згодныя гандляваць у шапіках выключна беларускім півам. Але адказу ад чыноўнікаў на сваю прапанову пакуль не атрымалі. Разам з тым на канферэнцыі была агучаная інфармацыя, што толькі ў маі з Брэсцкага піўзавода двойчы вывозілася на ўтылізацыю нерэалізаванае піва.

## Радыкальная альтэрнатыва

Усе шышкі на канферэнцыі прадпрымальнікаў пасыпаліся на кансультанта дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Валерыя Хомчанку. У адказ чыноўнік толькі сціпла адказваў, што дыялог паміж дэпартаментам і грамадскімі аб'яднаннямі прадпрымальнікаў ідзе на сталай аснове, усё абмяркоўваецца і вырашаецца. «Створана працоўная група, якая займаецца рашэннем праблемных пытанняў. Цяпер аналізуецца сітуацыя наконт піва. Па выніках аналізу будзе прынята адпаведнае рашэнне. Але якім яно будзе, я цяпер сказаць не магу», — адзначыў Валерый Хомчанка.

На няўцямныя тлумачэнні прадстаўнікоў улады прадпрымальнікі выступілі з радыкальнай прапановай да кіраўніка Беларусі: разгледзець пытанне аб прафесійнай прыдатнасці і ступені адпаведнасці займаемай пасадзе міністра гандлю, міністра эканомікі, а таксама міністра па падатках і зборам. Выніковая рэзалюцыя канферэнцыі змяшчае і патрабаванне дазволіць суб'ектам малога прадпрымальніцтва гандляваць беларускім півам у шапіках і павільёнах, спыніць практыку канфіскацыі тавараў і накладанне вялікіх штрафаў, абвясціць мараторый на праверкі прадпрымальнікаў тэрмінам на два гады. Таксама прадпрымальнікі настойваюць адмяніць забарону па найму ІП працаўнікоў, аднавіць працу шапікаў у Мінску і іншых гарадах.

У рэзалюцыі гаворыцца, што прадпрымальнікі гатовыя дапамагчы дзяржаўным прадпрыемствам разгрузіць склады і стварыць новыя працоўныя месцы, «але без прымусу і навязвання нам коштаў, квот, рэжыму наймання і формы аплаты». Іпэшнікі выступаюць за «рэальнае партнёрства бізнесу і ўлады». «Мы пакідаем за сабою права абараняць нашы канстытуцыйныя правы, выяўляць сваю грамадзянскую пазіцыю ўсімі законнымі сродкамі аж да страйкаў і дэманстрацый у выпадку далейшага ігнаравання патрабаванняў і прапаноў саміту», — гаворыцца ў выніковым дакуменце, які будзе накіраваны ў Адміністрацыю прэзідэнта, Савет міністраў, абласныя выканкамы і Мінгарвыканкам.

Разам з тым палітык Уладзімір Нісцюк выказаў меркаванне пра негатыўныя наступствы палітызацыі супрацыву прадпрымальнікаў, заявіўшы, што «дзіця, народжанае ад саюзу палітыкаў і бізнесу, не можа быць паўнавартасным». «Дзеячы палітыкі працуюць на больш віртуальны вынік, а прадпрымальнікі — на канкрэтны, яны зямныя людзі. Палітыкі заўсёды могуць неяк схавацца, чаго не скажаш пра прадпрымальнікаў. Не аднойчы было, калі прадпрымальнікі пайшлі за палітыкамі, а ў выніку мелі пасадкі ў турмы, страцілі свой бізнес», — рэзюмуе Нісцюк. Аднак жа варта заўважыць, што ў Беларусі эканамічныя пытанні непадзельныя з палітычнымі. І змены ў сістэме гаспадарання наўпрост звязаны са зменамі ў галовах кіруючых асобаў. Таму ціха адседзецца да лепшых часоў у іпэшнікаў наўрад ці атрымаецца.

## Светлае заўтра

Цяпер на складах беларускіх прадпрыемстваў знаходзіцца прадукцыі на суму 6,9 трыльёна рублёў. Стала вядома, што ўрад разглядае некалькі праектаў нарматыўных актаў, каб прыцягнуць да разгрузкі складоў індывідуальных прадпрымальнікаў. Для ІП, якія займаюцца экспартам беларускіх тавараў, можа быць устаноўлены адзіны гандлёвы збор у памеры базавай велічыні. Ад выплаты іншых падаткаў і збораў іх плануецца цалкам вызваліць. У якасці другой палёгкі можа быць спрошчаны механізм разлікаў прадпрымальнікаў з вытворцамі і ўладальнікамі тавару. Таксама ёсць прапанова вызваліць дробных гандляроў-экспарцёраў ад абавязковага пералічэння заробленай пры экспарце валюты на банкаўскія рахункі з наступным абавязковым яе продажам.



7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 28 верасня, панядзелак

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.35** «Здароўе».
**10.00** «Жыццё як жыццё». Жаночае ток-шоў.
**11.00** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія).
**12.10** Меладрама «8 Сакавіка» (Расія).
**14.05** Культурныя людзі.
**14.30** «Эпоха». Зоркі Венецыянскага кінафэсту. Фільм 1-ы.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія). Фільм «Фотаздымак на памяць». 1-я серыя.
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія).
**18.50, 00.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж «Бочкі-маці».
**22.05** Дэтэктыўны трылер «Бягляк» (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.
**00.50** Хакей для ўсіх.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: Міжнародны конкурс прыгажосці «Міс Інтэркантынентал-2009». У перапынку: 11.00, 13.00 Нашы навіны.
**11.05, 13.05** Навіны спорту.
**13.50** «Модны прысуд».
**14.50** Мультфільмы.
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер.фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.05** Нашы навіны.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Злачынствы стагоддзя».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.30** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Пуцявікі». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Я - вандроўца».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Пуцявікі». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Два салдацікі папяровыя». Расія, 2001 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».
**00.20** «Next 3». Серыял.

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Усё аб бяспецы.
**08.55** У гэты дзень.
**09.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.55** Дэтэктыў «Вяселле Барбі» (Расія-Украіна). 1-я-4-я, заключная, серыі.
**14.00** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Тэлебарометр.
**16.00** Экспедыцыя.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Смачна з Барысам Бурдой.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне».
**19.05** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**19.45** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.40** Калыханка.
**20.55** Вялікае сэрца.
**21.25** Музычная камедыя «Саламяны капялюшык» (СССР). 1-я серыя.
**22.50** Хакей. Формула гульні.
**23.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**00.15** Крымінальная драма «Шыза» (Расія-Казахстан-Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.05** «Загадка згубы парома «Эстонія». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** Фільм «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў».
**13.30** Гарадок.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Фільм «Клінч». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Участковая». Расія.
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** «Нічога асабістага».
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Мой сэрбны шар».
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**09.10** «Крамлёўская кухня».
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кулінарны паядынак».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Глушэц. Працяг».
**21.40** Баявік «Бой з ценем».
**22.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Сумленны панядзелак».
**00.15** «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенка».
**00.45** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Імола (Італія). Заезд 2.
**10.00** Мотаспартыўны часопіс.
**10.15** Тэніс. Турнір WTA. Токіо. Дзень 2.
**14.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Бразілія - Коста Рыка. Александрыя (Егіпет).
**15.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Чэхія - Аўстралія. Александрыя (Егіпет).
**16.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**17.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Нігерыя - Іспанія. Александрыя (Егіпет).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Італія - Трынідад і Табага. Александрыя (Егіпет).
**21.45** Вось дык так!!!
**22.05** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**00.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**00.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Нігерыя - Іспанія. Александрыя (Егіпет).

### БЕЛСАТ tv

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**19.50** На колах.
**20.20** Госць «Белсату».
**20.40** Хто ёсць кім: Алесь Сураў – непакорны мастак.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крэўская унія» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** «Зламаныя кветкі», маст. фільм, ЗША.
**23.10** Аб'ектыў.

## 29 верасня, аўторак

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). 1-я серыя.
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія).
**11.40** Спецыяльны рэпартаж «Бочкі-маці».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка». 1-я серыя.
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс».
**13.45** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** «Эпоха». Зоркі Венецыянскага кінафэсту. Фільм 2-і.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар» (Расія). Фільм «Фотаздымак на памяць». 2-я серыя.
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія).
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Барселона-Дынама (Кіеў). Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фіярэнціна - Ліверпуль.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** Тэорыя неверагоднасці. «Біяполе».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер.фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Я вярнуся».
**22.10** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.30** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Два салдацікі папяровыя».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Пуцявікі». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Уваскрэсенне класікі».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Пуцявікі». Серыял.
**20.00** «Сталічны падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**21.30** «Атрад». Серыял.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Надзвычайныя гісторыі».
**00.15** «Next 3». Серыял.

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.45** У гэты дзень.
**08.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.50** Серыял «Каханне як каханне».
**10.55** Хакей. Формула гульні.
**11.25** Музычная камедыя «Саламяны капялюшык» (СССР). 1-я серыя.
**12.35** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**14.05** «Пра мастацтва».
**14.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**15.25** Мультфільм.
**15.45** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**16.25** Пазакласная гадзіна.
**16.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне».
**19.05** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**19.40** Беларуская часіна.
**20.50** Калыханка.
**21.05** Музычная камедыя «Саламяны капялюшык» (СССР). 2-я серыя.
**22.30** Спорт-кадр.
**22.55** Баявік «Пастка» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.05** «Забіць таварыша Сталіна». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.45** Тэлесерыял «Участковая». Расія.
**13.25** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Участковая». Расія.
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Імперыя «Торгсін». Экспрапрыяцыя па-савецку». Дак. фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.10** «Анатоль Кашпіроўскі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** Серыял «Глушэц. Працяг».
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** Серыял «Глушэц. Працяг».
**20.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Рубін (Расія) - Інтэр (Італія).
**22.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Вочная стаўка».
**23.55** «Фатальны дзень. Рабаўладальнік».
**00.20** «Асабліва небяспечны!».
**00.55** Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.15** Тэніс. Турнір WTA. Токіо. Дзень 3.
**14.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Егіпет - Парагвай. (Егіпет).
**16.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў.
**17.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Паўднёвая Карэя - Германія. Александрыя (Егіпет).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. ЗША - Камерун. (Егіпет).
**21.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Уругвай - Узбекістан. Александрыя (Егіпет).
**22.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Гана - Англія. (Егіпет).
**00.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**00.45** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Італія).
**01.30** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету. Клас Р1 (Італія).
**02.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Імола (Італія). Заезд 2.

### БЕЛСАТ tv

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** МакраФон: З архіву «Jazz Jamboree»: «Chris Hinze Combination».
**19.30** «89 міліметраў ад Еўропы», рэпартаж, 1993 г., Польшча.
**19.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Сальда (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кургані» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Рэпартэр.
**22.00** Аўтастопам праз Еўропу, 3 серыя: Галандыя.
**22.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**22.40** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №6 (34) (верасень)

www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурна-грамадскага жыцця верасня ... 2

«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Ірыны ХАДАРЭНКА і Усевалада СЦЕБУРАКІ ... 3

«ЗАПІСЫ»: «Неўпарадкаваныя нататкі» Ніла ГІЛЕВІЧА ... 4–5

«ПАМЯЦЬ»: лісты Ларысы ГЕНІЮШ і эсэ Генрыха ДАЛІДОВІЧА пра Наталлю АРСЕННЕВУ ... 6

«КНІГАРНЯ»: рэцэнзія Анатоля ІВАШЧАНКІ на кнігу Віктара КАЗЬКО «Дзікае паляванне ліхалецця» ... 7

«КАЛЕЙДАСКОП»: пісьменніцкія прызнанні, знаходкі ды анонсы новых кніг ... 8


ПАЗІЦЫЯ

# НУ І НЮ. ГОЛЫ КАНФАРМІЗМ

Алег АБЛАЖЭЙ

**Хто цяпер паверыць: былі часы, калі людзі стаялі начамі ў чэргах па кнігі. А цяпер дзеці тых «стоікаў» выварочваюць цэлыя бібліятэкі на сметнікі. Канец слова?**



Менавіта так названы «праект» са здымкамі голых беларускіх літаратараў. Адчайная спроба хоць як звярнуць на сябе ўвагу. Так закаханы падлетак гатовы на самыя недарэчныя выбрыкі — абы ягоная Дульсінея азірнулася. Сяго-таго літаратары дамагліся — пра іх учынак спрачаюцца больш, чым пра іхнія тэксты. Якіх, паўторым, не чытаюць.

«То мо цяпер…» — спадзяюцца. Што ж, сучасным светам кіруе маркетынг, рэклама. Калі Маякоўскі марыў — «чтобы после работы завком закрывал мои губы замком», — гэта зусім не была туга па цэнзуры ці якім-небудзь «Совету по нравственности». Проста паэт хацеў стаць удзельнікам агульнага вытворчага працэсу. Вось і літаратары задумалі стаць шараговымі ўдзельнікамі маркет-шоу. І звярнуць на сябе ўвагу такім жа чынам, як гэта робяць вытворцы калготак і пракладак. Бо літаратура ўрэшце рэшт — тавар…

Многія таленты намагаліся «быць як усе» — бо на п'едэсталах холадна і няўтульна. Леў Талстой спрабаваў араць зямлю і шыць боты, Ван Гог марыў упрыгожваць сваімі творамі пакоі звычайных людзей, Павел Філонаў намагаўся верна служыць пралетарыяту. Але жыццё груба вяртала іх на свае месцы — вы ніколі не будзеце «часткаю нас», вы асуджаны быць «па-за». Дыхатамія «паэт і чэрнь» — вечная. І балючая.

Але калі паэт лісліва зазірае чэрні ў вочы — ён перастае быць паэтам. Нельга мастаку віляць хвастом — рукі будуць дрыжэць. Прырода таленту — самота. Бо нязведанымі сцяжынкамі ходзяць паасобку.

Творцам даруецца многае — п'янства, няшлюбныя дзеці і нават прыслужванне ўладам. Але ніколі, ні пры якіх абставінах, не даруецца смяротэльны для творцы грэх — банальнасць. Не ў тым бяда літаратараў, што яны распрануліся. Бяда, што яны зрабілі гэта не першымі. Нават не дзесятымі і не сотымі. Цяпер загольваюцца ўсе: поп і рок-зоркі, цэлыя рэдакцыі «гламурных» часопісаў і нават палітыкі. Інтэрнэт стракаціць голымі цыцкамі і дупамі. «У Лолиты вывалилась грудь», «Жанна Фриске показала «киску». Беларускі пісьменнік НН паказаў «піську».

Стаў у шэрагі.

«Он так же мал и мерзок, как мы!». Скажаце — гэта ж не болей, чым жарт! Іронія.

Іронія нагадвае кіслотнасць страўніка. Забяспечвае жыццядзейнасць — але калі яе зашмат, губіць арганізм. Так вырадзілася ў кіч смяротэльна паважная акадэмічная культура XIX стагоддзя. Невыносна чытаць большасць сучасных «патрыятычных» тэкстаў. Але конскія дозы іроніі непазбежна перарастаюць у цынізм, згубны для творцы горш любога наркотыка.

Так — літаратура таксама тавар. Але тавар асаблівы. Як хлеб. А задача хлеба — насыціць, а не здзівіць ці ашаламіць. Не так даўно людзі запаўнялі стадыёны, бо прагнулі паэтычнага слова як хлеба. А потым паэты сталі класці ў працягнутыя рукі нават не камені, а свае «вершаванітаванні». То што крыўдзіцца, калі рукі больш не працягваюць? Не шоку, не эпатажу трэба цяпер, а ўцямнага, людскага слова. Якое дапамагае жыць. І пагэтаму — вечнае. А калі кнігу немагчыма чытаць ні ўздоўж, ні ўпоперак, ні па дыяганалі — ніякі аўтарскі стрыптыз не дапаможа.

Бо сам тэкст бязлітасна агольвае не цела — нутро аўтара. Распранаючыся, пісьменнік намагаецца прыкрыць творчую няўпэўненасць. Калі не імпатэнцыю.

Найлепшая маска канфарміста — маска бунтара. Асабліва калі бунт дазволены.

А ўвогуле гэта гісторыя заўтра-паслязаўтра забудзецца. І тэксты Акудовіча застануцца тэкстамі Акудовіча — будзем мы яго бачыць у кашулі ці без.

Як і тэксты літаратара, што выразаў на грудзях сваё імя…

http://naviny.by

## ПАЛІЦА

### САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ ЗАСНАВАЎ КНІЖНА-ВЫДАВЕЦКУЮ СЕРЫЮ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ, ПАЭЗІІ І ДРАМАТУРГІІ «КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»

У серыі выйшла тры кнігі: проза Уладзіміра Някляева «Цэнтр Еўропы», прыгодніцкі раман Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа» і эсэістыка Віктара Казько «Дзікае паляванне ліхалецця».

Неўзабаве з'явяцца «Анталогія маладога беларускага жаночага апавядання» і гістарычны раман Вольгі Іпатавай «Знак вялікага магістра», які распавядае аб знакавых падзеях беларускай дзяржаўнасці ў эпоху князя Вітаўта.

Аб набыцці кніг серыі «Кнігарня пісьменніка» можна даведацца па тэл.: (Velcom) 637-66-43; (МТС) 274-85-97.




**Уладзімір Някляеў. Цэнтр Еўропы: апавяданні, аповесці. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 248 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»).**

Проза Уладзіміра Някляева, як і ягоная паэзія, адметная псіхалагізмам, вастрынёй адчування і глыбінёй асэнсавання часу.

У новую кнігу ўвайшлі напісаныя ў замежжы і па вяртанні з эміграцыі апавяданні «Бомба», «Юзік», «Цмок», «Музей Броўкі…», «Залатая Арда» ды інш., а таксама аповесці «Вежа», «Няхай жыве 1 Мая!», «Прага», «Мірон ды Мірон» і «Вяртанне Веры».




**Кастусь Цвірка. Воўчая выспа: раман. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 248 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»).**

Пры спрыяльных умовах раман мог бы чакаць лёс гісторыка-серыяльнага кінатрылера. Душэўна спляліся тут многія сюжэтныя лініі ад Маўглі да «Людзей на балоце» — і арганічна скандэнсаваліся ў захапляльнае чытво з нацыянальным пафасам і мастакоўскім болем за лёс свайго паднявольнага колісь краю і народу. ...Раскулачаны Ігнась Караленя ўцякае з Сібіры і вяртаецца да жонкі і дзяцей у забалочаную вёску. Аднаго з сыноў-блізнятак украў і знёс у лес воўк... Сам гаспадар мусіць уцякаць ад праследу энкавэдыстаў, пасля чаго сустракаецца з сынам.

А ваўкі аказаліся лепшымі за людзей...




**Віктар Казько. Дзікае паляванне ліхалецця: эсэ, публіцыстыка. — Мінск: «Кнігазбор», 2009. — 360 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»)**

Новая кніга вядомага беларускага празаіка складзена з эсэістыкі і публіцыстыкі апошніх гадоў. Вось толькі некаторыя іх назвы, якія яскрава сведчыць і пра змест: «Азвярэнне, амаль Крамлёўская гісторыя», «Дзікае паляванне каралёў сталіншчыны», «Абуджэнне памяці», «Так на Беларусі хаваюць пракоаў», «Зазірнуць у вочы свайму Я», «Я вам ніколі не схлусіў» і інш.

Вастрыня і надзённасць, боль за родную зямлю і краіну, мову і культуру — адметнасць кнігі, як і ўсёй творчасці Віктара Казько.

## МЕСЯЦАСЛОЎ

### ФУРОР МЕСЯЦА

9-12 верасня на знакамітым польскім курорце «Крыніца», што пад Кракавам, праходзіў XIX Еўрапейскі эканамічны форум, у якім бралі ўдзел каля 500 вядучых эканамістаў і палітыкаў з усяго свету.

У культурнай праграме гэтага прадстаўнічага мерапрыемства выступіў беларускі паэт Уладзімір Някляеў. «Паслухаўшы бліскучага беларускага паэта, я сам стаў трошкі беларусам», — выказаў сваё ўражанне ад літаратурнай вечарыны Уладзіміра Някляева знаны польскі палітык Уладыслаў Сакалоўскі.

Апроч Уладзіміра Някляева, які, як напісалі арганізатары форуму, «з'яўляецца не толькі паэтам і празаікам, але і паслом беларускай літаратуры», для ўдзелу ў культурнай праграме былі запрошаныя ангельскі пісьменнік і гісторык, аўтар бестселера «Паўстанне 44» Норман Дэвіс, вядомы нямецкі палітычны дзеяч, аўтар кнігі «Праект — пашырэнне» Гюнтэр Ферхойген і расейская літаратарка Марыя Арбатава.

З песнямі на вершы Уладзіміра Някляева выступіў на ягонай вечарыне Зміцер Вайцюшкевіч. Абодва яны, беларускі паэт і беларускі спявак, атрымалі запрашэнне для ўдзелу ў фестывалі «Варшаўская восень» — міжнародным свяце паэзіі.

### ФЕСТЫВАЛЬ МЕСЯЦА




3 9 па 13 верасня ў польскім горадзе Вейцбарк адбыўся VI Міжнародны фестываль паэзіі «Pobocza 2009», у якім узялі ўдзел каля трыццаці паэтаў з Польшчы, Славеніі, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Украіны. Беларусь на форуме прадстаўлялі Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк і Барыс Пятровіч. У межах фестывалю адбыўся шэраг паэтычных сустрэч у гімназіях, ліцэях, школах і бібліятэках Вейцбарка, Сямпальнага Краю і Быдгашчы з прэзентацыяй творчасці ўдзельнікаў фестывалю. Пад час паэтычных спатканняў была арганізаваная дыскусія на тэму: «Паэзія — узбочына ці цэнтр культурнага жыцця Еўропы».

Па выніках фестывальных дзён выйшаў паэтычны альманах «Pobocza» з творамі яго ўдзельнікаў у перакладзе на польскую мову.

### ВЫСТАВА МЕСЯЦА

15 верасня ў Мінску ў мастацкай галерэі кафэ «Добрыя мыслі» адкрылася фотавыстава Яўгенія Коктыша, прысвечаная пісьменніку, літаратуразнаўцу і грамадскаму дзеячу Алесю Адамовічу (1927–1994).

У экспазіцыі дэманструецца 43 працы, якія выяўляюць А.Адамовіча ў паўсядзённых і ўрачыстых момантах жыцця ў 1970-1990-х гадах.

У адкрыцці выставы прынялі ўдзел вядомыя дзеячы нацыянальнай навукі і культуры, у тым ліку пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Законнікаў, Уладзімір Някляеў, доктар філалагічных навук, прафесар Міхась Тычына.

У сваіх выступленнях сябры і калегі А.Адамовіча адзначалі ў працах Я.Коктыша «высокую інтуіцыю майстра фіксаваць самыя сакральныя і важныя імгненні ў паводзінах чалавека і ў яго адносінах з людзьмі».

Выстава дзейнічае да 30 верасня.

### КНІГА МЕСЯЦА

У выдавецтве «Кнігазбор» выйшаў том выбраных твораў народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча — 48-ы том серыі «Беларускі кнігазбор». У 600-старонкавае ілюстраванае выданне ўвайшлі найбольш значныя творы розных жанраў беларускага паэта, літаратуразнаўца, фальклараліста, перакладчыка і грамадскага дзеяча: вершы, паэмы «Заручыны» і «Лодачкі», раман у вершах «Родныя дзеці», аўтабіяграфічная аповесць «Перажыўшы вайну», эсэ аб выдатных дзеячах літаратуры і публіцыстыка. Сярод публіцыстычных твораў — найболей вядомыя выступленні Ніла Гілевіча ў абарону беларускай мовы, нацыянальнай гісторыі і культуры, у тым ліку 1990-1996 гадоў, калі ён узначальваў пастаянную камісію Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны.

Уступны артыкул да зборніка напісаў доктар філасофскіх навук Уладзімір Конан.

Выданне паступіла ў кнігарні краіны, кошт — каля 28 тыс. рублёў.

### СУСТРЭЧА МЕСЯЦА

17 верасня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася творчая сустрэча з народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным «Паслаць маме душу…». У рамках мерапрыемства прэзентавалася ўнікальнае выданне «Паслаў бы табе душу…» (ліставанне Рыгора Барадуліна з мамай (1954–1971), выдавецтва «Лімарыус».

### «ІМЁНЫ» МЕСЯЦА

«Усё па-ранейшаму толькі імёны зьмяніліся» — такую назву мае новы зборнік вершаў Уладзімера Арлова, які выйшаў у серыі «Кнігарня «Наша ніва» ў выдавецтве І.П.Логвінава. Гэта пранікнёная кніга-забаўка ў сур'ёзнай абгортцы. Ці наадварот: спавядальныя роздумы падчас хады па верлібравых радках-прыступках.

Шматлюдная прэзентацыя кнігі з удзелам аўтара адбылася 18 верасня ў Мінскай сядзібе ТБМ.

ПАДЗЕІ

## «СУПОЛЬНАЯ» ПРЭМІЯ ІМЯ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

**З 10 па 13 верасня ў Львове (Украіна) прайшоў Міжнародны кніжны кірмаш, у якім прынялі ўдзел каля тысячы выдаўцоў, а наведалі — больш 70 тысячаў чытачоў. Свята кнігі адкрыў прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. Ладзіліся сотні прэзентацый новых кніг з удзелам аўтараў.**

У межах Міжнароднага кніжнага кірмашу адбылася сустрэча старшыні СБП Алеся Пашкевіча з Радай Львоўскай арганізацыі Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны (старшыня Марыя Якубоўская). Саюз беларускіх пісьменнікаў і Львоўская арганізацыя НСПУ (налічвае больш 160 членаў) заснавалі супольную Міжнародную прэмію імя народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Лаўрэатам першай прэміі стала беларускамоўная пісьменніца Ніна Турбал (Украіна) — за ўмацаванне міжнародных літаратурных стасункаў, наладжванне творчых кантактаў паміж Украінай і Беларуссю, актыўную літаратурную працу і кнігу «Зямны паклон».

## ФОРУМ ВЫДАЎЦОЎ

**У Вільні, сёлетняй культурніцкай сталіцы Еўропы, адбыўся форум, падчас якога шведскія і беларускія выдаўцы, рэдактары і літаратары мелі магчымасць абмяняцца вопытам, абмеркаваць надзённыя працоўныя і творчыя пытанні.**

Праца форума праходзіла ў форме адкрытых семінараў на шведскай і беларускай мовах. Падчас дыскусій уздымаліся пытанні, якія хвалююць творцаў і вытворцаў. Гэта агульная літаратурная сітуацыя і пануючыя структуры выдавецкай дзейнасці, выбар пісьменніка і твора ў працы выдавецтва, эканамічны і адміністратыўны бок дзейнасці выдавецтва, рэдактарская праца і графічны дызайн, маркетынг, распаўсюд выданняў, новыя медыі і перспектывы на будучыню.



Фота аўтара

Беларускі бок прадстаўлялі Барыс Пятровіч (Саюз беларускіх пісьменнікаў і часопіс «Дзеяслоў»), Уладзімір Сіўчыкаў (Беларускі ПЭН-цэнтр і выдавецтва «Радыёла-плюс»), Зміцер Колас (Выдавецтва «Зміцер Колас»), Аляксандра Дынько (выдавецтва «Логвінаў»), Алена Макоўская (ЗБС «Бацькаўшчына»), Міхась Башура (выдавецтва «Галіяфы»), Людміла Малевіч (выдавецкі аддзел ЕГУ), а таксама Ірына Віданава і Сяргей Сахараў (мультымедыйнае выданне «34»).

Працаю форума апекаваліся Юдыт Блэк (Шведскі Інстытут), каардынатар Нільс Хокансан (выдавецтва «Руін») і мадэратар Пэр Бергстрэм (выдавецтва «Рамус»). Удзельнікі форума мелі і культурніцкую праграму, пачуваліся як у Эдэме, маючы ў сваіх шэрагах Адама і Еву — Адама Персана (выдавецтва «Хёльстрём») і Еву Стэнберг (выдавецтва «Ордфронт»).

**Алеся Сіўчыкава**

РЭПАРТАЖ

## «ГАЛІЯФСКАЕ ТРОХКНІЖЖА»

**Не выдавецтва робіць аўтараў, а аўтары — выдавецтва. Да такой высновы можна было прыйсці падчас прэзентацыі новых кніг незалежнага выдавецтва «Галіяфы», якое 16 верасня запрасіла сваіх чытачоў на прамоцыю свайго «другога фронта мастацтваў»: трох кніг сучаснай беларускай прозы і паэзіі «Анёлак і я», «Піліпікі» і «Вітражы» адпаведна аўтарства Леаніда Дранько-Майсюка, Барыса Пятровіча і Эдуарда Акуліна.**


Фота аўтара

«Новакніжнікаў» віншуе Уладзімір Арлоў

Распачаў вечарыну Уладзімір Някляеў — і абдарыў «кніжных юбіляраў» па букету шчырых кампліментаў. Уладзімір Арлоў прачытаў верлібр аб тым, як важна «не баяцца нікога, у тым ліку і самога сябе». Міхась Скобла прапанаваў свой пераклад верша Канстанты Ідэльфанса Галчынскага «Новы часопіс» — як «завочнае» прысвячэнне выдаўцу «Дзеяслова» Барысу Сачанку-Пятровічу. Анатоль Вярцінскі агучыў хроніку лепшых выданняў «Галіяфаў». А Алесь Пашкевіч выказаў абурэнне, што тры кнігі-прэзентанты фармату 140 на 65 міліметраў падчас вечарыны многія называюць малымі кнігамі. Малых кніг не бывае, адзначыў ён. Прасцей напісаць аб'ёмную кнігу, чым укласці свае думкі і пачуцці ў кнігу нятоўстую. І згадаў «захаляўныя» вершы ды «Кабзар» Тараса Шаўчэнкі. І прапанаваў называць новыя кнігі «Галіяфаў» случанска-акадэмічнымі (паколькі галоўныя супрацоўнікі Зміцер Вішнёў і Міхась Башура — са Случчыны, а адказны за выпуск серыі — акадэмік Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі Уладзімір Гніламёдаў).

Сэрцавінай вечарыны сталі выступленні саміх аўтараў. Леанід Дранько-Майсюк чытаў «трылогію» з вершаў пра каханне (мужчын і жанчын), Барыс Пятровіч — некалькі піліпікаў з аднайменнай кнігі, а Эдуард Акулін дарыў «вітражныя» вершы ды новыя песні.

**Антось Фомчанка**

# НАША ЭРА

Ірына ХАДАРЭНКА

***

*Адпачывай, пакуль смяецца поўня.*
*На востраве вастрацца кіпцюры…*
*Паветра расквітнее на жароўні,*
*Калі натоляць прагу ўладары.*

*Васьмёра карлікаў валтузяць футравіну,*
*Лязом кранаючы патончаны прасцяг.*
*Самота тоесная вузкай дамавіне*
*Ад імавернасці да вечнасці наўсцяж.*

*Адпачывай — віжуе паляўнічы,*
*Высмоктваючы адпаведны час.*
*А тыя, што пануюць таямніча,*
*Ужо даўно стварылі твой абраз.*

***

*Краіна, вартая любові,*
*Дзяржава, вартая вайны…*
*Чаму згадзіліся, панове,*
*Надзець на ногі кайданы?*

*Сваіх багоў нашто зракліся,*
*А трон чужынцам аддалі?*
*Цяпер нясе, нібыта лісце,*
*Нас вецер часу ўздоўж раллі.*

*Ралля спустошана бясплоддзем,*
*Традыцый сохнуць карані.*
*Чаму не можаш, мой народзе,*
*Сябе ад здзеку бараніць?*

*Узровень годнасці скаціны*
*Вышэй людскога ў сто разоў,*
*Калі халуйства павуцінне*
*Звісае нават з абразоў.*

*Амаль пазбаўленая мовы,*
*З душой, здранцвелай ад маны,*
*Краіна — вартая любові,*
*Дзяржава — вартая вайны.*



***

*Звярыныя вочы з-за кратаў за мной*
*назіраюць;*
*Жалезная сетка паўстала між намі*
*мяжой…*
*А вочы ўсё сочаць, маўкліва мяне*
*дакараюць;*
*І я незваротнасць быцця адчуваю душой.*

*Лаўлю гэты позірк, і думкі пульсуюць*
*у скронях,*
*Што людзі палююць за глупствам,*
*марнуюць свой час,*
*і свет наш — звярынец, мы самі жывем*
*у палоне,*
*таму нават злоўлены звер —*
*больш свабодны за нас.*

### ECCE HOMO

*Вось — просты чалавек, кавалак біямасы*
*І будучы жыхар драўлянае труны.*
*Ці здольны ён спазнаць, застаўшыся*
*сам-насам,*
*Як брыдка існаваць за кратамі маны?*
*Ці можа ён адчуць у гонцы мітуслівай,*
*Што гэта зноў над ім смяецца небасхіл?*

*Гадуйся, чалавек!*
*Ты ў невуцтве шчаслівы;*
*Учора эмбрыён, а заўтра — толькі пыл.*

### ГОРАД-220

***Лишь тот, кто мыслит, — тот народ,***
***всё остальное — населенье.***
***Я. Яўтушэнка***

*Замшэла-шэрыя дамы*
*Глядзяць вачніцамі пустымі…*
*Сярод бяскрылых і нямых*
*Студнее розум, сэрца стыне.*

*Тут лепш маўчаць, чым гаварыць.*
*Тут не жывуць, а выжываюць.*
*Замест герояў — махляры,*
*Замест асоб — сляпая зграя.*

*Так дзень за днём, за годам год*
*Блукаю я ў драпежным змроку.*
*Куды падзеўся мой народ?*
*Адно насельніцтва навокал…*

***

*Мая нацыя ў стане стагнацыі.*
*Мая мова жыве ў сутарэннях.*
*Не, ніколі не можа мець рацыі*
*Большасць прагнучых самазнішчэння,*

*Большасць тых, хто з усім пагаджаецца,*
*Большасць тых, хто натоўпы стварае,*
*Большасць тых, хто і ноччу, і раніцай*
*Марыць прыпаркавацца да раю.*

*Тая большасць завецца тутэйшымі,*
*Памяркоўнасць ім служыць пасагам;*
*І пасуцца яны па-ранейшаму*
*Пад агульнае млявасці сцягам.*

### НАША ЭРА

*Свет больш нічога не значыць,*
*Толькі магчымасць тлумачыць*
*Гульні малекул.*

*Смерць больш не значыць нічога,*
*Толькі падсмейванне бога*
*Над чалавекам.*

***

*Я памятаю чарадзейны край,*
*Дзе вольны птах і дзікі кот нарвежскі*
*Дапамагалі мне адшукваць сцежкі*
*З людской гамэрні ў непазбыўны рай.*

*Любіла ў лесе я шпацыраваць,*
*Каб зліцца ў адно цэлае з прыродай,*
*Бо толькі ў ёй — сапраўдная свабода,*
*І толькі ў ёй душой магу лунаць.*

*Праз хмызнякі і састарэлы мох,*
*Далей у цемру, у гушчар, у нерушь;*
*Там месціцца адзіны, каму верыш, —*
*Сусветны дэміург, паганскі бог.*

*Ён патлумачыў мне, адкуль мой род:*
*З-пад брам хваін, ад шамацення зёлак,*
*З азёрных нетраў, ад бліскучых зорак,*
*З абшару, дзе ўладарыў Рагвалод.*

*Тады, на момант затрымаўшы ўздых,*
*Я знітавала ў сваім сэрцы безліч:*
*Красу і моц зямлі, прасторы веліч,*
*І таямніцы валуноў сівых.*

*Цяпер мне млосна, розум у журбе.*
*І вабяць зноў далёкія мясціны.*
*Што ж сталася? Чаму ў сваёй Айчыне*
*Чужой я мушу адчуваць сябе?..*

***

*Сядзіць ля дарогі бяздомны сабака…*
*Старым стаў — і выгнаў яго гаспадар.*
*Худы і аблезлы, дварняк-небарака,*
*З надзеяй глядзіць ён прахожым у твар.*

*А людзі… Што людзі? Таксама жывёлы.*
*Навошта ім розум? Дарэмная рэч.*
*Яны не багі і зусім не анёлы:*
*Зірнуць на сабаку і тэпаюць прэч.*

*Ніхто не палашчыць, ніхто не накорміць,*
*Ніхто не падорыць прытулак і схоў,*
*Ніхто не ўратуе; усе толькі гоняць,*
*Шалеюць і шчэрацца горш за ваўкоў.*

*Былы гаспадар смажыць шкварку са смакам*
*І дбае аб выніках «Суперлато»,*
*А дзесьці ля тыну няшчасны сабака*
*Канае ад здрады і вые: «ЗА ШТО?..»*

# ЛІСТЫ МАЁЙ МУЗЕ

Усевалад СЦЕБУРАКА

***Юліі Васюк***

*Мне — ужо не тваіх дваццаць пяць,*
*не любы акіян па калена.*
*І званы не так гучна звіняць,*
*хоць яшчэ не па мне напэўна.*

*Мне цяпер усё часцей шкада*
*таго рознага, што не збылося.*
*Ды няспынна бяжыць вада –*
*і сплыло болей, чым засталося.*

*Мне не страшна было губляць,*
*дый не меў я нічога, зрэшты.*
*Як нядаўна было дваццаць пяць,*
*як няўлоўна змянілася нешта...*

***

*Цяжка пісаць пра вочы —*
*не бачу тваіх вачэй.*
*Не адчуваю далоняў,*
*не абдымаю плячэй.*
*Грэшна пісаць пра цела,*
*смешна пісаць пра душу.*
*Ведаю, ты б хацела…*
*Ведаю і прашу:*
*я напішу пра вочы,*
*рукі і валасы,*
*у іх запляту бы стужкі*
*нашыя галасы...*
*Я ўздыхну з палёгкай,*
*вернецца мой спакой.*
*Толькі не будзь далёка*
*толькі пабудзь са мной…*

***

***Ю. В.***

*Давай падлічым pro et contra,*
*святло і цень.*
*Скрозь гук фінальнага акорда*
*сцячэм слязой па джалу корда*
*у ноч, у дзень…*

*Давай зусім без дэкарацый?*
*Спектакль — удвох.*
*Без вопleскаў і без авацый,*
*без бліскавіцаў папарацы.*
*Хай чуе Бог…*

*Давай пасля забудзем словы,*
*вось так — знарок!*
*Ўвесь свет маўчыць, і адмыслова*
*жыццё сваё пачнём нанова –*
*і зробім крок!*

***

*Штосьці няўлоўнае,*
*штосьці няроўнае,*
*нібы інэртны газ,*

*штосьці няпэўнае*
*штось патаемнае*
*ў рытміцы гэтых фраз.*

*Штосьці балючае,*
*штосьці калючае*
*стрэмкаю ў галаве.*

*Штосьці няіснае,*
*штосьці наўмыснае*
*дымам сівым плыве.*



*Штосьці такое,*
*што непакоіць,*
*што прыпыняе час...*

*Слухай, каханая,*
*шчырую споведзь:*
*нам не хапае НАС!*

### Уся праўда пра яе

***Ю. В.***

*Яна ведае мовы і моду,*
*мае цвёрды жыццёвы план,*
*і з усмешкай ўкладае прыгоды*
*ў наш сур'ёзны лірычны раман.*

*Яна любіць тэкілу «Альмеку»*
*і кудлаціць мае валасы.*
*Мы ляцім наўздагон яе смеху*
*з развароты праз дзве паласы.*

*Яна можа ні чым не займацца —*
*проста плакаць, ці проста спяваць,*
*а ўвечары так затрымацца,*
*што я двойчы стамлюся чакаць...*

*Ды калі, нібы на фотаздымках,*
*загарнуўшыся ў мяккі плед,*
*яна сцішыцца... У абдымках*
*мне падасца — трымаю свет!*

***

*Усе нашыя недарэчнасці,*
*усе нашыя «супраць» і «за» –*
*такая дробязь для вечнасці,*
*як для акіяну сляза.*

*Бясспрэчна — жыццё складанае,*
*бясспрэчна — ва ўсіх свой крыж,*
*але не крыўдуй, каханая.*
*Так цяжка, як ты маўчыш!*

*Даруй! І ў звычайным вечары,*
*стамлёная доўгім днём,*
*адчуеш — казыча плечы*
*анёлак твае*
*крылом...*

### Перад ад'ездам

*Тэкіла і пах парфумы,*
*соль на вуснах тваіх.*
*Думак маіх тайфуны*
*і Lucky Strike на дваіх.*

*Бяссонная жарсць у абдымках.*
*Наш цёплы і колкі плед.*
*І памяці фотаздымкі.*
*І твой ад'езд у абед.*

*Наш вечар, ў якім мы разам.*
*Наш вецер, які — у твар.*
*Уверх ад гатэлю «Плаза»*
*у наш караоке-бар.*

*Як мала апошняй ночы!*
*Як шмат аднаго ў адным!*
*Па-здрадніцку рэжа вочы*
*слязой тытунёвы дым…*

АБРАЗКІ

# НЕЎПАРАДКАВАНЫЯ

Ніл ГІЛЕВІЧ



## Я?.. Я — ніхто!..

Ці можа хоць на імгненне ўсміхнуцца Богу паэт? Можа, вядома. Мне, напрыклад, нядаўна пашчасціла такое імгненне перажыць. Але — толькі імгненне.

Еду электрычкай за горад. На душы — хмарна. Усе нядобрыя прадчуванні і чаканні спраўджваюцца. З бязлітаснай неадступнасцю. Хвароба прагрэсуе. Дакладней — хваробы, бо іх шмат. Але — не гэта галоўнае. Галоўнае — што прагрэсуе крызіс. Не фінансавы (хоць і ён дае знаць пра сябе). Крызіс грамадскай маралі. Крызіс культуры, літаратуры і мастацтва. Крызіс духоўнасці. Крызіс разумнай арганізацыі быцця. Хмарна — і сумна.

На першым жа перагоне ад Менску на свабоднае месца насупраць перасела з суседняга купэ немаладая жанчына — перадпенсійнага, а можа, ужо і пенсійнага ўзросту, інтэлігентнага твару, зграбна апранутая, з дзвюма — скуранай і палатнянай — сумкамі. Загаворваць з незнаёмымі пасажырамі — зусім не ў маіх правілах. Зусім. Ніколі гэтага не раблю. Сяджу і думаю сам сабе. А часцей за ўсё чытаю прэсу. Хто яна? Падумалася: відаць, настаўніца. Сельская інтэлігентка.

Як зазвычай, вымаю і разгортваю газеціну. На гэты раз — расейскую літаратурную. Зноў натыкаюся на абрыдлы, прагорклы матыў: Расія, Украіна і Беларусь — адно і тое ж, адно цэлае, і мова навукі, адукацыі, культуры павінна быць адна. «Песни петь можно и на украинском. Но создать собственную интеллектуальную культуру — сложно». Усё зразумела. Песні свае можаце спяваць. Але — не больш. Ну яшчэ і ў футбол «каждому народу можно играть своей сборной». І ўсё. Песні і футбол. Гэта палякі (чэхі, балгары, фіны, угорцы) могуць мець сваю інтэлектуальную культуру. А беларусы — ну не! Для іх досыць, каб пелі свае песні і гулялі сваёй нацыянальнай камандай у футбол. І то — часова, пакуль не гэта самае… Апусціў газету на калені, склаў на ёй рукі і не варушуся. Божа ты мой! Гэта ж усё сталае жыццё я мушу думаць адно і тое! Во каб цябе перуны спяклі, такую долю! Няма ратуначку.

Яшчэ як чытаў, колькі разоў, адрываючыся ад тэксту, падымаў вочы і лавіў на сабе позірк жанчыны, які яна імгненна адводзіла ўбок, у акно. Так і цяпер, калі я, пагараваўшы ў думках, падняў галаву. Уставілася ў акно і колькі хвілін сядзела нерухома. Калі аб'явілі чарговы прыпынак, раптам паднялася і дала зразумець, што яна выходзіць. Маўляў, ногі з праходу трохі падбярыце пад сябе, калі ласка. Раней чым пакінуць купэ, глянула мне ў твар добрымі сумнымі вачыма і замест «шчасліва» мяккім ціхім голасам сказала:

— Дзякую…

Здзіўлены такім развітаннем, я, натуральна, спытаў:

— Мне? За што? Што ціха сядзеў, не буяніў?

Па вачах убачыў, што жарт зразумела.

— За ўсё. Я ведаю, хто вы. Я пазнала вас. Па здымках у газетах…

— У такім разе скажыце, а хто — вы? — шчасліва ўсміхнуўшыся Богу, спытаў я дзіўнаватую пасажырку.

— Я?.. Я — ніхто! Была ніхто, а цяпер і зусім ніхто…

Я памкнуўся запярэчыць жанчыне: маўляў, так не бывае, кожны чалавек мае сваё імя і сваю годнасць… Але не паспеў.

— Прабачце, ужо спынілася электрычка…

Кіўнула мне галавой і заспяшалася да дзвярэй.

Вось я і ўсміхнуўся Богу. І сапраўды толькі на адно імгненне. І не даўжэй. Што ж я буду Табе даўжэй усміхацца, Божа, калі на маёй зямлі, на нашай святой зямлі добры чалавек кажа: «Я — ніхто! Я зусім ніхто!..»

**2009**

## Чаму яны гэта рабілі?

Некалькі вечароў запар гартаўперагортваў, чытаў-перачытваў том беларускай паэзіі, прозы і эсэістыкі пад назвай «Расстраляная літаратура». У падзагалоўку — удакладненне: «Творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады».

Том — аб'ёмісты, на семсот старонак. У ім — узоры творчасці 67-і аўтараў.

Кніга страшная. Вельмі страшная. Такой кнігі няма ні ў адной краіне свету, ні ў аднаго народа. Няма — таму што няма ў свеце другой літаратуры, якая б перажыла такую жахлівую трагедыю, як наша, беларуская. Тут нам суджана трымаць «ганаровае» першынства. На працягу ўсяго некалькіх гадоў было рэпрэсавана каля сотні пісьменнікаў, з іх 67 былі гвалтоўна пазбаўлены жыцця, — або расстраляны, або замучаны на катарзе. У ліку загубленых — творцы вельмі вядомыя, якія склалі цвет нацыянальнай літаратуры, яе славу і гонар (Гарэцкі, Галубок, Ластоўскі, Лёсік, Аляхновіч, Гартны, Чарот, Зарэцкі, Жылка, Мрый, Бабарэка, Хадыка, Дудар, Галавач, Кляшторны), і зусім маладыя — аўтары адной-другой кніжкі, як геніяльны празаік Лукаш Калюга, арыштаваны на 24-м годзе жыцця, расстраляны на 28-м, як аўтар яшчэ толькі рукапісу першай кнігі, пазначаны прыкметамі геніяльнасці паэт Сяргей Астрэйка, арыштаваны ў 21 год, расстраляны ў 25 гадоў ад роду, як паэт Мікола Гваздоў, арыштаваны ў няпоўныя 20 і праз год расстраляны. Былі загублены выдатныя эсэісты і публіцысты (Уласаў, Самойла, Шантыр, Цвікевіч, Рак-Міхайлоўскі, Антон Луцкевіч, Тарашкевіч, Адам Станкевіч, Смоліч, Езавітаў і інш.), чые бліскучыя артыкулы, прамовы, нататкі і сёння трэба чытаць і перачытваць, чытаць і перачытваць! — бо, здаецца, сёння яны яшчэ больш актуальныя, больш надзённыя, чым тады, калі былі напісаны.

Чытаць і перачытваць… Але каб чытаць і перачытваць, трэба — каб кніга прыйшла да кожнага інтэлігента, у кожную сям'ю, дзе ёсць маладыя людзі — студэнты, навучэнцы ліцэяў і каледжаў, гімназісты, школьнікі… А як яна прыйдзе, калі наклад — усяго семсот асобнікаў? Падумаць толькі: кніга, якая павінна быць у маладых людзей настольнай, выйшла накладам у семсот асобнікаў! Якая ганьба! Не 70 тысяч, а ў сто разоў менш! Каму ганьба? Дзяржаве, зразумела. Нашай роднай дзяржаве. Менавіта яна магла б заказаць выдавецтву наклад у 70 тысяч асобнікаў і выдзеліць на іх выданне грошы. Магла б — калі б думала пра трагічны лёс нацыі і яе культуры, пра будучыню беларускага народа; калі б разумела, што народ будзе нацыянальнай супольнасцю толькі да таго часу, пакуль у яго ёсць свая нацыянальная культура, свая літаратура і мастацтва. А перад усім — свая мова.

Самы важны, самы галоўны акцэнт у адказе на пытанне «Чаму яны гэта рабілі?» (чаму так па-зверску вынішчалі беларускую інтэлігенцыю?) так і не пастаўлены. Гаворым пра тыранію і тыранаў, пра іх нянавісць да дэмакратыі і дэмакратычных інстытутаў, да свабоды слова і сумлення і пра многае іншае. І зусім мала гаворым, што ў каланізатараў па-над усімі нянавісцямі была нянавісць да беларускай мовы, да самога духу беларушчыны. Задачай задач было — вытравіць, выгнаць беларускае слова адусюль так, каб і знаку не засталося. Бо разумелі: страшней за ўсё — калі ў беларускага народа будзе свая мова. Тады будзе і ён сам. Тады будзе ў яго і свабода і незалежнасць. Пакуль будзе жыць мова — будзе зноў і зноў абуджацца і нарастаць дух беларушчыны, будзе сцвярджацца сябе ідэя беларуская нацыянальнага адраджэння. Таму трэба фізічна вынішчыць галоўных носьбітаў гэтай ідэі — творцаў і майстроў беларускага слова: пісьменнікаў. Што яны звышспаскахова і рабілі.

**2009**

## Вобразатворныя магчымасці нашай мовы

Тое, што гэтыя магчымасці незвычайна вялікія, ведае кожны, хто добра валодае ёю — нашай роднай мовай, хто чытае творы лепшых беларускіх пісьменнікаў, майстроў мастацкага слова, чытае беларускі фальклор — ва ўсіх яго жанрах, хто любіць гартаць слоўнікі беларускай мовы, асабліва — дыялектныя і этымалагічныя. Для мяне асабіста чытаць і тое, і другое, і трэцяе — невыказная насалода. Іншы раз ну проста няма мяжы здзіўленню, як народ-моватворца крэатыўнасвабодна абыходзіцца са словам, як дасціпна і мудра карыстаецца ім, які дасканалы эстэтычны густ і майстэрства выяўляе пры гэтым! Спашлюся толькі на адзін прыклад.

Нядаўна спатрэбілася пагартаць 10-ы том Этымалагічнага слоўніка нашай мовы (навуковы рэдактар — знакаміты лінгвіст Г.А.Цыхун). і наткнуўся на любімае слоўца светлай памяці прафесара Ф.М.Янкоўскага «пустадомак». Праз Фёдара Міхайлавіча, з якім мы былі ў сяброўскіх адносінах, яно стала і маім любімым, і ў вуснай мове і на пісьме. Засведчу:

*І гаркнуў рыжы: — Пустадомкі!*
*Спыніце гэту балбатню!*
*Бо як вазьму цурбэлак ёмкі —*
*Як пацукоў вас разганю!*

*Пакуль пустою гаварыльняй*
*Вас тлумяць лекары навук —*
*Нязгары з п'янай камарылляй*
*Свае тамы здаюць у друк!..*

Гэта — як дасведчаны чытач, напэўна, пазнаў — з паэмы «Сказ пра Лысую гару», з раздзела «Вялікі рух».

Дык вось у Слоўніку і кінулася мне ў вочы «пустадомак» — з патлумачэннем: «бестурботны чалавек, які не дбае пра дом, сям'ю, гаспадарку». Гляджу вышэй і ніжэй ад «пустадомак»: аднатыпныя па ўтварэнні складаныя словы ад адной і той жа зыходнай асновы «пусты». Ды якія словы! Адно трапней, ярчэй, вобразней за другое. Пустабрэх — балбатун, пляткар. Пустабяка — (і Пустабека) — пусты чалавек, што робіць пустое і гаворыць пустое. Пустагаловак — бесталковы чалавек. Пустаглум — хто бескарысна марнуе грошы ці іншыя каштоўныя рэчы. Пустаграк — чалавек ні да чога не здатны: самахвал, хвалько. Пустагром — балбатун. Пустадумак — чалавек, што робіць неабдумана, легкадумны. Пустадзліна — пусты, недалёкі чалавек, пустамалот. Пустазвон — балбатун, несур'ёзны чалавек. Пустальга — легкадумны, пустагаловы чалавек. Пустамалот — балбатун, чалавек, які без сэнсу гаворыць, крычыць. Пустамеля — несур'ёзны чалавек. Пустамлін — балбатун… Пустасмех — несур'ёзны чалавек, што часта і без прычыны смяецца. Пустаход — чалавек, які ходзіць бязмэтна, валацуга. І нарэшце нескладаны, а прасты назоўнік Пустыня — нягаспадарлівы чалавек, пустадомак; лгун, балбатун. (У нашым выпадку казалі Пустыня — з націскам на апошнім складзе: «Што з гэтай пустынёй гаварыць?»).

Міжволі падумалася: чаму ў нашай мове так многа падобных характарыстычных сінонімаў? Ну гэта ж не так сабе, не выпадкова. Мабыць, у самой нашай грамадзе, у самой беларускай супольнасці вельмі шмат носьбітаў гэтай непрыгожай адмоўнай якасці. Мабыць, вельмі часта добраму, сумленнаму, сур'ёзнаму чалавеку даводзіцца ўсклікнуць: «Во дзе пустабрэх, га!» Або: «Ну і пустазвон! Божа, які пустазвон!» Або: «І адкуль такі пустамалот узяўся?»

**2008**

## Спадзяюся, грамадзяне Беларусі помняць

Вельмі непрыемны занятак — згрібаць нахляпаную на цябе паклёпніцкую гразь, але ж мусіш, бо і будзеш хадзіць абхляпаны, ніхто ж іншы не зграбе. У нас гэта амаль нерэальна, каб нехта ўзяў ды сказаў: «Як вам не сорамна — брудзіць імя невінаватага?» Хутчэй парадуюцца: «Правільна! Так яму і трэба!!»

За доўгае жыццё ў літаратуры (больш за паўстагоддзя) давялося зведаць усякае, у тым ліку і жорсткія ўдары пад дых, і нечаканыя здрадніцкія выпады, і несправядлівыя абвінавачванні ў грахах, мною не ўчыненых. Канешне, усе такога кшталту «прывітанні» ад сяброў і ворагаў я ўспрымаў з засмучэннем, а то і з болем. Хаця… бывала, што і зведваў радасць. Напрыклад, калі бачыў, што пускаюць ад злосці ядавітую сліну цёмныя прыблуды і хрыстапрадаўцы — за маю любоў да Беларусі і беларушчыны, за маю абарону роднага слова. «Ага, — казаў я сабе ў такім разе. — значыць, працую, як трэба».

Мушу прызнацца, што чым бліжэй да «краю», тым больш атрымліваю незаслужаных удараў. Нядаўна прачытаў мемуары аднаго былога партработніка і журналіста, у якіх зроблены непрыстойны замах на мой чалавечы і пісьменніцкі гонар. Іх аўтар «ничтоже сумняшеся» сцвярджае, што Камісія па адукацыі і культуры ВС РБ, старшынёй якое я быў з чэрвеня 1991 па снежань 1995 года, «зарэзала» яго кандыдатуру на званне заслужанага работніка культуры БССР, зацверджаную, як ён піша, у ЦК КПБ. Насуперак рашэнню ЦК — у Камісіі ВС БССР(пакуль быў ЦК — была БССР, а не РБ) узялі дый «зарэзалі». Гэта, мякка кажучы, дэзынфармацыя, а калі не так далікатна казаць — гэта хлусня. Ягоная справа аб прысваенні звання ў нашай Камісіі не разглядалася, бо і не магла разглядацца і, значыць, не магла быць адхіленай. Кожная Пастаянная Камісія ВС рыхтавала да разгляду на Прэзідыуме ВС справы аб званнях ці ўзнагародах строга адпаведна профілю. Напрыклад, Камісія па ахове здароўя разглядала кандыдатуры медыкаў, Камісія па навуцы — кандыдатуры вучоных, Камісія па адукацыі і культуры — кандыдатуры педагогаў, дзеячаў літаратуры і мастацтва,

# НАТАТКІ

работнікаў культасветустаноў. Што датычыць работнікаў друку, а таксама тэлерадыё, іх кандыдатуры, натуральна, разглядала Пастаянная Камісія ВС па СМІ. Такі існаваў у ВС РБ парадак разгляду «заявак» на званні і ўзнагароды. «Пакрыўджаны» ішоў на званне як партыйны журналіст, рэдактар органа ЦК КПБ, яго кандыдатура павінна была разглядацца на Камісіі па СМІ. Так і толькі так!

Праз нашу Камісію прайшлі, пры маёй падтрымцы, і атрымалі званне Народнага Р.Барадулін, І.Чыгрынаў, М.Фінберг, А.Ярмоленка, артысты М.Пятроў, С.Акружная, Г.Арлова, В.Лебедзеў, В.Белахвосцік і яшчэ з паўдзесятка артыстаў, а на званне Заслужанага прайшло, бадай, і з паўсотні прэтэндэнтаў, і ніводная кандыдатура не была «зарэзана». Так што аўтар мемуараў прыпісаў мне віну нейчую. Дзе застрэла яго справа — мог бы пацікавіцца ў архівах ВС РБ, СМ РБ, ЦК КПБ, а не выдаваць сваю выдумку за праўду.

Але мяне больш уразіла не гэта прыпісаная мне віна, а тое, як былы адказны функцыянер ЦК яе патлумачыў: «На кім жа яшчэ ўрэшце рэшт, як не на сябрах, можна прадэманстраваць сваю прынцыповасць і дзяржаўную мудрасць». Во як! Проста напавал! Гэта — я на пасадзе старшыні Камісіі ВС такім чынам прадэманстраваў сваю прынцыповасць і дзяржаўную мудрасць — «рэзаннем» сяброў. Ну, што ж, мэты аўтар гэтага пасажа (падазраю: у суаўтарстве з дарадчыкам) дасягнуў. Прачытаўшы, я доўга сядзеў як анямелы і маўчаў. Божа Прамілы, Прасветлы! Шмат усялякіх подлых выпадаў зазнаў я за жыццё, гэта — адзін з самых злосных.

Спадзяюся, грамадзяне Беларусі (не самыя маладыя) помняць і ведаюць, чым быў заклапочаны і што рабіў Н.Г. на пасадзе старшыні Камісіі ВС па адукацыі і культуры, у імя чаго рваў-надрываў сэрца.

2008

## З безапеляцыйнай прастадушнасцю

Дзесь на парозе новага XXI стагоддзя мне собіла прачытаць у адным сатырычным зборніку з дазволу сказаць «паэму», у загалоўку якой значыцца імя звышсексуальнага героя парнаграфічнага твора рускага паэта да-пушкінскай эпохі І.Баркова. Вельмі непрыемна мяне ўразіла тое, што аўтар гэтай вершаванай «сатыры» выкарыстаў мой псеўданім Францішак Вядзьмак-Лысагорскі. Ужо толькі зусім сляпы і глухі чытач беларускай паэзіі сумняваўся, каму належыць гэты псеўданім. І вось — давай і я падпішу сваю «страшна смелую» сатыру папулярным літаратурным імем. І падпісаў. З безапеляцыйнай прастадушнасцю. Між іншым, ёсць адзін цікавы аспект гэтай творчай «смеласці». Аўтар ведаў, што моцна разгневаны аб'ект яго сатыры будзе помсціць… каму? Паэту, якому належыць псеўданім Ф. Вядзьмак-Лысагорскі, — паколькі той не абвяргае сваё аўтарства «Лукі». Не абвяргаў, мушу заявіць, па адной прычыне: прыпісаная Ведзьмаку-Лысагорскаму «паэма» — зусім бездапаможная ў літаратурных адносінах рэч, не можа быць, каб нехта прыняў яе за плён працы Н.Г. (Ведзьмака-Лысагорскага). Як аказалася, я памыляўся, думаючы, што ўсім і так зразумела: да прымітыўна зарыфмаванай грубай лаянкі Н.Г. не мае ніякага дачынення. Сатырычная паэзія — не лаянка, а вельмі нялёгкі від мастацкай літаратуры. Яна вызначаецца глыбінёй пранікнення ў сутнасць з'явы, сілай мастацкага абагульнення, высокай культурай пісьма і абавязкова — спецыфічнымі моўнымі фарбамі. Няма гэтых фарбаў у мове твора, няма іроніі і сарказму, дасціпнага смеху, няма ярка вымаляваных вобразаў-тыпаў, — няма і сатыры. Я быў упэўнены, што дасведчаны чытач спатыкнецца ўжо на самім загалоўку і скажа: гэта ў паэтыку Н.Г. абсалютна не ўпісваецца. Гэты брутальны «скабрезный» варварызм (Мудищев) занесены ў Беларусь з Расіі, і карыстаюцца ім тыя, хто кепска адчувае дух нашае мовы, у якой — і лаянка свая, беларуская, і свае мянушкі, ці абзыванні.

Так я думаў і, паўтараю, памыляўся. Каля году назад адзін паважаны мною літаратар даверліва спытаў: «А што ж вы не ўключылі ў свой том «літаратурных містыфікацый» паэму пра Мудзішчава?» Я, прызнацца, быў не толькі збянтэжаны, але агаломшаны. «ЯК? Вы мне прыпісваеце гэту непрафесіянальна скляпаную рэч? Хіба я працую ў паэзіі на такім узроўні?» А зусім нядаўна гэтае ж пытанне дакладна паўтарыў яшчэ адзін паважаны мною прафесіянальны чытач літаратуры. Прызнаюся, я нават трохі раззлаваўся. Дарагія сябры! Чаму так лёгка ўзаконьваеце свaім аўтарытэтам відочную фальшыўку? Хіба ў ёй бачны адметныя рысы паэтыкі маіх сатырычных і гратэскавых твораў? Прабачце, але я працую ў літаратуры прафесіянальна і ўсякае самадзейнае бэрсанне «сцішкоў» успрымаю адэкватна — як прафесіянал. Навошта ж чыёсьці бездапаможнае аматарскае вершаробства прыпісваць мне? У пачатку 70-х, калі, пад свежым уражаннем, касякамі пайшлі перайманні «Сказа пра Лысую гару», гэта можна было зразумець. Але сёння — амаль праз сорак гадоў? Пабойцеся Бога!

Каб толькі шаноўныя чытачы ведалі, як гэта ўсё мне збрыдзела і выматала духі!..

2008

## Мой час наперадзе…

Гады не ідуць, і нават не бягуць, а ляцяць-мільгаць. Здаецца, зусім нядаўна добрыя людзі віншавалі маю міласць з 70-годдзем. І быў не абы-дзе, а ў Чырвоным Касцёле юбілейны паэтычны вечар, наладжаны Таварыствам беларускай мовы. Меркавалася, што ён адбудзецца ў невялікай Дольнай зале, але народу прыйшло столькі, што яшчэ за паўгадзіны да пачатку яна была перапоўнена. А людзі, мае дарагія чытачы, усё ідуць і ідуць. Сітуацыю зразумеў пробашч касцёла кс.Уладзіслаў Завальнюк і прапанаваў перавесці публіку наверх, у вялікую, галоўную залу храма. Гэта і выратавала вечар ад непрадбачаных непрыемнасцяў. Там памясціліся ўсе. Праўда, больш паловы прысутных былі вымушаны ўвесь вечар стаяць (блізу 2000 чалавек было).

Дык вось, гады не ідуць і не бягуць, а ляцяць: толькі што было 70-годдзе, а ўжо і семдзесят пяць на парозе, бо на календары — 2006-ы. Па добрай даўняй традыцыі дзяржаўнае выдавецтва «Мастацкая літаратуры» наважыла выдаць да гэтай падзеі томік маёй лірыкі. Прытым, у гэтак званай «залатой серыі» «Беларуская паэзія XX стагоддзя». Рэдакцыяй Выбраных твораў у выдавецтве тады загадвала Наталля Семашкевіч, дачка І.А.Брыля, яна і паведаміла мне, што мая кніга ўключана ў план выдання на 2006 год, і таму, «калі ласка, дайце рукапіс». І прыслала мне брашурку «Тэматычны план выдавецтва «Мастацкая літаратура». 2006». Каб я пераканаўся, што кніга сапраўды ў плане. І я пераканаўся. Акрыліўшыся, пачаў складаць сваё невялікае Выбранае. Натуральна, адбіраў самае лепшае і, з увагі на ідэалагічную сітуацыю ў краіне, самае «бяскрыўднае». Не паспеў адвезці рукапіс у выдавецтва, як адтуль званок:

— Ніл Сымонавіч, прабачце, але радасць была заўчаснай: ваш зборнік з плана выкінулі. Зарэзалі. У міністэрстве.

— Во як! — усклікнуў я ад нечаканай навіны. — а на якім узроўні? Сам міністр? Ці намеснік? Ці хто? Можа, вахцёр?

— Мы не ведаем. З міністэрства план вярнулі моцна парэзаны. Выкінулі ўсё, што на іх думку не заслугоўвае выдання. Многіх выкінулі.

— А па гэтай серыі — «Паэзія XX стагоддзя»?

— І па гэтай таксама…

— Ну хоць хто-небудзь застаўся?

— Вядома, застаўся…

— Ну то дзякаваць Богу, што хоць нехта застаўся. Што не ўсіх падчыстую «эвэкнулі». Значыць, сяго-таго з сучасных вершатворцаў начальства цэніць. Лічу, што гэта не самы горшы варыянт, таму — не перажывайце, калі ласка.

— Вы не перажывайце…

— І я не буду. «Мой час наперадзе. Яшчэ ён прыйдзе — мой запаветны беларускі час», — працытаваў я, на развітанне, радкі з верша, якім хацеў закончыць запланаваны выдавецтвам зборнік.

2006

## Пра беларускае гучанне беларускай мовы

Адна з галоўных бед нашай сучаснай літаратурнай мовы — тое, што яна ўсё больш траціць свой уласны беларускі сінтаксіс і сваю непаўторную фанетыку і праз гэта перастае гучаць як беларуская. Мы ўсе ведаем і кажам: мова — душа народа, і гэта праўда: так, душа. Але ці многія ведаюць, што ў сваю чаргу сінтаксіс — душа мовы? У нас прывыклі перш за ўсё глядзець на лексіку — ці беларуская лексіка? Ці не зашмат у тэксце гэтак званых «барбарызмаў», слоў запазычаных, дакладней — сілком перанесеных з рускай, польскай, украінскай і іншых моў, бо, маўляў, гэта робіць беларускую мову небеларускай. Не, не гэта галоўная бяда. У кожнай мове безліч слоў запазычаных. Бяда ў іншым. Яшчэ Язэп Лёсік — выдатны знаўца роднай мовы — пісаў: «Трэба памятаць, што мова псуецца ды становіцца штучнаю, чужою і малазразумелаю не ад чужых слоў. Яна псуецца чужою граматыкаю — чужою фанетыкаю, марфалогіяю і сінтаксісам» («Узвышша», 1927, №5, стар.196). З гэтых трох «кітоў», якія вызначаюць беларускасць беларускай мовы, я вылучаю перш за ўсё сінтаксіс і фанетыку, а тады ўжо марфалогію.

Сінтаксіс, сінтаксіс і яшчэ раз сінтаксіс павінен быць беларускім! Трэба з маленства вучыць дзяцей засвойваць беларускі сінтаксіс — парадак і счапленне слоў, інтанацыю, мелодыю, музыку гучання беларускай мовы, беларускай фразы. Колькі гаворана-перагаворана: «Наша мова вельмі мілагучная, пявучая, галасістая». Так! Дык давайце ж будзем паказваць гэтыя яе цудоўныя якасці!

Другая вялікая бяда наша — небеларуская фанетыка, небеларускае вымаўленне беларускіх слоў, беларускіх гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных, афрыкатаў дж, дз, дыфтонгаў. Гэтаму — арфаэпічным нормам — трэба вучыць дзяцей ад калыскі, з дзіцячага садка, з першых класаў школы.

У каго вучыцца сапраўднаму беларускаму сінтаксісу? У М.Гарэцкага, у Я.Коласа, Я.Купалы, у Ядвігіна Ш., у Чорнага, Мележа, Брыля, Пташнікава, Адамчыка, у Калюгі, Скрыгана, Кудраўца, Стральцова… У каго вучыцца натуральным беларускім нормам марфалогіі? У гэтых жа і іншых выдатных майстроў беларускага мастацкага слова. А ў каго вучыцца натуральнаму беларускаму вымаўленню? Перш за ўсё — у народа, у жывых носьбітаў мовы, у іх маўленчай практыцы — з агаворкай: дзе яно, маўленне, не спахаблена на рускі лад.

2009

## І найшла на душу паныласць

Вясной 1985-га, калі толькі адбыўся знакаміты сакавіцкі Пленум ЦК КПСС, што абвясціў курс на Перабудову,выйшаў з друку мой вершаваны раман «Родныя дзеці». Радасці мне гэтая падзея прынесла шмат, а яшчэ больш — хвалявання. Яно і зразумела: выдрукаваць раман у вершах — справа не жартоўная. Тым больш, калі ведаеш, што гэта першы ў беларускай літаратуры твор у названым жанры. («Новая зямля» Якуба Коласа — не раман, а зводпаэм, ці вершаваных аповедаў, у гэтай геніяльнай рэчы — не раманныя сюжэт і кампазіцыя; гэта штосьць значна большае, чым раман, гэта наш нацыянальны эпас, які ў фальклоры многіх народаў у свой час аформіўся, а ў нас не паспеў). Тут — захваляюешся! Як успрымуць кнігу і што скажуць чытачы, крытыкі, а найперш — сябры-таварышы? Сяброў-таварышаў і надзяліў я навапечаным томікам. Асобнікаў трыццаць раздаў: каму паслаў поштай, каму ўручыў асабіста. І стаў чакаць водгукаў. Ці пісьмака-паштовачкі, ці тэлефоннага званочка, ці слоўца-другога пры выпадковай сустрэчы. Не чакаў толькі ад Быкава, бо ён чытаў раман яшчэ ў рукапісе і зрабіў некалькі слушных заўваг, якія я з удзячнасцю прыняў.

Чакаю тыдзень, другі, трэці, чакаю месяц, і другі, і трэці… Ніхто — ані дзлэнг! І мне стала сумна. Страшнавата стала. На душу найшла цяжкая паныласць. Як быццам я нешта надта нядобрае зразумеў. «Дык вось яно што выходзіць! — усё казаў і казаў сабе паўярнся (г.зн. раз за разам, толькі павярнуўся — і зноў; так гаварылі, з маленства помню, мой дзед, мама і ўслед за імі — усе ў нашай сям'і). — Дык гэта ж выходзіць, што ніхто з іх маё «тварэнне» не прачытаў. Бо не магу ж я паверыць, каб сябра-таварыш, прачытаўшы, ніяк не азваўся — ні словам, ні паўсловам, — хай сабе і не хвалебным, а крытычным, нават вельмі крытычным, — у жыцці літаратара гэта натуральна. Але — каб поўнае праігнараванне? Свайго роду «змова маўчання»? Значыць, цалкавітая няўдача? Творчая катастрофа? Няўжо?

Перачытаў кнігу колькі разоў сам — уважліва, засяроджана, удумліва. Можа, сапраўды, у ёй шмат пустога, несур'ёзнага, нежыццёвага, зусім неактуальнага? Ды не: усё і сур'ёзна, і актуальна, і ўсё ад жыцця: і сюжэтныя калізіі, і характары-тыпы герояў… Дык, можа, рэч зусім слабая ў мастацкіх адносінах, можа, напісана разлезлым ці анемічна-дохлым вершам? Не, і з гэтым пагадзіцца не магу. Ніяк не магу!

О, як гэта тады мяне моцна падсекла!

На шчасце, пачалі заспакойваць і вызваляць душу ад якогасьці горкага прыгнечання чытачы. Тыя, якіх радавымі ці шэраговымі называюць. Пайшлі водгукі — у лістах, вядома. А нават і водгук у прэсе паявіўся. У «Звяздзе». Нататка журналісткі Алены Цiхановіч пра тое, як яна ў электрычцы зацікаўлена гартала прыхоплены ў дарогу раман «Родныя дзеці». Не рэцэнзія, вядома, а ўсё ж водгук. І вельмі станоўчы. Праз колькі месяцаў паэтка Раіса Баравікова надрукавала ў «ЛіМе» свае эсэістычныя нататкі паводле трох прыказак, вычытаных ёю ў «Родных дзецях». Я палічыў гэта за арыгінальную па форме рэцэнзію. Вось і ўсё, і ўсе водгукі, усе крытычныя ацэнкі.

Прайшоў год, два, тры, чатыры — ніхто з сяброў-таварышаў так і не адазваўся. Ні пісьмова, ні вусна. Праз пяць гадоў прыслаў ліст Пімен Панчанка, са шкадаваннем, што не змог раней прачытаць раман «Родныя дзеці», і вось нарэшце прачытаў. Ліст такі, што варта было чакаць не толькі пяць гадоў, але і пяць разоў па пяць. Як у падобных выпадках любяць пісаць журналісты: узнагарода знайшла героя. На гэтай аптымістычнай ноце я і стаўлю кропку.

ЭПІСТАЛЯРЫЙ

# Ларыса Геніюш: «МЯНЕ НЕЛЬГА НАВАТ УСПАМІНАЦЬ»

Публікацыя гэтых лістоў Ларысы Геніюш стала магчымай дзякуючы клопату рупліўца на ніве беларуска-ўкраінскага літаратурнага пабрацімства Рамана Лубкіўскага, пісьменніка, Надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Украіны. «Гэтыя унікальныя дакументы, — адзначыў у сваім лісце Раман Лубкіўскі, перадаючы невядомую раней эпісталярыю Л. Геніюш у мінскі Музей гісторыі беларускай літаратуры, — атрыманыя мною з асабістага архіву выдатнага паэта І. Гнацюка, лаўрэата Нацыянальнай прэміі Украіны імя Тараса Шаўчэнкі, сведчаць не толькі пра цікавыя асабістыя творчыя ўзаемаадносіны, але і пра глыбокае разуменне долі нашых народаў і значнасць іхняй супольнай працы дзеля ўзаемаўзбагачэння дзвюх спарадненых нацыянальных культур».

Лісты Ларысы Геніюш — па-мацярынску пяшчотныя. За кроплю дабрыні і ўвагі яна, каму лёс даў мала светлага, імкнулася ўзамен аддаць утрая больш. Хуткі почырк паэтэсы, да ўсяго, увекавечваў і аўтарскія споведзі, і гаротныя развагі над жыццём былой сталінскай зэчкі ў савецкай імперыі.

Цалкам згаданая перапіска была апублікаваная намі ў №10 альманаха «Тэрмапілы». У публікацыі цалкам захоўваецца аўтарскі правапіс.

С.П.



Магіла паэтэсы ў Зэльве. Скульптар Міхась Інькоў

Зэльва, 11/VIII-70 г.

Дарагі Сябра Іван!

Дружа мілы, дзякую Вам за памяць. Не ведаю, ці гэты ліст да Вас дойдзе. Кіне яго муж у Баранавічах. Сябры мае чыталі ў Аўстраліі «Жовтень». Яны захопляныя. Гэта было для мяне адзінае прывітанне ў прэсе [Ва ўкраінскім часопісе «Жовтэнь» (№3, 1970 г.) была апублікаваная нізка вершаў апальнай на той час Ларысы Геніюш. Сярод перакладчыкаў вершаў быў і Іван Гнацюк, якому ў горад Барыслаў Львоўскай вобласці адрасуюцца лісты. — Рэд.]. Дзякую Вам усім! Людзі былі аж з Караганды. Было многа плачу. Адна дзяўчына шукала нас, каб павіншаваць і перадаць падарак аж з Лос-Анжаласа. Ад свае сястры… Старая хата ўся была ў кветках. Не ўсе людзі баяліся. Йшлі з букетамі, нават прадаўшчыца з магазіна. Усім была чарка. Бог памагаў, і ўсяго хапіла і асталося.

Яшчэ трывожна, усе раз'ехаліся. Здароўе маё няважнае. Столькі гора прынесьлі мне і прыносяць мае ворагі, гэта надчалавечыя сілы.

Браты мае, сябры мае дарагія, дзякую Вам за ўсё і буду вельмі рада бачыць Вас у сваёй хаце. Прыязджайце яшчэ зацепла, каб пагутарыць мы змаглі ў чыстым полі пад нашым небам.

Бывайце здаровыя, заставайцеся з Богам!

Ваша Ларыса Геніюш.

Зэльва, 18/IX, 70 г.

Дарагі і паважаны Дружа!

Дзякую Вам за ліста і за ўсе Вашыя шчырыя і добрыя словы.

Як жаль, што Вы хворы, як жаль. Хацела б болей ведаць аб стане вашага здароўя. Прыкра толькі, што вас не друкуюць у перыёдцы. Ці гэта часова? Чым «правініліся»? Пішуць мне сябры здалёк, што вашыя суродзічы і там мяне не забылі! Дзякуй Ім вялікае! Успомніла мяне на днях пару словамі і беластоцкая «Ніва». Пішу цяпер мала, крыху хварэю. Усюды на мяне такая «нагонка», што жыць цяжка, не тое, што пісаць. Лісты да мяне пагана даходзяць, а ад мяне да людзей яшчэ горай. Нават да сына даходзяць не ўсе. Але, як Вы зазначылі, мы да ўсякіх труднасьцяў ужо прывыклі. Жыву як затворнікі і многа працую ўдома фізычна. Чытаю.

Калі б змаглі да нас прыехаць, дык будзем Вам вельмі радыя, пазнаёміцца нам неабходна. Маё прызнанне і ўдзячнасьць да вас не маюць граніцаў. Лёс мой не цікавы, таму чым хутчэй прыедзеце, тым лепш, бо рознае можа здарыцца. Век мой глыбокі, і жыццё маё было і ёсць цяжкім ва ўсіх разуменнях.

Друкаваць мяне болей не трэба. Я чула, што мяне нельга нават успамінаць. Слава і нізкі паклон «Жовтню» за яго адзіныя тут і шчодрыя віншаванні. Гэта было хораша!

Я ўсё думаю аб Вашым здароўі, толькі б Вам было добра!

Муж едзе ў Мінск і кіне гэтага ліста. Я чакала падобнай нагоды, таму і запазнілася з адказам. Прашу прабачэння.

Шчыра вітаю Вашую жонку. Я рада, што вы не адзін.

Я заўсёды цэлым сэрцам любіла ўсё, што было Украінай, і вось атрымала такую вялікую падзяку. І я шчаслівая.

Усяго Вам добрага, светлага, Дружа — творчасці невычарпальнай і сілаў, сілаў.

З вялікай павагай і ўдзячнасцю да вас

Ларыса Геніюш.

1980–81 г. Зэльва.

Дарагі Сябра Іван!

Шчыра вітаю Вас з усімі Сьвятамі, з наступаючым 1981 г.

Здароўя Вам выдатнага, творчых посьпехаў! Буду рада бачыць Вас у сваёй хаце сялянскай з Ф. Янкоўскім [Вядомы беларускі вучоны-лінгвіст, доктар навук, прафесар (1918–1989). Рэд.], тым больш калі толькі яму хопіць адвагі заехаць да мяне… Я мала ведамы чалавек, з якога мала карысьці на сёння. Жыву, як і раней. Нашыя простыя людзі апякуюцца мною часамі ўзварушліва.

Моцна хварэю сэрцам, але да сустрэчы з Вамі я пастанавіла дажыць. Цешуся, што ў Вас усё добра і што выходзіць кніжка.

Заўсёды са шчырай павагай да Вас

Ларыса Геніюш.

ВЯНОК

# З АСАБЛІВАГА РОДУ

Генрых ДАЛІДОВІЧ

**Бадай, для многіх і цяпер яна, зямная жанчына з незвычайнага роду, паэтка, па-ранейшаму застаецца загадкай.**

Чаму, выхаваная ў расейскім асяроддзі, пачала не толькі пісаць па-беларуску, але да самай глыбіні душы праніклася нацыянальнай ідэяй і ўсё свядомае жыццё асвечвалася беларускімі нацыянальнымі сімваламі? Чаму яна дзейнічала менавіта так, як спаўняла свае жыццёвыя і творчыя ўчынкі? Чаму, урэшце, адны яе і цяпер зусім не ведаюць, а іншыя шчыра ўшаноўваюць альбо папікаюць ва ўсіх смяротных грахах? Вось і разбярыся: калі Святое Пісанне заклікае маральна не судзіць, бо і сам маральна судзімы будзеш…

Пэўныя адказы на гэтыя і іншыя пытанні ёсць. Да беларускасці яе далучыла ў многім абеларушаная на пачатак XIX стагоддзя Вільня, паводзіны ж, прыезджай у гэты горад, бурна вызначылі ўмовы існавання пры даваенных таталітарных польскай і савецкай уладах, горкае спазнанне сістэмы Гулагу і нямецка-фашысцкай акупацыі. Выстаяць у гэтых абставінах ёй, шляхетнай, з высокімі маральнымі прынцыпамі жанчыне, было вельмі няпроста.

Невядома, хто з яе крытыкаў у тых стасунках мог бы паводзіцца іначай, нават паўтарыў бы такую ж вытрымку, здолеў бы пісаць вершы без ніякіх надрыву і злосці. Яна ж была верная запавету, выказанаму яшчэ ў адным з першых вершаў у 1925 годзе: «Ўсё, што ў сэрцы жыве і пяе, — Вершы мае…». Яна — «паэта чыстай красы». Яе хвалявалі не рэвалюцыйныя ўзрушэнні і буры, не нейкія «генеральныя лініі», а гістарычная памяць народа, харaство прыроды, фарбы роднай зямлі, жаночыя і мацярынскія пачуцці. Гэта — своеасаблівы паэт. Ды, можа, не накірунку свайго славутага продка Лермантава, а такіх, якімі ў рускай паэзіі былі Цютчаў і Фет. Яна ўглыбіла ў сябе рускасць розумам, але душа яе нечакана заспявала беларускасцю…

Загадкавая Яна — гэта Наталля Арсеннева. Яна пабачыла свет 20 верасня 1903 года ў горадзе Баку. Бацька яе паходзіў са славутага роду Арсенневых (які па жаночай лініі і вызначыўся славутым прозвішчам рускага пісьменніка Міхаіла Лермантава). Зразумела, яна змалку была далучаная да выдатнай творчасці роднаснага генія, але і з юных гадоў адчула магію беларускай мовы і паэзіі. Гэтаму паспрыяла тое, што яе сям'я пераехала ў Вільню. Там гімназісткай Н.Арсеннева пазнаёмілася з многімі беларускімі творцамі. Таму не выпадкова пазней выбрала шлях служэння беларускай асвеце і культуры, дзеля чаго ў 1921 годзе скончыла курсы настаўнікаў беларускіх школ (на гэтым этапе мо і вызначальны выбар ёй паспрыялі зрабіць выкладчык, пісьменнік, вельмі абаяльны чалавек Максім Гарэцкі і навуковец-публіцыст Бранiслаў Тарашкевіч). Вучылася паэтка і ў Віленскім універсітэце.

Праўда, яна не закончыла вучобу, выйшла замуж за ўраджэнца Валожыншчыны, удзельніка Першай сусветнай вайны, які намагаўся спалучыць маласпалучальнае: службу афіцэрам у польскай арміі і дзейнасць беларускага палітыка. Каханне падарыла ім першынца — сына Яраслава (загіне ў Мінску ў 1943-м разам з іншымі маладымі беларускімі гурткоўцамі ў Купалаўскім тэатры ад узарванай партызанамі міны). Знойдзецца час закончыць і ў 1927 годзе выдаць першую кнігу паэзіі «Пад сінім небам». Менавіта — не зборнік, а кнігу: яна і цяпер падаецца выбраным з раней напісанага. У выданні сабраныя творы розных жанраў за паўдзесятка гадоў (вершы, вершаваныя апавяданні, паэма). Да ўсяго творы шматтэмныя і зусім не на пачаткоўскім узроўні. І не выпадкова гэтую кнігу дэбютанткі высока ацанілі многія вядомыя знаўцы паэзіі ...

Ды жыццё для такой незвычайна-загадкавай, рускай па выхаванні, а беларускай па духу паэтэсы не будзе бясхмарнае. І не толькі тым, што сям' і вайскоўца нялёгка ад побытавых турбот. З'явяцца іншыя, больш цяжкія выпрабаванні. Хоць муж у 1939-м удзельнічаў у вайне з фашызмам, але ўсё роўна быў інтэрнаваны савецкімі войскамі . А яна, хоць лаяльна аднеслася да савецкай улады, пачала працаваць у савецкай газеце «Віленская праўда» і нават дапамагала напісаць «Пісьмо таварышу Сталіну ад працоўных Заходняй Беларусі», з двума сынамі была высланая ў Казахстан. На той час без ніякай віны вінаватая...

Тыя, хто высока адзначалі яе чалавечую інтэлігентнасць, глыбокі патрыятызм, арыгінальную творчасць (Янка Купала, Максім Танк і інш.), здолелі ў 1941-м вярнуць выгнанніцу на Радзіму. Акрыялая паэтэса пачала рыхтаваць новы зборнік паэзіі, ды выйсці яму перашкодзіла вайна. У час яе муж прыймаў удзел у фармаванні беларускіх вайсковых сіл пад нямецкім камандаваннем, а яна ў асноўным па-ранейшаму займалася хатнімі клопатамі, удзельнічала ў Мінску ў культурна-асветнай рабоце і пісала вершы. У кнізе «Сягоньня» (1944) асуджала вайну як наканаванасць, якой яна бяссільная супрацьстаяць». У 1944-м выехала ў Нямеччыну, у 1950-м — у ЗША, дзе жыла да апошніх дзён. У 1979 годзе выдала паэтычны зборнік «Між берагамі».

Як і ў іншых паэтаў-эмігрантаў, у яе творчасці пасляваеннага часу таксама былі моцныя матывы ўспамінаў, настальгія па Бацькаўшчыне з усімі яе праявамі, адданасць беларускай нацыянальнай справе. Наталля Арсеннева — аўтар эміграцкага гімна (верш «Магутны Божа»). У 1992 годзе ў Мінску ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» факсімільна быў перавыдадзены яе зборнік «Пад сінім небам», дзе дадатковa былі змешчаныя яе кароткая біяграфія , прадмова (Я. Лецка) і датаваныя 1928 годам выказванні Максіма Гарэцкага. Прызнаны майстра ўжо тады залічыў аўтара першай кнігі ў лік «выдатных іменняў», вершы якой «не вызначаюцца нейкай асаблівай бліскучасцю, але яны захопліваюць шчырасцю пачуцця, далікатнага тону і нейкаю асаблівою пяшчотнасцю вобразаў і слоў…»

Здаецца, паэтка годна апраўдала і надзеі Максіма Гарэцкага, і свой дэвіз, выказаны яшчэ ў 1922 годзе ў вершы «Мэта жыцця»:

*... Мэта жыцця, кажуць,*
*гэта — хаваці*
*Сэрца ад смуткаў і сьлёзаў*
*ня знаці.*
*Думкі аб праўдзе...*
*Гэт, глупства усё,*
*Мэта жыцця —*
*захаваці жыцьцё!*

РЭЦЭНЗІЯ

# ЧЫТАННЕ ЯК ПРАЦА

Анатоль ІВАШЧАНКА

**Віктар Казько. Дзікае паляванне ліхалецця: эсэ, публіцыстыка. — Мн., Кнігазбор, 2009 (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 2).**



Чатыры гады таму — нібыта й нядаўна, але, ацэньваючы адрознасць літаратурнай сітуацыі тады й цяпер (найперш — не адабраны яшчэ Дом літаратара як эпіцэнтр культурнага жыцця, дзе штомесяц ладзілася па некалькі буйных вечарынаў і з дзесятак драбнейшых; ды й кніжныя навінкі, здаецца, больш жвава абмяркоўваліся і на старонках друку, і ў, так бы мовіць, «кулуарах»), то ўжо і даўнавата, — дык вось, чатыры гады таму ў «Дзеяслове» выйшла даволі вялікая памерам аповесць Віктара Казько. Памятаю тагачасную размову пра яе з рэдактарам адной паважанай мною — і тады, і цяпер — газеты (што праўда, тады на яе старонках літаратура, ізноўткі, займала куды болей месца). Рэдактар прызнаваўся, што сам аповесці не чытаў праз брак часу, але ягоныя супрацоўнікі, адказныя за крытыку, пагарталі й не знайшлі там нічога выбітнага. У той жа час мне, працуючы ў Саюзе пісьменнікаў, даводзілася чуць звышстаноўчыя водгукі пра гэты твор ад літаратараў, якія проста так словамі наогул не кідаюцца, а ў ацэнках твораў сучаснікаў і пагатоў. Спакусліва проста было б патлумачыць адрознасць успрымання твораў В. Казько ўзроставым крытэрам: маўляў, «старая гвардыя» адна саміх сябе й чытае, а моладзь ашчаджае свой звышкаштоўны час на штосьці больш адназначнаелабавое (накшталт скандальнага «Дзённіка крыніцы»). Але, усё ж, наважуся на рэфлексію больш уважлівую (дадаўшы, што так і не сустрэў аніводнае рэцэнзіі як на гэтую аповесць, так і на іншыя творы В. Казько, што з'яўляліся цягам апошніх гадоў).

Перадусім прызнаюся ў тым, у чым рэцэнзенту прызнавацца нібы й не да твару: новую кнігу В. Казько я прачытаў не цалкам. Некалькі эсэяў былі знаёмыя па «дзеяслоўскіх» публікацыях, некалькі прачытаў цяпер, а тоесёе і перагарнуў, пакінуўшы на пасля. Проза Казько — не тое, што прачытваецца «на раз», «запоем», лёгка пераварваецца й хутка забываецца. Яна, выпакутаваная і прапушчаная праз сябе, як праз мясарубку, для тых, хто яшчэ не развучыўся чытаць. То бок — чытаць з поўным паглыбленнем. Для каго чытанне — не забаўка, а праца (праца, у першую чаргу, над сабой)...

Барыс Акунін, калі ў яго запыталі, ці лічыць ён сябе буйным пісьменнікам, без ценю какецтва адказаў: не лічу, я — белетрыст. І патлумачыў: пісьменнік выкладае на паперу свае пачуцці, боль і радасць, белетрыст жа — толькі атрамант. У гэтым месцы дарэчы будзе звярнуцца да эсэ Валянціна Акудовіча, якое друкавалася ў «Arche» №6 за 2007 пад назвай «Вялесаўская лекцыя».

У эсэ прасочваюцца прычыны і вынікі паўстання «масавага чалавека», які «досыць хутка перафармаваў усю структуру цывілізацыі адносна самога сябе як дамінантнай катэгорыі» і, адпаведна, — спарадзіў сваё мастацтва (што мянуецца сёння масавым ці поп- альбо мас-культурай). Яго канцэптуальнае несупадзенне з мастацтвам высокім, паводле В. Акудовіча, у адрознасці эстэтычных вымярэнняў: так, маскульт палягае ў гарызанталі (ці паверхні, што з'яўляецца «не адметай яе нягегласці, але прынцыповай пазіцыяй» і характарызуецца «татальнай баналізацыяй» ва ўсіх сферах жыццядзейнасці); мастацтва ж высокае (да якога аўтар ужывае мінулы час) «укладалася ў парадыгму вертыкалі». «Высокая літаратура... прагнула не чытача, а Ісціны. Але і чытач той пары шукаў у літаратуры не забаву, а Ісціну. З гэтага супольнага... памкнення да «зорнага неба» кожны творца аж прыпадымаўся на дыбачкі, каб выглядаць нават вышэйшым за самога сябе — тады яшчэ па азначэнні высокага. Гэтак... было здавён, — канстатуе В.Акудовіч, — але пад канец XX ст. здарылася нешта цалкам неверагоднае, чаго раней ніхто і ўявіць сабе не мог. Пісьменнік самахоць пачаў адмаўляцца ад вышыні».

В. Акудовіч апісвае агульнасусветную тэндэнцыю, не акцэнтуючыся на беларускай сітуацыі. Так, у прыклад канстатаванай метамарфозы філосаф згадвае П. Каэльа, Б. Акуніна, У. Эка, якія «выбавілі сябе ад вышыні, каб атрымаць магчымасць прыкаленіцца ўпоравень збаналізаванаму чалавеку». І хаця гаворка ў нас не зусім пра баналізацыю свету ўключна з літаратурай, але заўважым, што канстатаваныя працэсы ўсё ж пачаліся значна раней за канец XX ст. І працэсы гэтыя бачацца наколькі натуральнымі, нагэтулькі ж і незваротнымі. Вось, В. Акудовіч разводзіць па полюсах супрацьлеглых эстэтычных вымярэнняў імёны Уолта Дыснея і Дастаеўскага як геніяў, адпаведна, масавага і высокага мастацтваў. Але давайце згадаем: ці такім ужо элітарным быў Дастаеўскі для яго сучаснікаў? Ці не да дэтэктыву — тыпалагічна «нізкага» жанру — звярнуўся ён у сваім самым праграмным творы дзеля сцвярджэння вядомых кожнаму школьніку маральных імператываў? Ды й, зрэшты, ці стаў бы Дастаеўскі тым, кім ён ёсць, каб пісаў менш чытэльна? Дыялектыка, клятае пытанне мэты і сродкаў...

«Вялесаўская лекцыя» В.Акудовіча згадвалася пад час чытання «Дзікага палявання ліхалецця» не аднойчы, як і раней пры чытанні твораў В. Казько — перадусім яго эсэістыкі, — карцела вызначыцца з феноменам яго творчасці, з'ява якое і захапляе, і бянтэжыць сваёй невытлумачальнасцю... Відочна, што і самому пісьменніку (як, магчыма, і некаторым іншым прадстаўнікам гэтак званага «старэйшага пакалення»), не проста вызначыцца з гэтым пытаннем: як і для каго пісаць ва ўмовах «новай літаратурнай сітуацыі»?..

В. Казько мае на гэты конт непахісную пазіцыю. Вось яго выказванне з «Уступнага слова да трохтомніка, які па незалежных ад аўтара прычынах не ўбачыў свету: сканаў у абдымках росквіту рынкавай дэмакратыі, незалежнасці і свабоды» пад назовам «Я вам ніколі не схлусіў»: «Пісьменнік — чытач, заўсёдная, пракавечная і паўсюдная гульня. Хто з іх пан, хто служка? Каб я гэта ведаў, я б тады пагуляў. Не ведаю, дарагі мой чытач, і таму я з табою не імкнуся гуляць. А мо, наадварот, таму і гуляю. Толькі ведай адно, чытач: у той гульні я ніколі табе не хлусіў, не хлушу і хлусіць не буду, позна ўжо. Хаця, па шчырасці, ой як бы хацелася табе схлусіць, зачараваць цябе магутнай, агіднай і прыгожаю хлуснёй. Але ж... Майму веку і маёй натуры наканавана нешта зусім іншае».

«Жыць без хлусні», пісаць без хлусні — вось жыццёвы і творчы дэвіз гэтага, як ні сумна канстатаваць, адыходзячага пісьменніцкага пакалення. Наогул, да эсэ В. Казько часта дарэчным бачыцца такое жанравае вызначэнне, як мемуарыстыка: нарацыя пісьменніка, як правіла, ідзе ад апісання нейкае канкрэтнае падзеі — першага курапацкага мітынга, сумеснай паездкі з Васілём Быкавам і Алесем Адамовічам альбо цела чалавека, раструшчанага чыгункай, што некалькі дзён ляжыць на рэйках пад безуважнымі позіркамі заклапочаных ураджаем дачнікаў. Дарэчы, як гаворыць В. Казько ў цытаванай вышэй паслямове, і проза пісьменніка вызначаецца суцэльным аўтабіяграфізмам.

Гледзячы на эсэістыку В. Казько праз прыцэл акудовічаўскага «ружжа», відавочна, што яна выяўляе пакліканне пісьменніка да ўсё тых жа кантаўскіх зорнага неба і маральнага закону ўнутры. Апеляванне да сакральнага і трансцэндэнтнага, творчая дэміюргавасць поруч з апакаліптычна-фаталістычным пасылам — вось чыннікі творчай манеры В. Казько. Праз усе тэксты кнігі праходзіць скразная лінія — выяўленне прычынаў і наступстваў працэсу «азвярэння» чалавека ў «час пярэваратня», «ліхалецця», што суадносіцца з савецкай эпохай і працягнутага чарнобыльскай катастрофай ды дзеяннямі існага рэжыму па руйнаванні мовы, культурнай спадчыны і г.д. Пры гэтым, вельмі яскрава адказваючы на сакраментальнае «хто вінаваты», аўтар не кажа, што рабіць.

Наважуся на дапушчэнне, што творчасць В. Казько — прыклад дзіўнага міксу, сутыкнення высокага-элітарнага з калі не маскультам, то з пісаннем, што ад пачатку апелюе да люду паспалітага. Гэта добра відаць і на тэматычным узроўні (глабальныя пытанні светабудовы, што ўздымаюцца, так ці йнакш завязаныя на лёсе «простага чалавека», які ёсць пунктам адліку, цэнтрам гэтае светабудовы), і на лексічным (часам нават з адмыслова стылёва «заніжанай» лексікай).

Часам «мэсыдж» пісьменніка падаецца крыху цьмяным, а пазіцыя непаслядоўнай. Так, пры ўсёй лютай варожасці аўтара да рэжыму, ад якога цягне «смуродам... апрычніны, тхлом Лубянкі і Валадаркі, духам, што так і не выветрыўся да сённяшняга дня з 37-га года», распад СССР мянуецца «белавежскай змовай», апошнія гады імперыі — пачаткам «летапісу вар'яцтва», а падыход да панятку «дэмакратыя» падобны да рыторыкі антыамерыканскіх жахалак кшталту «Дух часу» ці «Амерыканскае шоў». Але ў гэтай шурпатасці, нежаданні падладжвацца пад растыражаваныя схемы, устаноўкі ці замовы не загана, а наадварот — прыцягальнасць гэтага празаіка, якога, згодна з яго ж тэзаўрусам, так і карціць назваць адзінокім ваўком нашае літаратуры — за спартанскую нязломнасць духу і ўражвальную прынцыповасць поруч з гранічнай шчырасцю выкладу.

Угледаючыся ў буйны фотаздымак Віктара Апанасавіча з тытулу яго новай кнігі, на якім пісьменнік нібыта пасміхаецца, лаўлю сябе на супярэчлівай эмоцыі: а ці радасць там, за прымружанымі вачыма? Ці ўсё ж боль? А мо ашчэр? Глыбокія зморшчыны-барозны, як сляды, пакінутыя перажытым ліхалеццем. З такім выразам ідуць пад танкі...

Сталася амаль нормай, што рэцэнзія — гэта альбо «піяр», альбо, залежна ад акалічнасцей, «чорны піяр» (так і карціць працягнуць — у часе чумы). Магчыма, гэта не ёсць прыкметай часу сённяшняга, і сутнасць пытання вечная... Але мне найменш хацелася б, каб гэтая рэцэнзія ўспрымалася як «прапіярванне», бо само гэтае слова — з той, маскультаўскай, тэрміналогіі. Пустазвонны «піяр» творчасці Віктара Казько быў бы найперш непавагай да таго, што ён робіць. Але, хочацца верыць, што кніга ўсё ж знойдзе свайго чытача — чалавека, які не баіцца цвярозa «зазірнуць у вочы свайму «Я».

Завершыць жа хочацца цытатай з эсэ «Паміж цюленем і акрабатам, альбо Энергія надзеі»: «Мы нарадзіліся ў клетцы. Нас выпусцілі на волю. І сёння мы ўсе, як дзікія жывёлы, узгадаваныя ў штучнай абстаноўцы і выпушчаныя ў абстаноўку натуральную, не маем паняцця пра жыццё на волі. Яна апальвае нас. Многія з нас асуджаны, як ні горка, але трэба мець мужнасць прызнаць гэта. І ўсё ж на волі ёсць заўсёды надзея. Хоць Максім Гарэцкі і гаворыць, што надзея — маці дурных. Але гэта — адзінае, што застаецца ў нас сёння. І гэта не так ужо мала. Надзея — пастаянны стан душы сёння, яна сапраўды памірае апошняй».

**Ад «Ь»:**

Паляванне ліхалецця, на жаль, застаецца не толькі высокай аўтарскай метафарай. Новую кнігу эсэ і публіцыстыкі Віктара Казько, выдадзеную ў Бібліятэцы СБП «Кнігарня пісьменніка», па распараджэнні чыноўнікаў (ці, правільней, з дапамогай ананімных даносчыкаў) забаранілі распаўсюджваць праз дзяржаўныя кнігарні. Хоць «надзея і маці дурных», хоць яна і памірае апошняй, але ці не па-дурному такое ўспрымаецца: шчырая і балючая кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі з серыі «Кнігарня пісьменніка» схаваная «пад прылавак» у дзяржаўнай мінскай краме «Кнігарня пісьменніка»?!

Тым не менш, аб набыцці гэтай ды іншых кніг серыі «Кнігарня пісьменніка» можна даведацца па тэл.: (Velcom) 637-66-43; (МТС) 274-85-97.

НАГОДА

# Антаніна ХАТЭНКА: «ВІЗБІ — ЛАБАРАТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ»

**Як ужо вядома, Саюз беларускіх пісьменнікаў быў прыняты ў агульнаеўрапейскую пісьменніцкую супольнасць — стаў паўнапраўным членам Еўрапейскай Пісьменніцкай Рады. Наладжаныя плённыя стасункі з многімі пісьменніцкімі арганізацыямі, сярод якіх — Саюз шведскіх пісьменнікаў. З дапамогай апошняга члены старэйшай творчай арганізацыі Беларусі маюць магчымасць адпачываць і працаваць у Балтыйскім цэнтры пісьменнікаў і перакладчыкаў у Візбі на шведскім востраве Готланд. Летам яго наведала паэтэса Антаніна Хатэнка, якая ветла падзялілася з «Літаратурнай Беларуссю» сваімі думкамі і ўражаннямі…**

«Балтыйскі цэнтр пісьменнікаў і перакладчыкаў у Візбі — не толькі прыгожы, утульны, ветлы і камфортны прыстанак для творцы, які спрадвек шукае адзіноты ды ўсясветнай гармоніі, але перадусім шчаслівая магчымасць пазнаць, уласнаруч памацаць іншае, адрознае ад звыклага, жыццё. Прынамсі, менавіта гэты шанец пабытавання ў іншай прасторы, у іншых духовых каардынатах падаецца істотным нам — беларусам, псіхалагічна замкнёным на балючых праблемах нацыянальных перспектыў.

Апынуўшыся ў краіне з прыярытэтамі асабовай волі й чалавечай годнасці, пачынаеш міжволі разумець карані й глыбінныя прычыны моўнай і культурнай трагедыі на Бацькаўшчыне. Пакуль знаходзішся на Готландзе, у асяродку пісьменнікаў і перакладчыкаў з розных краёў свету, спасцігаеш не адно простую ісціну цэласці, злучнасці зямнога быцця, але й спакваля выспельваеш сведамленне сябе сапраўднай, не дэкларатыўнай, часцінай Еўропы, жывой яе клеткай. І гэтае пачуццё, зусім адрознае ад таго, што зведваеш дома, зарганізоўвае адметны лад мыслення, спрыяе фармаванню новай маральна-каштоўнаснай сістэмы. Бо насамрэч тут, у Беларусі, мы ўсе, хай сабе і ў рознай ступені, яшчэ застаемся інфекцыяванымі на залішнюю ідэалагізацыю, схематызацыю жыцця, на структураванне ўсіх яго праяў і форм ды пазначэнне цэдлікамі.

Гасцяванне ў пісьменніцкім Цэнтры зарганізавана так мудра, што, маючы свабоду выбару, набываеш і асаблівую, удзячлівую, адказнасць перад светам, які прымае цябе, аберагае Богам дадзены дар і стварае ўмовы для яго рэалізацыі. Пры гэтым неўпрыкмет яшчэ й навучае гэтак жа пашанотна абыходзіцца з самім сабой і ўсім жывым на Зямлі…

Цэнтар у Візбі — выдатная лабараторыя літаратуры, майстроўня мыслення, творчага паразумення разнамоўных і рознаменталітэтных людзей. Клопатам Алены Пастэрнак і яе памагатых у гэтым ветлым доме на пэўны час аказваешся ў сутворчай планетарнай сям'і. І гэта як найлепей паслугуе раскрыццю ўнутраных інтэлектуальных і духовых рэсурсаў, што зноў-такі надзвычай важна для нас — прадстаўнікоў Саюзу пісьменнікаў, адпрэчанага дзяржавай.

У Швецыі я (мабыць, толькі на некаторы час) пазбавілася нарэшце ад пачуцця супраціву, якое прыгнятае й спараджае непазбыўны, нібыта, комплекс барацьбіта ўдома. А гэта азначае, што наладжванне й фундаванне такіх паездак адыгрывае агромністую ролю ў працы нашай нацыянальнай інтэлігенцыі на аднаўленне прынцыпаў волі й самадастатковасці ў беларускім грамадстве. Папраўдзе ж, раўнаважнасць, у якую трапляеш у Візбі, паўстае ці не самым галоўным урокам дэмакратыі. А таму, вярнуўшыся на радзіму, кожны з нас, мяркую, найперш памкнецца нейкім чынам перадаць суайчыннікам гэты станоўчы досвед уладавання жыцця на аснове ўзаемапавагі, даверу й захавання этнічных адметнасцяў. І, такім чынам, укладзеная ў падобныя паездкі намаганні й сродкі аплачваюцца найвышэйшым духовым коштам: адна з цэнтральнаеўрапейскіх краін, Беларусь, паступова мае наблізіцца да вынаходжання свайго месца й сваёй ролі сярод народаў-суседзяў. І якраз пісьменнікі пракладаюць гэтую дарогу, скарыстоўваючы прыязнасць і клопат каралеўскай Швецыі, праз якую мы раўнапраўна далучаемся да еўрапейскіх літаратурных звязаў. За тое й выказваю я асабіста ўсім руплўцам на гэтым грунце шчырую падзяку…».

## ПАЛІЦА










**Барыс Пятровіч. Пііліпікі. Мініяцюры. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 88 стар.**

**Эдуард Акулін. Вітражы. Вершы. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 110 стар.**

**Леанід Дранько-Майсюк. Анёлак і я. Апавяданне. — Мінск, «Галіяфы», 2009. — 96 стар.**

Выдавецтва «Галіяфы» папоўніла паліцы аматараў прыгожага пісьменства трыма новымі «кніжкамі-малюткамі»:

«сто гадоў таму напісанымі» карацелькамі Барыса Пятровіча — першымі спробамі прышчапіць на беларускую мову пачынанні Хармса і — шырэй — постмадэрнісцкія кветкі ў сучасную прозу;

кароткімі вершамі Эдуарда Акуліна — каляровымі шкельцамі ў вітраж нашай паэзіі;

адным з лепшых сучасных апавяданняў Леаніда Дранько-Майсюка пра гламурную N, хлопчыка, які чакае маці, пра мужчыну, якога пакінула каханне, і пра Беларусь — як пра сустрэчу новай зямлі з раскіданым гняздом…

**Міхась Скобла. Акно для матылькоў: паэзія, проза. — Мінск: «Про Хрысто», 2009. — 312 стар.**

Арфейны томік выбранага з твораў Міхася Скоблы склалі найбольш метафарычныя, вобразныя, узнёслыя вершы зборнікаў «Вечны Зніч», «Вочы Савы», «Нашэсце Поўні», вершы «новага тысячагоддзя», а таксама вянок паэтычных перакладаў — «галасоў з-за небакраю» ды ўзорныя эсэ — ураджайныя на шматасацыятыўнасць, арыгінальнасць і «паэтычныя парадоксы». Такія, як «Быць нататнікам Бога» (пра Рыгора Барадуліна), «Акно для матылькоў» (пра Янку Брыля), а таксама эсэйныя гімнаспевы пра Ніну Мацяш, Анатоля Вялюгіна, Рыгора Крушыну, Анатоля Сыса, Іну Снарскую, Юрку Голуба…

**Сяргей Дубавец. ЯК? Азбука паводзінаў. — Радыё Свабода, 2009. — 252 стар.**

Бадай, гэта найбольш «сістэмная» і гарманічная кніга аўтара, якая зніталася з журналістыкі (газета і радыё), творчасці (проза, эсэ) ды навуковасці (філасофія, псіхалогія, грамадазнаўства і пад.). Нацыянальная «Энцыклапедыя паводзінаў» прапануе адказы на тое, «як бараніцца і галасаваць, дараваць і любіць, сябраваць і хітраваць».

Атрымаўся двухбаковы падарунак на 50-гадовы юбілей аўтара — кніга, якая, паводле прызнання Аляксандра Лукашука, «замест дубовых запытаў «хто вінаваты?» і «што рабіць?» задае магічнае і музычнае, такое неістотнае і біблійнае, галоўнае для свабоды, вайны і кахання пытанне — «як?».

ЗНАХОДКА

# НЕВЯДОМЫ РАМАН АГАТЫ КРЫСЦІ

**Брытанскі таблоід The Daily Mail напрыканцы жніўня пачаў публікаваць раней невядомы твор каралевы дэтэктыва Агаты Крысці, які амаль 30 гадоў праляжаў на гарышчы яе загараднага дома. Галоўнымі героямі рамана з'яўляюцца легендарны дэтэктыў Эркюль Пуаро і Адольф Гітлер.**

Рукапіс знайшоў спецыяліст па творчасці пісьменніцы Джон Каррэн, якога ў 2005 годзе запрасілі разабраць паперы ў дэвонскай рэзідэнцыі Агаты Крысці. Пасля некалькіх гадоў карпатлівай працы ён аднавіў тэкст і ўстанавіў гісторыю стварэння рамана «Утаймаванне Цэрбера».

Гэты раман не мае ніякага дачынення да аднайменнага апавядання, апублікаванага ў 1947 годзе ў зборніку «Подзвігі Геракла». Арыгінальную версію «Утаймавання Цэрбера» Агата Крысці пачала пісаць яшчэ ў 30-х гадах мінулага стагоддзя. Але ў 1939 годзе выдаўцы адмовіліся ад публікацыі рамана.

На думку Каррэна, паступіць так выдаўцоў прымусіў палітычны складнік рамана. Рэч у тым, што арыгінальная версія «Утаймавання Цэрбера» мае ярка выяўленую палітычную скіраванасць, што ўвогуле для Агаты Крысці было вялікай рэдкасцю.

У прыватнасці, адным з асноўных персанажаў рамана, напісанага перад самым пачаткам Другой сусветнай вайны, стаў нейкі дыктатар, які відавочна нагадвае Адольфа Гітлера. Завуць гэтага героя Аўгуст Гертцляйн.

Як адзначае Daily Mail, у рамане Агата Крысці выяўляе наіўную надзею на тое, што гэты дыктатар можа быць звернуты ў хрысціянства і пачне прапаведаваць мір і каханне. У 30-я гады, адзначае выданне, насамрэч былі людзі, якія верылі ў гэта (напрыклад, амерыканскі рэлігійны прапаведнік Фрэнк Бухман).

Іншай незвычайнай дэталлю рамана, адзначае брытанская газета, сталі душэўныя перажыванні Эркюля Пуаро, выкліканыя жаночай прыгажосцю. У пачатку аповяду пісьменніца ўкладвае ў яго вусны фразу аб тым, што для гармоніі ў дадзены момант бракуе жанчыны…

Знакамітыя дэтэктыўныя раманы Агаты Крысці (1890-1976) перакладзеныя на 45 моў свету, а ў агульнай колькасці толькі на ангельскай мове прададзена больш мільярда асобнікаў. Па гэтым паказчыку яе пераўзыходзяць толькі Біблія і творы Шэкспіра.

Гэта не першы выпадак, калі невядомыя творы знакамітых пісьменнікаў публікуюць неспецыялізаваныя выданні. Так, увосень гэтага года ў часопісе Playboy упершыню будзе апублікаваны ўрывак з няскончанага рамана Уладзіміра Набокава The Original of Laura, які пісьменнік перад смерцю загадаў знішчыць. Нумар з фрагментам рамана паступіць у продаж 10 лістапада гэтага года — за тыдзень да пачатку афіцыйных продажаў кнігі.

У Расіі апошні раман У.Набокава выйдзе пасля амерыканскага і ангельскага выданняў.

Паводле Newsru

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 2 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Зона Х.
**07.30** Дзелавое жыццё.
**07.45** Зона Х.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). 4-я серыя.
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві» (Расія-Украіна).
**10.50** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**11.50** Дзелавое жыццё.
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія). 4-я серыя.
**13.05** Дэтэктыўны серыял «Веронiка Марс» (ЗША).
**13.45** Відэафільм АТН «Верхнядзвінская адысея» цыклу «Зямля беларуская».
**14.05** Відэафільм АТН «Карл Маркс Штрасэ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Шпілька».
**15.55** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-5» (Расія). Заключная серыя.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Той, што памнажае смутак» (Расія). 5-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**23.30** Баявік «Віртуоз» (Вялікабрытанія-ЗША-Нямеччына - Іспанія).
**01.15** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Шматсерыйны фільм «Я вярнуся».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Дэтэктывы».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Бабін бунт».
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Каханне-морква 2».
**23.05** АНТ прадстаўляе: «Наша Белараша».
**23.40** Фільм «Проста сябры». Францыя, 2005.
**01.25** Нашы навіны.
**01.40-01.50** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**09.40** «Гарачы лёд».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Пуцявікі». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Атрад». Серыял. Заключная серыі.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Пуцявікі». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічная падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Адзін выдатны дзень». Францыя, 2006 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.45** Фільм «Віхраслуп - гнеў багоў». Германія, 2006 г.
**02.40** «Уцёкі». Серыял.

### ЛАД

**06.55** ЛАДная раніца.
**07.55** Іншыя. «Бамжыныя людзі».
**08.25** Камедыйны серыял «Юркі» (Расія).
**08.55** У гэты дзень.
**09.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.05** Час футболу.
**11.35** Жансавет.
**12.05** Біяграфічная драма «Міхайла Ламаносаў» (СССР).
**13.50** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**15.20** Прэм'ера. «Av initio. Ад пачатку». Дакументальны фільм аб Прэзідэнцкім аркестры Рэспублікі Беларусь («Белвідэацэнтр»).
**15.50** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія). Заключны серыі.
**16.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** «Пра мастацтва».
**19.35** Беларуская часіна.
**20.40** Калыханка.
**20.55** Бітва экстрасэнсаў.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Агляд дня.
**22.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск)-СКА (Санкт-Пецярбург).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Участковая». Расія, 2009 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Пакой смеху».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2009». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.40** Фільм «Папяровы салдат». Расія, 2008 г.
**01.00** Фільм «Падарунак самотнай жанчыне».
**02.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Кухары і кухцікі».
**09.05** «Масква-Ялта-транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.15** «Галоўны герой прадстаўляе».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**20.40** Баявік «Бой з ценем».
**21.45** Драма «Лаліта».
**00.15** Крымінальная камедыя «Небяспечнае трыо».

### EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Прэв'ю.
**10.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**12.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо. 1/2 фіналу.
**16.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**17.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**18.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Германія - Камерун/Паўднёвая Карэя - ЗША. Александрыя (Егіпет).
**21.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**22.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Узбекістан - Англія/Уругвай - Гана. Александрыя (Егіпет).
**00.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**00.45** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 1.
**01.15** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**01.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**01.40** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**01.55** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 1.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.20** «Дэтэрмінатар», серыял.
**20.05** Блізкая гісторыя: іншы погляд: «Загуж – апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Хрысціянства» (спазнаваўчая праграма).
**21.25** «Зямля запаветная», маст. фільм, 1974 г., Польшча.
**00.05** Аб'ектыў.

## 3 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

### 1

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Дзікае золата» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША). Заключныя серыі.
**10.30** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.00** Навіны.
**12.15** Кінааповесць «Сабачае сэрца» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.40** «Алімпійскі часопіс».
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.15** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.40** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.40** Відэафільм АТН «Спрадвечная талака» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.00** Навіны.
**19.20** Канцэрт Барыса Маісеева.
**21.00** Панарама.
**21.40** Урачыстае адкрыццё XI Міжнароднага музычнага фэсту «Залаты шлягер-2009 у Магілёве».
**00.25** «Уласнай персонай».
**00.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Японіі. Кваліфікацыя.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.05** Прэм'ера. «Сустракайце - Чэлентано!».
**12.05** Ералаш.
**12.25** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.55** АНТ прадстаўляе: «Кінаметры вайны».
**13.30** «Чорны замак Альшанскі». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».
**17.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** «Ледніковы перыяд». Новы сезон.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Новы сезон. Працяг.
**22.50** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.30** «Што? Дзе? Калі?».
**00.50-02.20** Фільм «Неваляшка».

### СТВ

**06.30** «Анфас».
**06.45** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**07.30** Фільм «Як я быў вундэркіндам». СССР, 1983 г.
**09.40** «Я - вандроўца».
**10.05** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.25** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** Фільм «Біндзюжнік і кароль». СССР, 1989 г. 1-я серыя.
**19.00** «Рэпарцёр СТБ». Лепшае.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.35** Фільм «Утоеная пагроза». ЗША, 2001 г.
**23.20** Фільм «Недарэчны чалавек». Нарвегія-Ісландыя, 2006 г.
**01.00** «Уцёкі». Серыял.

### ЛАД

**07.20** Смачна з Барысам Бурдой.
**07.50** Усё аб бяспецы.
**08.20** Школьны фантастычны фільм «Прыгоды Электроніка» (СССР).1-я і 2-я серыі.
**10.40** Жансавет.
**11.15** Свая кампанія.
**11.55** Мультфільм.
**12.20** «Лабірынты: Катранская пушча».
**12.50** «Запал па культуры».
**13.35** Прэм'ера. «Жадаеш пачуць-паглядзі». Дакументальны фільм («Белвідэацэнтр»).
**14.05** Рамантычная камедыя «Асцярожна, бландынкі!» (Расія). 1-я-4-я, заключная, серыі.
**17.30** Эксцэнтрычная камедыя «Спытаеце Сіндзі» (ЗША).
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд-Сандэрленд. Прамая трансляцыя.
**21.25** Крымінальная меладрама «Трынаццаць месяцаў» (Украіна- Расія).
**23.30** Казанова.
**00.00** Камедыя «Пагаворым пра сэкс» (ЗША-Канада-Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** «Нататкі натураліста».
**07.40** «Юрмала-2009». Фэст гумарыстычных праграм.
**09.40** «Ранішняя пошта».
**10.15** «Суботнік».
**11.00** Весткі.
**11.15** Пакой смеху.
**12.00** Фільм «Папяровы салдат». Расія, 2008 г.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Каменская».
**15.20** «Заапарк на Каляровым». Дакументальны фільм.
**15.55** Фільм «Не бойся, я з табой!». 1-я серыя.
**17.20** Фільм «Чартар». Расія, 2007 г.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.40** «Суботні вечар».
**21.40** Фільм «Пачаць спачатку. Марта». Расія, 2008 г.
**01.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.50** Фантастычная камедыя «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Жаночы погляд».
**17.10** Вострасюжэтны серыял «Галоўны калібр».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.10** «Праграма максімум».
**21.20** «Рускія сенсацыі».
**22.20** «Ты не паверыш!».
**23.15** Камедыйны баявік «Анёл помсты».
**00.55** Драма «Морфій».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 1.
**10.05** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**10.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**13.30** Тэніс. Турнір WTA. Токіо. Фінал.
**15.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 1.
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. Клігенталь (Германія).
**17.45** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 1.
**19.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. ПАР - Гандурас/Венгрыя - ААЭ. Александрыя (Егіпет).
**21.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**22.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Аўстралія - Бразілія/Коста-Рыка - Чэхія. Александрыя (Егіпет).
**00.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**00.45** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 2.
**01.15** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
**02.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**02.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 2.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.20** Аўтастопам праз Еўропу, 4 серыя: Бельгія.
**19.40** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў гусіцкіх войнах» (спазнаваўчая праграма).
**21.20** Суботні сеанс: «Татальны кантроль», маст. фільм, 1991 г., ЗША.
**22.50** Аб'ектыў.

## 4 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**1**

**06.40** Дакументальна-пазнавальны серыял «Дзікае золата» (Францыя). Заключная серыя.
**07.05** Прыгодніцкі фільм «Народжаны ў пясках» (ЗША).
**07.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках Формула-1. Гран-пры Японіі. Гонка. Прамая трансляцыя.
**09.55** Арсенал.
**10.20** Альманах вандраванняў.
**10.50** Культурныя людзі.
**11.25** «У свеце матораў».
**12.00** Навіны.
**12.10** Меладрама «Вясна на Зарэчнай вуліцы» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны фільм «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.30** Відэафільм АТН «Закінуты свет».
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Nota bene».
**15.55** Анімацыйны прыгодніцкі фільм «Суперсямейка» (ЗША).
**18.05** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**22.35** Прэм'ера. Біяграфічная драма «Міс Потэр» (Вялікабрытанія - ЗША).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік».
**12.50** Камедыя «Самая абаяльная і прывабная».
**14.25** «Карнавал лёсу Ірыны Мураўёвай».
**15.25** АНТ прадстаўляе: «Песні Перамогі». «Таямніцы Кацюшы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Анастасія Заваратнюк. У пошуках кахання».
**17.20** Ералаш.
**17.45** «Легенда аб трох ключах». Францыя, Бельгія, 2007.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Здабытак Рэспублікі».
**00.50-01.55** «Паўднёвае Бутава».

**СТВ**

**06.25** «Праверана на сабе».
**07.10** «Фірмовая гісторыя». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Адзін выдатны дзень». Францыя, 2006 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Аўтапанарама».
**12.00** «Салдаты. Залатыя серыі».
**14.40** «Культурнае жыццё».
**15.10** «Рэтраманія».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** Фільм «Біндзюжнік і кароль». СССР, 1989 г. 2-я серыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Дарога на Арлінгтан». ЗША, 1999 г.
**22.45** «Спартовы тыдзень».
**23.05** СТВ прадстаўляе: канцэрт Аляксандра Саладухі «Песні маёй душы».
**00.10** «Уцёкі». Серыял.

**ЛАД**

**07.45** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.55** Школьны фантастычны фільм «Прыгоды Электроніка» (СССР). 3-я серыя, заключная.
**10.05** Сацыяльная меладрама «Іспыт на дырэктара» («Беларусьфільм»).
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Пасоўванне+.
**12.25** Дакументальны фільм «Дзень настаўніка» (Беларускае тэлебачанне).
**12.55** Рамантычная меладрама «Бальная сукенка» («Беларусьфільм»).
**14.30** Музычная камедыя «Беражыце жанчын» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Поўначсталь (Чарапавец). Прамая трансляцыя.
**19.15** Канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Экспедыцыя.
**21.15** Псіхалагічная драма «Памяранцавае каханне» (Украіна- Расія).
**22.50** «Правы чалавека».
**23.05** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Дынама (Мінск) - Шахцёр.

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** «Хто ў хаце гаспадар».
**07.45** Прэм'ера. Фільм «Пачаць спачатку. Марта». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Самы павольны цягнік».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Каменская».
**15.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**15.45** Фільм «Не бойся, я з табой!». 2-я серыя.
**17.05** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Дэтэктыў «Апошні загад генерала». Расія, 2006 г.
**22.35** «Спецыяльны карэспандэнт».
**23.45** Фільм «Бульварны раман».
**01.25** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.00** Баявік «Анёл помсты».
**07.35** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Савецкія біяграфіі. Надзея Крупская».
**14.15** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс: місія «Клеапатра».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Крамлёўская кухня. Дачнікі».
**17.15** Вострасюжэтны серыял «Галоўны калібр».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** «Анатоль Кашпіроўскі».
**22.00** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Семін».
**23.45** «Авіятары».
**00.15** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 2.
**10.00** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.30** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 1.
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. Клігенталь (Германія).
**12.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Суперпоул. Траса Маны-Кур (Францыя).
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. Траса Маны-Кур (Францыя). Заезд 1.
**14.00** Суперспорт. Чэмпіянат свету. Траса Маны-Кур (Францыя).
**15.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 2.
**16.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Траса Маны-Кур (Францыя). Заезд 2.
**17.30** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 2.
**19.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Групавы этап. Александрыя (Егіпет).
**20.45** Мотаспартыўны часопіс.
**21.00** Снукер. Гран-пры. Глазга (Шатландыя). Дзень 2.
**00.00** Мотаспартыўны часопіс.
**00.15** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 3.
**00.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 20 гадоў. Егіпет. Навіны.
**01.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі IBF. ЗША.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. Іспанія. Дзень 3.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.20** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**20.15** Форум (ток-шоу): «Беларуская пенітэнцыярная сістэма».
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.25** Акно ў Еўропу.
**21.50** Фільматэка майстроў: «Ноч без месяца», маст. фільм, 2004 г., Албанія–Францыя.

---

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________
(по реестру ф. 11)
№ ____________
(по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
| --- | --- | --- | --- |
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.

(сумма прописью)

Кому
Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ____
Всего ____
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ____
Всего ____
Кассир

ЦІКАВА

# «УСХОДНЯЕ ПАРТНЁРСТВА» І ЗОНЫ СВАБОДНАГА ГАНДЛЮ

Алег НОВІКАЎ

**Адкрытыя рынкі і эканамічная інтэграцыя шасці краін былога СССР з Еўропай — адзін з галоўных прыярытэтаў праграмы «Усходняга партнёрства». Паказальнікам сапраўднага поспеху на гэтым накірунку павінна стаць стварэнне зонаў свабоднага гандлю.**




Паводле прынятых пагадненняў па праграме «Усходняга партнёрства» (УП), плануецца стварыць зоны свабоднага гандлю паміж ЕС і кожнай з шасці краін. Дамовы будуць распаўсюджаны на амаль усе сферы гандлю, у тым ліку на энергетычны сектар. Прадугледжваецца таксама уніфікацыя адпаведнага заканадаўства, што, у сваю чаргу, будзе дапамагаць мадэрнізацыі эканомік краін-партнёраў і правядзенню рэформаў. Пагадненні, на думку аўтараў дакументу, складуць рэальныя ўмовы для руху тавараў, капіталаў і паслуг.

Зона свабоднага гандлю (FTA) — мадэль адмысловай эканамічнай тэрыторыі. Дакладней, гэта мытная тэрыторыя, на якой у аднабаковым парадку (ці ў адпаведнасці з нейкай міжнароднай дамовай) адменены мытныя стаўкі і іншыя меры абмежавання міжнароднага гандлю.

Сутнасць зоны свабоднага гандлю зводзіцца да зніжэння мытных ставак паміж краінамі-ўдзельніцамі. Краіны добраахвотна адмаўляюцца ад абароны сваіх нацыянальных рынкаў у адносінах са сваімі партнёрамі ў рамках дадзенага аб'яднання, але ў адносінах з трэцімі краінамі яны выступаюць не калектыўна, а індывідуальна. Захоўваючы свой эканамічны суверэнітэт, кожны ўдзельнік зоны свабоднага гандлю ўсталёўвае ўласныя вонкавыя тарыфы ў гандлі з краінамі, якія не ўдзельнічаюць у дадзеным інтэграцыйным аб'яднанні.

Звычайна стварэнне зоны свабоднага гандлю пачынаецца з дамоўленасцяў двух краін, да якіх затым далучаюцца новыя краіны. Лепшы прыклад — NAFTA (Паўночна-амерыканская гандлёвая зона). Спачатку гэта была дамова паміж ЗША і Канадай, да якой пазней далучылася Мексіка.

FTA з'яўляюцца важнымі суб'ектамі сусветнай эканомікі. Сёння 50 працэнтаў сусветнага гандлю адбываецца ў рамках рэгіянальных гандлёвых зонаў. Увогуле, на планеце існуюць 14 FTA.

Першая свабодная гандлёвая зона ў Еўропе ўзнікла яшчэ ў 1834 годзе. Гэты быў мытны саюз краін — удзельніц Германскай канфедэрацыі, асацыяцыя нямецкіх дзяржаваў, заснаваная па выніках Венскага кангрэсу. ЕС фактычна пачыналася таксама як калектыўная FTA.

Дастаткова экзатычная з'ява — Еўрапейская асацыяцыя свабоднага гандлю (EFTA). Яна ўзнікла ў 1960 годзе як альтэрнатыва да Еўрапейскай Супольнасці. У яе склад на той момант уваходзілі сем краін. Аднак тры дзяржавы пасля пакінулі EFTA, паколькі сталі сябрамі ЕС. Асацыяцыя існуе да гэтага часу.

Аднак куды больш важным для разумення перспектыў таго, што дае стварэнне зоны свабоднага гандлю паміж Беларуссю і ЕС, прадстаўляе досвед іншых FTA. Размова пра Балтыйскую зону свабоднага гандлю (BAFTA) і Цэнтральнаеўрапейскую свабодную гандлёвую зону (CEFTA), заснаваных адпаведна ў 1992-м і 1999 гадах. BAFTA і CEFTA былі створаны пасля падзення камунізму, каб інтэграваць эканомікі краін былога Варшаўскага блока ў рынак ЕС.

Адкрыццё краін замежнаму капіталу выклікала прыліў інвестыцый. Гэта дапамагло ў адносна кароткі тэрмін ажыццявіць рэструктурызацыю і мадэрнізацыю прамысловасці, арыентаваную цяпер на рынкі ЕС. Адбывалася развіццё неабходнай тэхнічнай і транспартнай інфраструктуры.

У 2004 годзе, пасля пашырэння Еўрапейскага саюза, BAFTA распусцілася. Эстонія, Латвія і Літва сталі сябрамі ЕС. Уступілі ў склад ЕС і заснавальнікі CEFTA, аднак блок не перастаў існаваць. Цяпер ён аб'ядноўвае балканскія краіны і Малдову. Дыскутуецца магчымасць прыняцця туды Украіны. Некаторыя прагназуюць, што менавіта краіны — сябры «Усходняга партнёрства» могуць стаць таксама новымі сябрамі CEFTA.

Аўтары стварэння праекту «Усходняга партнёрства» прызнаюць, што на цяперашні момант некаторыя краіны — сябры праграмы УП не гатовыя да рэалізацыі планаў сапраўднай FTA з Еўропай. Трэба адзначыць, што нават Украіна пакуль так і не падпісала дамовы з ЕС наконт FTA.

У дэкларацыі «Усходняга партнёрства» гаворыцца, што ацэнка ўзроўню падрыхтаванасці краін да стварэння FTA будзе вельмі жорсткай, аднак сцвярджаецца прынцыповая гатоўнасць да дыялогу на гэты конт і прадугледжваецца адпаведная дапамога ў рамках спецыяльнай праграмы.

Таксама адзначаецца, што ў доўгатэрміновай перспектыве фармат FTA паміж ЕС і якой-небудзь краінай — удзельніцай «Усходняга партнёрства» павінен выйсці на новую ступень. Магчыма, будзе арганізавана сетка двухбаковых дамоваў паміж усходнееўрапейскімі краінамі — сябрамі УП. Гэта, як гаворыцца ў дакуменце, дае шанец для стварэння Эканамічнай супольнасці краін — суседзяў ЕС.

Беларусь шмат разоў і на вельмі высокім узроўні выказвалася за стварэнне падобнай зоны свабоднага гандлю. Аднак, думаецца, менавіта нас чакае самы доўгі шлях да FTA. Беларусь і Азербайджан да гэтага часу не з'яўляюцца сябрамі Сусветнай гандлёвай арганізацыі (WTO), што ёсць абавязковай умовай для заключэння дамоў з ЕС.

З пазіцыяй Баку ўсё больш-менш зразумела, хаця б па той прычыне, што Азербайджан не ўдзельнічае ў мытным саюзе Расіі, Беларусі і Казахстана. Між тым, Мінск, Масква і Астана заяўляюць пра сваё жаданні ўступіць у WTO па групавому прынцыпу. Дырэкцыя WTO адказвае, што гэта нонсэнс. Пакуль цягнецца спрэчка, наша сяброўства ў WTO і, адпаведна, шанцы на ўваход у зону свабоднага гандлю з ЕС адкладваюцца на больш позні тэрмін.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сумесныя вучэнні Расіі і Беларусі адбываюцца рэгулярна, але ўпершыню на тэрыторыю Беларусі была ўведзена такая колькасць войскаў. Беларуская апазіцыя абурана і занепакоена гэтым фактам. Рашэнне Крамля правесці такія маштабныя вучэнні падчас крызісу азначае, што Масква хоча паказаць усяму свету, што мае магутнае войска. Беларусь жа са свайго боку паказвае Маскве, што, нягледзячы на вызначаныя празаходнія змены ў сваёй знешняй палітыцы, па-ранейшаму застаецца саюзніцай Расіі. У апошні час адносіны паміж Беларуссю і Расіяй значна пагоршыліся. Крэмль не хоча танна прадаваць Мінску энергарэсурсы. За гэта Масква чакае ад Лукашэнкі згоды на ўдзел расійскага бізнесу ў прыватызацыі беларускай прамысловасці. Аднак беларускі дыктатар не збіраецца на гэта пагаджацца. Ён ведае, што тады страціць уплыў на эканоміку.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

Перад Беларуссю тры варыянты развіцця. Першы — кампраміс у трохкутніку ЕС—Беларусь—Расія і пошукі больш эфектыўнай эканамічнай мадэлі. Другі — пераканаць ЕС у неабходнасці фінансавання карэннай рэформы сістэмы. Трэці — зноў паспрабаваць шукаць шляхі рашэння праблем разам з Расіяй. Найбольш верагодны, па меркаванні беларускага палітолага, варыянт — першы. Пры другім і трэцім цяперашняму кіраўніцтву краіны непазбежна давядзецца сыходзіць. У любым выпадку, у якасці дзяржавы-ранцье Беларусь не цікавіць ні Расію, ні Еўрасаюз.

**«Delfi» (Эстонія)**

Масква на беларускім накірунку не «варушыцца», сваю грамадска-палітычную інфраструктуру не ставарае і ўсе свае кантакты замыкае на ўладную вертыкаль. Амерыканцы прыступілі да стварэння ў Беларусі кіраванай і залежнай ад іх рускамоўнай апазіцыі. Робяць яны гэта ў доўгатэрміновай перспектыве да прэзідэнцкіх выбараў 2016 года, калі, па іх меркаванні, магчыма з'яўленне моцнага рускамоўнага кандыдата.

**«Фонд стратэгічнай культуры» (Расія)**

Адразу пасля развалу СССР толькі 7–8 працэнтаў насельніцтва рэспублікі разглядала Вялікае княства Літоўскае, у склад якога ўваходзіла і Беларусь, як сваю гістарычную прарадзіму, а два гады таму гэты паказчык складаў ужо 65 працэнтаў. Такім чынам, прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку фактычна ўдалося стварыць нацыю, якая ведае сваё месца ў гісторыі і не мае ўнутранага канфлікту па гэтаму пытанню. Можна сказаць, што сучасныя грамадзяне Беларусі ў большай ступені нацыя, чым грамадзяне Украіны. Украіне ёсць чаму павучыцца ў Беларусі. У Беларусі ідзе працэс будовы нацыі, і Украіна ў параўнанні з нашай суседкай прайграе — у нас няма такога цэласнага бачання ўнутранай палітыкі і асэнсаваных дзеянняў, накіраваных на пошук нацыянальнай ідэнтычнасці.

**«Частный кореспондент» (Украіна)**

Якую мэту пераследуе Мінск, робячы стаўку на фінансавую самастойнасць вёскі? Па-першае, скончыць з дробнымі стратнымі прадпрыемствамі, якія працуюць з адмоўнай рэнтабельнасцю, але трымаюцца дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы. Па-другое, прымусіць мясцовых вытворцаў быць больш канкурэнтаздольнымі ў рынкавых умовах. І па-трэцяе, спадабацца Маскве. Сёння беларускія малочнікі і цукровыя заводы дэмпінгуюць на расійскім рынку менавіта дзякуючы датацыям. А нашы сяляне, не маючы такой дапамогі, апынуцца ў страце. Так ці інакш, Лукашэнка задумаў адважны эксперымент. Практычна ў кожнай краіне сельская гаспадарка з'яўляецца стратным сектарам і падтрымліваецца дзяржавай.

**«Известия» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІТАЛІЯ. Я — НЯЧЭСНЫ ЖУРНАЛІСТ

Журналісцкія арганізацыі Італіі абвясцілі пра намер правесці 3 кастрычніка агульнанацыянальную дэманстрацыю. Акцыя будзе звязана з апошнімі ўчынкамі прэм'ера Сільвіа Берлусконі. Кіраўнік краіны падаў у суд на ўсе выданні, якія рэгулярна аглядаюць падрабязнасці сексуальнага скандалу, у цэнтры якога знаходзіцца Берлусконі. Нядаўна шэраг прадстаўніц самай старажытнай прафесіі заявілі, што прэм'ер рэгулярна запрашаў іх на свае вечарыны. Апетыты Берлусконі сапраўды фантастычныя. Так, ад былога органу камуністаў «Unita», заснаванага яшчэ Антоніа Грамшы, Сільвія патрабуе выплаціць 2 мільёна еўра. Журналісты разглядаюць іскі палітыка як сродак ціску на прэсу. Шматлікія выданні ў знак салідарнасці ў кожным нумары друкуюць 10 пытанняў да прэм'ера. Яны тычацца яго сексуальных прыгодаў, на якія кіраўнік дзяржавы да гэтага часу не даў адказу. Напрыклад, якія адносіны 72-гадовы Берлусконі меў з 17-гадовай Летыцыяй. Патрабаванні прэсы падтрымалі самыя вядомыя культурныя дзеячы, а таксама левыя партыі і прафсаюзы. Апошніх Берлусконі абвінаваціў у спробе арганізацыі дзяржаўнага перавароту. Між тым, нават АБСЕ выказала сваю занепакоенасць станам свабоды прэсы ў Італіі.

**Па матэрыялах «Il Manifesto» (Італія)**

### УЗБЕКІСТАН. БІТВА ЗА ЎРАДЖАЙ



Узбекістан змагаецца за ўраджай бавоўны. Яго следствам стала мабілізацыя ўзбекскіх школьнікаў. У шматлікіх абласцях краіны прыпынілі занняткі. Дзяцей пагналі на палі. Так, у Сурхандар'інскай вобласці ў 600 з 860 школаў усе вучні старэйшых класаў адпраўленыя на плантацыі. Дзеці будуць атрымліваць прыкладна 5 цэнтаў за кожны кілаграм бавоўны. Так ці інакш, гэты факт выклікаў вялікі скандал. Фактычна праца школьнікаў за «белае золата» — прымусовая эксплуатацыя дзяцей. Тым больш, у мінулым годзе ўлады краіны прызналі, што такая з'ява, як прымусовая дзіцячая праца, мае месца ва Узбекістане, і прынялі нават спецыяльны закон для барацьбы з гэтым сацыяльным злом. Рэакцыяй міжнародных арганізацый на факты эксплуатацыі ўзбекскіх школьнікаў стала кампанія па байкоту шэрагу тавараў, якія вырабляюцца з узбекскай бавоўны.

**Па матэрыялах «Фергана» (Узбекістан)**

### ВЕНЕСУЭЛА. ШКОЛЬНІКІ ІДУЦЬ У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ПАТРУЛІ

Адпаведна загаду Уга Чавеса, па ўсёй краіне на базе 25 000 школ будзе сфармавана 101 тысяча школьных патрулёў. Такія арганізацыі з'яўляюцца сродкам падтрымкі рэформы адукацыі, прынятай у краіне. Мэтай рэформы ёсць стварэнне «новага мужчыны і новай жанчыны» для сацыялістычнага грамадства. Каб надаць імпульс рэформе, Чавес загадаў праўрадавай Аб'яднанай сацыялістычнай партыі Венесуэлы (PSUV) тэрмінова стварыць «сацыялістычныя патрулі». Патрулі павінны быць створаныя на базе секцый партыі пры школах. Патрулі будуць працаваць паралельна з Камітэтам падтрымкі рэвалюцыі (іншая структура прыхільнікаў Чавеса). Новы закон і сама ідэя арганізацыі патрулёў выклікалі вялікі пратэст сярод вучняў і настаўнікаў. Закон адмяняе аўтаномію навучальных установаў, у тым ліку прыватных. Супраць закона выступае таксама каталіцкая царква. Праўда, галоўным чынам яна патрабуе, каб выкладанне рэлігіі засталося часткай школьнай праграмы.

**Па матэрыялах «ABC» (Іспанія)**

### ПОЛЬШЧА. АХВЯРА ДВУХ ТАТАЛІТАРНЫХ РЭЖЫМАЎ

Польскі сойм прыняў рэзалюцыю з асуджэннем уварвання Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Прысвечаныя гэтым падзеям рэзалюцыі польскі сойм прымае не першы год, але толькі зараз ўжыта слова «генацыд» адносна дзеянняў СССР супраць Польшчы. «Польшча пала ахвярай двух таталітарных рэжымаў — нацызму і камунізму», — гаворыцца ў рэзалюцыі. Асуджаючы агрэсію савецкіх войскаў, аўтары рэзалюцыі адзначаюць, што польскі лёс падзялілі многія іншыя народы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Рэзалюцыю прынялі без галасавання і дэбатаў. Дакумент быў узгоднены на мінулым тыдні спікерам сойму Браніславам Камароўскім падчас кансультацый з усімі фракцыямі парламента.

**Па матэрыялах «Gazeta Wyborcha»**

▸ **МОДА**

# НАЙВЯЛІКШАЯ МАДЭЛЬ У ГІСТОРЫІ

Іван БІЧ



**60 гадоў таму нарадзілася дзяўчынка, якая зрабіла рэвалюцыю ў мадэльным бізнесе. На гэта ёй спатрэбілася ўсяго 4 гады.**

Леслі Хорнбі было ўсяго 16 гадоў, калі яна, звычайная школьніца, падпісала кантракт на працу ў якасці мадэлі. Калі ў 20 гадоў яна сыходзіла з мадэльнага бізнесу, яе называлі тварам эпохі і першай у гісторыі мадэллю для тынейджэраў.

Яе завуць Леслі Хорнбі, аднак увесь свет ведае яе па мянушцы Твігі. Леслі нарадзілася 19 верасня 1949 года. Дачка цесляра, яна вырасла ў прыгарадзе Лондана. Сям'я была небагатай, і ўжо дзяўчынкай Леслі павінна была працаваць. Яе першым працоўным месцам стала цырульня. Паралельна Леслі наведвала мясцовую школу.



Кажуць, у 1966 годзе яе бойфрэнд Нігел Дэвіс прапанаваў ёй паспрабаваць сябе як мадэль. Аднак ёсць і іншыя версіі. Уладальнік касметычнага салону, куды яна нібыта аднойчы зайшла зрабіць стрыжку, параіў Леслі стаць мадэллю. Яшчэ адна версія — Леслі сама вырашыла паспрабаваць сябе ў гэтай сферы. На гэты час ёй было 16 гадоў. Яна важыла 41 кілаграм, мела 169 сантыметраў росту і прапорцыі 80 на 55 на 80. Бары Латэган, фатограф, які рабіў яе здымкі, зацікавіўся, якую мянушку мае Леслі ў школе. «Трысцінка», — адказала тая (на англійскай мове «Трысцінка» гучыць як «Твігі» — агл.: Twiggy). Бары настаяў, каб маладая мадэль з'явілася на мадэльным рынку менавіта як Твігі.

Так нарадзіўся брэнд. Асноўныя складовыя вобразу Твігі: твар анёла, фігурка эльфа, стрыжка пад хлопчыка, доўгія густыя вейкі, кароткая спадніца, абыякавы халодны позірк.

У тым жа 1966 годзе яна па версіі газеты «Daily Express» стала «Тварам года». Пры гэтым Твігі ні разу не выйшла на подыум. Яе папросту здымалі фатографы для розных часопісаў. Леслі нават адкрыла сваю лінію моладзевай моды Twiggy Dresses. Пазней яна стала ўладальніцай уласнага буціка ў цэнтры брытанскай сталіцы. У тым жа 1966 годзе на рынку з'явілася цацка Твігі — аналаг славутай цацкі Барбі.

Але і гэтага маладой мадэлі аказалася мала. У 1967 годзе яна адправілася заваёўваць Амерыку. Куміру брытанскіх тынейджэраў прагназавалі за акіянам правал, аднак ужо праз год яе твар прызналі тварам планеты. Яе выяву змясцілі ў капсулу і адправілі ў космас. На гэты час марка «Твігі» ўжо складала канкурэнцыю іншым вядомым брэндам.

Кар'ера Леслі не была бясхмарнай. Хутка Твігі трапіла ў фокус крытыкі педагогаў.

З-за яе папулярнасці абсалютным шыкам сярод моладзі стала хударлявае цела. Настаўнікі канстатавалі сотні выпадкаў, калі дзяўчынкі, якія хацелі быць падобнымі да Твігі, гублялі прытомнасць на занятках. Такія выпадкі называлі «сіндром Твігі». Мадэль адразу абвінавацілі ў папулярызацыі нездаровага ладу жыцця. Былі спробы падаць на яе ў суд.

Між тым, у пачатку 1970-х Твігі заявіла, што пакідае мадэльны бізнес. Яна стала актрысай кіно і адначасова спрабавала спяваць. Мюзікл «The Boy Friend» прынёс ёй дзве ўзнагароды ў намінацыі «Залаты глобус». У 1976-м яна запісала свой дыск «Twiggy and Please Get My Name Right», які ўвайшоў у спіс лепшых у Вялікабрытаніі. У 1977 годзе Леслі выйшла замуж за акцёра Макла Уітні. Пасля смерці мужа ад сардэчнага прыступу ў 1983-м яна зноў выйшла замуж за іншага акцёра Лі Лоўсана. У яе нарадзіўся сын.

Цяпер Твігі жыве ў Лондане. Часам з'яўляецца на тэлебачанні, выдае свае старыя запісы, удзельнічае ў дабрачынных праграмах супраць раку. Акрамя таго, вядзе шоу «Twiggy's people». Увасабляе твар кампаніі «Marks&Spencer». Заснавала сваю лінію касметыкі.

Не вельмі цікавыя апошнія гады жыцця Твігі кампенсуюцца актыўнай палемікай гісторыкаў моды наконт сакрэту яе поспеху і папулярнасці. Чаму яна так пасавала запытам публікі? Наколькі яе з'яўленне змяніла трэнды ў модзе і масавай культуры?

Твігі сапраўды ёсць іконай стылю. Ёй прысвяцілі песні «Spice Girls», Мэрлін Мэнсан, Дэвід Боуі (ён, дарэчы, папрасіў яе зняцца з ім для вокладкі альбому «Pin Ups»).

Культуролагі дружна прызнаюць, што, па вялікаму рахунку ,стыль Твігі быў пратэстам супраць тагачасных канонаў вобразу жанчыны ў мадэльным бізнесе. Жанчына на подыуме ў той час паказвала, як павінна выглядаць хатняя гаспадыня — такая была асноўная роля жанчын у грамадстве.

Стыль Твігі ламаў традыцыі. Яна яўна не была падобная на ахоўніцу сямейнага ачага. Гэта адпавядала пратэстнаму духу 1960-х. Не дзіўна, што Твігі лічыцца адным з сімвалаў культурнай з'явы Swinging London — моладзевай культурнай рэвалюцыі ў Вялікабрытаніі 1960-х гадоў.

Высоўваюцца і наогул шакуючыя версіі. Звычайна Твігі на здымках не пасміхаецца, як традыцыйна робіць мадэлі. Яна абыякава, нават пагардліва, глядзіць навокал. Яна ці то хлопчык, ці то дзяўчынка. Рэтраграды палічылі гэта замахам на жаноцкасць. Быццам погляд Твігі і фігура хлопчыка — не што іншае, як выява андрагіна (нешта сярэдняе паміж М і Ж). Гэта, на іх думку, ёсць латэнтная прапаганда нетрадыцыйных сексуальных паводзін.

Іншыя кажуць, што знікненне нават знешніх адрозненняў паміж паламі — будучае чалавечай антрапалогіі. Няўжо ўсе людзі праз нейкі час будуць выглядаць як Твігі?

У любым выпадку, здымкі Твігі да гэтага часу выклікаюць эмацыйную рэакцыю. А гэта значыць, што мы і зараз жывем у эстэтычных катэгорыях моладзевай рэвалюцыі 1960-х.

МЕРКАВАННЕ

# ПРЫДНЯСТРОЎСКІ СІНДРОМ

**На фоне прыходу да ўлады ў Кішынёве Кааліцыі за еўрапейскую інтэграцыю 2 верасня Прыднястроўе адзначыла 19-ю гадавіну ўласнай дзяржаўнасці. Ці змянілася атмасфера ў Цiраспалі пасля перамогі малдаўскіх дэмакратаў? Пра гэта і пра іншыя аспекты прыднястроўскай палітыкі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з малдаўскім калегам Максімам Курзолевым.**



***— 19 гадоў таму Прыднястроўе абвясціла на ўвесь свет пра сваю незалежнасць. Якія, на твой погляд, галоўныя ўрокі гісторыі дзяржаўнага фармавання Прыднястроўская Малдаўская Рэспубліка (ПМР)?***

— Многія з тых, хто жыве ў Прыднястроўі, памятаюць уздым канца 80-х — пачатка 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Але ў той атмасферы ніхто не думаў, навошта гэта, куды можа прывесці. Ніхто не разважаў пра гістарычныя заканамернасці. Пераважная большасць верыла, што іх справа правая. Гэта быў больш чым энтузіязм. Гэта — тое агульнае, што яднала ўсіх. Знаходзіліся, як і ў кожнай справе, прагматыкі, якія ў такой сітуацыі спакойна рабілі нешта на сваю карысць. У любым выпадку, атрымалася штосьці зусім іншае, не тая ПМР, пра якую марылі яе стваральнікі. Гэта гістарычная заканамернасць — выпрабаванне ўладай, выпрабаванне вялікімі грашыма, выпрабаванне цынізмам. Ігар Смірноў 2 верасня 1990 года і Ігар Смірноў 2 верасня 2009 года — не адно і тое ж. Гэта галоўны ўрок, я мяркую.

***— Як сустрэлі ў Цiраспалі навіну пра змену ўлады ў Кішынёве? Што кажуць, напрыклад, пра роспуск малдаўскага Міністэрства рэінтэграцыі, якое займалася праблемамі аб'яднання з ПМР?***

— Што да Кішынёва — сталага раздражняльніка, то ў Цiраспалі да яго прапаноў ставяцца паводле прыказкі: «Ваду варыць — вада будзе». Ну і хай адбываюцца ў Кішынёве палітычныя змены. Разагналі Міністэрства рэінтэграцыі, зараз за праблемы прыднястроўскага рэгулявання ў новым малдаўскім урадзе пачне адказваць віцэ-прэм'ер, у якога будзе адпаведны апарат. І што? Ці з'явіцца штосьці новае ў сувязі з гэтым? Такое пытанне разглядаецца толькі з пазіцыі, што дрэнная гэта прынясе Цiраспалю і як тое можна абмежаваць. Пытанні, хто кіруе працэсам, з кім будуць кантактаваць новыя ўлады, чые інтарэсы пачнуць праводзіць, натуральна, важныя. Але ёсць устаноўка: ніякага збліжэння апрыёры. «Няхай Кішынёў ідзе сабе ў Еўропу, няхай забудзецца пра нас», — гэтыя словы паўтараюць у Цiраспалі амаль як мантру.

***— Ці назіраецца ў рэгіёне актывізацыя Расіі ў сувязі з апошнімі падзеямі?***

— Ужо зразумела, што ў гульнях паміж вялікімі геапалітычнымі акцёрамі Прыднястроўе стала часткай расійскай знешняй палітыкі. Былі прагнозы, што Прыднястроўе, як толькі кошты на нафту абваляцца, у выніку скарачэння расійскай дапамогі доўга не працягне. Аднак гэтага не адбылося. Падзенне коштаў на нафту ўдарыла не толькі па расійскіх спонсарах Цiраспаля, але, як гэта ні дзіўна, і па заходніх фундатарах Кішынёва. Пакуль што да «прыднястроўскага фактару» расійская знешняя палітыка звяртаецца, калі ў тым ёсць патрэба. Гэта тэматыка не гарачая, дый Малдова — не самая важная краіна для РФ. Побач з расійскімі межамі — Абхазія і Паўднёвая Асеція, і да іх нашмат больш увагі, па зразумелых прычынах.

Па-другое, расіянам даўно ясна, што ўсе патрыятычныя пафасныя заявы эліты пра тое, што Прыднястроўе — фактычна прарасійскі рэгіён (вялікая частка якога, дарэчы, малдаўскія грамадзяне), часцей за ўсё, проста для публікі.

***— Як праз 19 гадоў насельніцтва ставіцца да праекта ПМР?***

— Для агульнага настрою падыходзіць псіхалагічнае вызначэнне «сіндром выгарання». Па сваёй сутнасці ён падобны на сіндром хранічнай стомленасці, ці, дакладней сказаць, з'яўляецца ягоным лагічным працягам. Гэта і не дзіўна. Стан нестабільнасці, практычная адсутнасць перспектыў, стан «быццам бы дзяржавы», замкнёнасць грамадства. Не з'яўляецца сакрэтам, што ў адміністрацыі Цiраспаля пераважаюць настроі: «вы робіце выгляд, што плаціце годную зарплату, мы робім выгляд, што добра працуем», «нікому нічога не трэба». Ёсць, вядома ж, выключэнні, але яны толькі пацвярджаюць гэтыя настроі. Не дадае аптымізму і прысутнасць адчування падвойнай праўды. Усім нібыта ўсё зразумела: чаму, для каго, навошта, для чаго і што робіцца. Але такая аднадушнасць ніколі не была шляхам прагрэсу.

***— Вядома, што адна з груповак прыднястроўскай эліты (група Шаўчука і яго партыя «Адраджэнне») спрабуе скінуць клан Смірнова. Як насельніцтва рэгіёна рэагуе на гэту барацьбу?***

— Супрацьстаянне гэтых груповак не носіць сістэмнага характару. Праблема ў тым, што ўсе людзі, якія жывуць у Прыднястроўі — і добрыя, і дрэнныя, і ніякія, — з'яўляюцца закладнікамі сістэмы існуючых адносін. Сутнасць гэтай сістэмы можна сфармуляваць у трох словах: «Табе тут жыць». На істотныя змены ніхто не ідзе, бо ўсе асцерагаюцца, што раптам стане яшчэ горш. Ёсць замацаваны ў падсвядомасці тэзіс: «Недзе побач увесь час прысутнічае кішынёўскі вораг (ці, прынамсі, не сябар), які імкнецца ўсё забраць і нешта зрабіць, каб змяніць усё на сваю карысць. Будзь гатовы! Вораг не спіць!» А навошта змагацца з падсвядомасцю, з тым, што з'яўляецца асновай знешніх і ўнутраных паводзін? Няхай нават гэта падсвядомасць выматала і выпусташыла само існаванне... Сапраўды, жыць, таму што жывецца, не вельмі камфортна. Але што наўзамен? У прыднястроўскім грамадстве не назіраецца ніякай альтэрнатыўнай ідэі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### НІКАЛЯ САРКАЗІ



Менавіта з падачы Саюза за народны рух (UMP), лідэрам якога і з'яўляецца прэзідэнт Нікаля Сарказі, французскі парламент прыняў незвычайны закон. Заканадаўчы акт тычыцца асобаў, якія нелегальна качаюць з інтэрнэта музыку, кіно і іншыя культурныя прадукты. Пачынаючы з наступнага года падобныя аматары халявы могуць быць пакараны адключэннем ад сеціва на працягу аднаго года. Калі на гэты час злачынца меў заключаны кантракт на пастаўку інтэрнэт-паслугаў, ён будзе ўсё роўна плаціць фірме-правайдэру паводле кантракту. Праўда, перад тым, як пірата адлучаць ад сеціва, ён атрымае два папярэджанні. Калі ж ён працягне парушаць закон аб аўтарскіх правах, выкарыстоўваючы іншыя кампутары, пірат мае шанс апынуцца за кратамі і заставацца там аж 2 гады. Іншы варыянт — яму выпішуць штраф на 300 тысяч еўра. Падпадаюць пад дзеянне новага закона і сваякі «пірата». Калі яны будуць даваць доступ у інтэрнэт асобе, ужо пазбаўленай права карыстання, то рызыкуюць страціць доступ у сеціва на месяц. Калі іх зловяць у другі раз за падобнай справай — штраф 4 тысячы еўра. Застаецца дадаць, што супраць закону прагаласавалі ўсе левыя апазіцыйныя партыі, якія лічаць гэта парушэннем канстытуцыі, а дакладней, артыкула, які гарантуе французам права на атрымання інфармацыі. Сацыялісты ўжо перадалі скаргу ў Канстытуцыйны суд.

### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ



Адным з галоўных козыраў лідэра Партыі рэгіёнаў была і ёсць тэма абароны правоў жыхароў Усходняй і Паўднёвай Украіны. Адсюль, дарэчы, і назва ягонай партыі — Партыя рэгіёнаў. Аднак нечакана высвятляецца, што Януковіч ужо больш не прадстаўляе цалкам інтарэсы ўсіх жыхароў Адэсы, Крыму, Данбасу, Харкава і г.д. На мясцовых выбарах у Крыме, якія адбыліся на мінулым тыдні, рэгіяналы праваліліся. Прычым у некаторых месцах іх апярэдзілі прадстаўнікі «аранжавых» — кандыдаты Блока Юліі Цімашэнка (БЮТ). Што адбываецца? Выбары адбыліся ў нязручны для Партыі рэгіёнаў момант. Напярэдадні ў крымскай арганізацыі партыі адбыўся раскол. З Партыі рэгіёнаў сышлі прыхільнікі ідэі, што Крым — частка Расіі. Раскол прайшоў пад акампанемент спрэчкі. Бакі не саромеліся называць адзін аднаго на публіцы «цыгане», «пед... сты» і г.д. Другая версія падзей: катастрофа ў Крыме — гэта люстэрка агульнай тэндэнцыі. Апошнім часам з партыі добраахвотна выйшлі вельмі яскравыя асобы — Тарас Чарнавіл, Ірына Багаслоўская, якія таксама прадстаўлялі інтарэсы лакальных карпаратыўных груповак. Такім чынам, Партыя рэгіёнаў губляе статус партыі Усходу і Поўдня, ператвараючыся ў партыю выключна аднаго рэгіёна — Данбаса.

### МУАМАР КАДАФІ



Лівійскі лідэр у дадатак да сваіх шматлікіх рэгалій цяпер яшчэ і старшыня ААН. 15 верасня да Лівіі перайшло сімвалічнае старшынства ў ААН, якое будзе цягнуцца роўна год. Непасрэдна Лівія ўступіць у функцыі старшыні падчас сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, якая адкрылася на гэтым тыдні. Думаецца, гэты год ААН запомніць надоўга. Яшчэ 1 верасня, падчас святкавання 40-й гадавіны Лівійскай рэвалюцыі, Кадафі падзяліўся сваімі планамі наконт будучыні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Паводле яго, малыя краіны павінны атрымаць такія ж ўладныя паўнамоцтвы, як і краіны — сябры Савета бяспекі ААН (ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай). Іншымі словамі, права вета, якое маюць пералічаныя краіны, павінна быць скасавана. У прынцыпе, апошнім часам з Трыпалі рэгулярна прыходзілі экзатычныя навіны. Так, Кадафі прапанаваў аўтамабільнай індустрыі тэрмінова распрацаваць новы тып машыны пад назвай «ракета», інструктаваў лівійцаў трымаць дома курэй, каб пакласці канец імпарту яек, распусціць Сусветную футбольную федэрацыю (FIFA). Аднак самай вялікая інтрыгай старшынства Лівіі ў ААН будзе справа Швейцарыі. Раней Трыпалі падаў афіцыйны запыт у ААН з просьбай вынесці на разгляд сусветнай супольнасці прапанову пра роспуск Швейцарскай канфедэрацыі. Прычынай стаў канфлікт паміж швейцарскай паліцыяй і адным з яго сыноў, які падарожнічаў па Швейцарыі. Канфлікт дасюль цалкам не вырашаны.

ВАНДРОЎКА

# УНІЗ ПА ВІЛІІ

## І ШТО МЫ ТАМ ПАБАЧЫЛІ

### ХОКУ ДЛЯ ВІЛЬНІ

Адной з ініцыятываў у чаканні «культурнага» 2009 года стала паэтычная акцыя, арганізатары якой заклікалі віленчукоў і гасцей сталіцы складаць хоку — японскія трохвершы, прысвечаныя Вільні. Агулам 8000 чалавек напісала 10 000 вершыкаў. Іх дасылалі па пошце, кідалі ў спецыяльныя скрынкі на вуліцах. Цяпер яны аздабляюць муры віленскіх камяніц, іх друкуюць на турыстычнай прадукцыі. Мы пераклалі з англійскай мовы некалькі хоку, сабраных на партале haiku.lt

*Вяртанне ў Вільню —*
*пара белых буслоў*
*рамантуе буслянку.*

*Мост Міндоўга —*
*хлопчык і першы вясновы вецер*
*ідуць поплеч.*

*Старая плошча на золку —*
*галубы ў чаканні*
*першых турыстаў.*

**Эдуард Тара**

*Вось мой дом,*
*вокны раскрытыя ў вецер:*
*Я распраўляю крылы.*

**Выгантас, ды-жэй радыё**

*Памятала Парыж,*
*верыла ў Рым,*
*але закахалася ў Вільню.*

**Грэта, студэнтка**

*Вільня будзе тут,*
*а я ў ёй.*
*І так назаўсёды.*

**Нэда Малюнавічутэ, спявачка**

*Берагі Віліі*
*шэпчуць адно аднаму:*
*«Кахаю».*
*Мост згарае ад рэўнасці.*

**Кейстуціс Буткус**



**Ева ВАЙТОЎСКАЯ, Алесь ГІНЗБУРГ**

**Па-літоўску вакзал «stotis». Гэта, па сутнасці, адзінае слова, якое вам неабходна ведаць у Вільні, калі вы з Беларусі. Напярэдадні дня восеньскага раўнадзенства культглядальнікі «Новага часу» таксама наведалі сталіцу суседняй Літвы.**

Толькі лянівы беларус не з'ездзіў на мінулым тыдні ў Вільню. У прыватнасці, меў месца візіт у гістарычную сталіцу беларуска-літоўскай дзяржавы сучаснай беларускай палітычнай эліты, іх дзяцей і ахоўнікаў. Падзея гэта не проста стварыла гучную інфармацыйную нагоду — яна справакавала ў айчынных СМІ цэлы выбух краязнаўчай публіцыстыкі. Адны калумністы настойліва раілі прэзідэнту краіны наведаць Вострую браму, дакрануцца да базыльянскіх муроў, закупіцца моднай вопраткай у «Акропалісе», па дарозе зазірнуўшы ў ЕГУ. Іншыя раілі ў ЕГУ ні за што не ездзіць, дый астатнія «месцы беларускай прысутнасці» абмінаць за кіламетр. Але для шараговага грамадзяніна РБ з наяўнай у пашпарце шэнгенскай візай рандэву лідэра краіны з па-еўрапейску заточанымі суседзямі лішняга разу нагадала: «О, даўно мы не пілі кавы ў Вільні!..» У тым ліку культглядальнікі «Новага часу» не прайшлі міма, далучыўшыся да шчыльных радоў тых, хто з рознымі ўік-эндавымі мэтамі фарсіраваў у разгар залатой восені раку Ашмянку.

### Па шакоціс

Ранішні цягнік на Вільню перапоўнены. Гэта, відаць, адзіны транспартны сродак у краіне, дзе беларускамоўных студэнтаў, што пакваліліся на выгадную паліцу, інтэлігентна, але настойліва зганяюць з гэтай паліцы пенсіянеры, беларускамоўныя ж. Пасажыры тут чытаюць незалежную прэсу, мытнікі з ветлівай настойлівасцю распаўсюднікаў «Арыфлэйму» прапануюць запоўніць дэкларацыю, у хлопцаў-гастарбайтэраў, што едуць праз Літву ў Швецыю, наманікюраныя пазногці.

Але вось цягнік спыняецца — і вы больш не на Радзіме, як бы ні сцвярджала адваротнае настольная кніга вашага дзяцінства — «100 пытанняў і адказаў па гісторыі Беларусі». Цэнтральны чыгуначны вакзал Вільні — адно з самых злачных і — у параўнанні з аналагічным збудаваннем у Мінску — бязлюдных месцаў літоўскай сталіцы. Па-літоўску вакзал «stotis» — гэта, па сутнасці, адзінае слова, якое вам неабходна ведаць у Вільні, калі вы з Беларусі.

Запомніць слова «стоціс» лёгка — як правільна заўважылі ў сваім літоўскім спецвыпуску стваральнікі мультымедыя-часопіса «34», яно рыфмуецца з «шакоцісам» — традыцыйным літоўскім прысмакам, пірагом-ялінкай. Слова «стоціс» напісанае ці не на ўсім маршрутным транспарце, які ходзіць у гандлёвы цэнтр «Акропаліс» — меку беларускага шопінга. У Вільні ёсць і іншыя гандлёвыя цэнтры. «Спіну прама, калені разагнуць!» — гагочуць шведскія гастарбайтэры з манікюрам, што чакаюць перасадкі, з тых суайчыннікаў, якія паспелі ўжо закупіцца па самыя вушы, і цяпер валакуць набыткі ў камеру захоўвання.

Карацей, наш візіт у беларускі Іерусалім пачынаўся як звычайна. Сонечна, ветрана і бязлюдна. Але ўжо на подступах да гістарычнага цэнтру мы сталі адчуваць, што ў горадзе адбываюцца паранармальныя рэчы…

### Хмарачосы і ідалы

Відаць, найвялікшы культурны шок, які напаткаў коліс аднага з аўтараў гэтых радкоў (Еву) — шкляныя бізнес-цэнтры, што абступілі ў раёне Вільні берагі мілай беларускай лясной ракі Віліі. Але хай-тэку літоўцам аказалася мала. Наблізіўшыся да Віліі (Нярыса) з боку катэдральнага касцёла, мы пабачылі жалезныя каркасы фантасмагарычных формаў, якія няспешна даабляпвалі саломай людзі ў рабочых робах. Побач усталёўвалі асвятленне і дынамікі. Да галавы адразу прыйшло: да справы неяк замешаны мастак Артур Клінаў, чый фірмовы стыль — інсталяцыі сучасных прадметаў, абвяланых нейкай трасянкай. Аднак нідзе паблізу нашага выбітнага суайчынніка не назіралася. «Няўжо дзэрзкі плагіят?» — абурэнню нашаму не было мяжы. І толькі тут мы заўважылі пясок і смалу. Планы ў віленчукоў былі яўна неронаўскія. «Яны будуць гэта паліць!» — здагадаўся Алесь, і журналісцкі інстынкт пагнаў нас бліжэй да саламяных пачварынаў, каб дазнацца, навошта яны будуць гарэць. Рабочыя патлумачылі як маглі: заўтра дзень роўны ночы, вось і палім. Язычніцтва-с. Прыходзьце, як сцямнее, — адразу пачне гарэць.

У шоку ад пачутага, мы выправіліся ўздоўж ракі ў кірунку сабора Пятра і Паўла, жамчужыны віленскага барока. Але, не дайшоўшы колькі соцень метраў да шэдэўра архітэктуры, натыкнуліся на новую дзіўную групу таварышаў. Тыя майстравалі замак з лазы, абмотваючы каркас белай паперай. «Мы ведаем, вы будзеце гэта паліць!» — ачмурэла закрычалі мы. Нас не зразумелі. Мы пераклалі пытанне на англійскую мову, і пачулі адказ: «Не, паліць будуць уверх па рацэ. А мы проста падключым гірлянду ліхтарыкаў і пусцім па вадзе. Каб плавала». Ладна-ладна, падумалі мы, і працягнулі свой шлях.

Ці доўга, ці каротка мы ішлі, але дарога наша прывяла да сабора святой Ганны, куды Максім Багдановіч у знакамітым вершы раіў усім ісці ў Вільні. Бралася на цемру. На фоне шараючага неба стаяў задуменны літоўскі паэт Адомкас Міцкявічус. Вакол паэта насіўся азіят з валасамі саламянага колеру. У руцэ ў яго было чучала ці то вароны, ці крумкача. За хлопцам па коле вакол помніка насілася з дзікім гвалтам зграя варонаў. Іншыя азіяты хаваліся ў кустах праз дарогу. У іх быў мегафон, з якога даносілася карканне, яны здымалі падзеі на відэа і фотакамеры. Пры гэтым віленчукі навокал паводзілі сябе так, нібы гэта дзеці гуляюць у дваровы футбол. Мы зноў не вытрымалі: «Божухна, а вы-та што робіце?» «Перформанс!» — з гонарам адказалі маладыя людзі, якія прадставіліся японцамі. «Арт!» Іншых англійскіх словаў яны не ведалі. Няхай і загартаваныя «Чароўным трусікам» Юры Дземідовіча, мы стаялі агаломшаныя акультнасцю ўсяго, што адбывалася. Адомкас Міцкявічус, чый профіль вымалёўваўся на фоне готыкі святой Ганны, здавалася, складаў, гледзячы на ўсё гэта, нейкія інфернальныя хайку.

Чым бліжэй да старога горада, тым больш было клаунады. Спачатку да нас падышла група п'яных маладых людзей у арыштанцкіх робах і запрасіла «далучацца». «Да чаго??? — закрычалі мы. — Які яшчэ перформанс?? Мы проста прыехалі паліць кавы!» «Да хлапечніка! — абвясцілі «зэкі». — Вось гэты, — яны паказалі на самага п'янага, — жэніцца. Развітваецца са свабодным жыццём. Мы ж усе з Лукішак? Чулі? Турма там у нас». Ветліва адмовіўшыся ад паласатага таварыства, мы праз пару хвілін сустрэлі групу дзяўчат у эратычнай школьнай форме. Па-руску сярод паненак ніхто не гаварыў, але было відавочна: жаніха даганяе нявеста.

З усіх ног мы кінуліся назад да Віліі. Там акурат пачыналі паліць саламяных ідалаў.

### Харошая гісторыя

У 2009 годзе Культурнымі сталіцамі Еўропы былі прызначаныя аўстрыйскі Лінц і Вільня. Адмысловая праграма Еўрасаюза дбае пра тое, каб пэўны багаты культурна і гістарычна горад трапіў у цэнтр увагі прэсы, турыстаў, інвестараў з усяго свету. Гэта дапамагае розным цікавым куточкам зямлі яшчэ больш упэўніцца ў сваёй пекнаце і здабыць сродкі на культурныя ініцыятывы, адрэстаўраваць старыя будынкі, адчыніць новыя тэатры, галерэі. Праграма стараецца ахапіць тыя гарады, якія звычайна знаходзяцца ў ценю ўсімі прызнаных культурных монстраў.





Штогоду ганаровае права і пачэсны абавязак культурнай сталіцы неадменна здабывае нехта з новых чальцоў Еўразвязу. У 2010 годзе гэта будзе вугорскі Печ, у 2011 годзе — Талін, у 2014 — Рыга. Сёлета — Вільня. Галоўная канцэпцыя віленскіх культурных падзеяў–2009 — «Мастацтва ў незвыклым месцы». З-за кожнага рога, у чым мы маглі пераканацца, круглы год на вас выскокваюць мастакі ды перформеры. Што натхняе на карнавал і простых жыхароў суседняй Прыбалтыкі. Менавіта гэтак трэба тлумачыць усе незвыклыя сустрэчы, якія з намі здарыліся…

Горад павінен прадэманстраваць свету сваю «фішку». Мінулагодні Ліверпуль патрасаў «Бітламі» і пазіцыянаваўся як цэнтр сучаснай музыкі. Літоўцы культывуюць сваё паганства. Таму на мінулых выхадных над Віліяй пад манатонны балтыйскі фольк павольна і прыгожа гарэлі ідалы. «Што тут адбываецца?» — цяпер ужо на нас накінуліся турысты з Індыі. «Мы не тутэйшыя, — важна тлумачылі мы ім, — але гэта такая гульня з народнымі абрадамі». Па мосце кудысьці спяшалася манахіня. «Я павінна даведацца, што яна пра гэта думае!» — сарвалася з месца Ева, выцягваючы дыктафон. «Яны пакланяюцца істуканам. Ваш каментар?» — «It's a good history (Гэта харошая гісторыя)», — усміхнулася манашка. — And it's very beautiful (І гэта вельмі прыгожа)». Ідалы дагаралі, балцкі фольк аціхаў.

***

Увечары віленскі чыгуначны вакзал запаўняюць адно бамжы, бамжы-наркаманы, бамжы-трансвеститы і жыхары Беларусі, якія чакаюць цягнік дадому. Заблукаць у Вільні немагчыма — культурная памяць выводзіць на Вострую браму, а інстынкт — на «стоціс».

ПОГЛЯД

# ПАЧАТАК КАНЦА

Пісьменнік і публіцыст Кастусь Тарасаў даўно і грунтоўна вывучае гісторыю сярэднявечнай Беларусі. Ён адзін з тых беларускіх інтэлектуалаў, хто ў сваёй творчасці сцвярджае нацыянальную канцэпцыю беларускай гісторыі. Аўтар шматлікіх апавесцяў (дзве з іх можна прачытаць на нашым сайце ў раздзеле «Літаратурная Беларусь»), мноства нарысаў і артыкулаў пра падзеі і людзей таго часу. Ну, а паколькі пераасэнсаванне гісторыі заўсёды выклікае дыскусіі, мы гатовы надрукаваць і іншыя меркаванні.

Кастусь ТАРАСАЎ

**У XVI стагоддзі Маскоўскае княства і Польскае каралеўства сышліся ў вайне за перадзел земляў Вялікага княства Літоўскага. Гэты перадзел цягнуўся з перапынкамі амаль пяцьсот гадоў.**

## «Залаты век»

Беларускія публіцысты называюць XVI стагоддзе нашым «залатым векам». Францыск Скарына пачаў усходнеславянскае кнігадрукаванне. На Беларусь прыйшла рэфармацыя. Друкарні выпускалі свецкія кнігі, распаўсюджваючы веды сярод жыхароў дзяржавы. Сымон Будны ў Нясвіжскай друкарні выдаў на беларускай мове «Катэхізіс». Як грыбы выраслалі мястэчкі і гарады. Магнаты — Валовічы, Радзівілы, Кішкі, Пацы, Сапегі ды іншыя — запрашалі да сябе рамеснікаў і давалі новым селішчам магдэбургскае права.

На такім ганарлівым фоне застаюцца незаўважанымі некаторыя пытанні. Напрыклад, чаму наш першадрукар Скарына апынуўся лішнім на радзіме і быў змушаны вярнуцца ў Прагу? Або чаму ў 1563 годзе ў Брэсцкай друкарні, заснаванай Радзівілам, выдаецца пераклад Бібліі на польскую мову? Або чаму абаронца самастойнасці ВКЛ Мікалай Радзівіл Руды выдае польскія кнігі ў 1572 годзе ў нясвіжскай «печатне»? Няўжо яны ўмацоўвалі ліцвінскую самасвядомасць і дзяржаўную самастойнасць? Чаму беларускі асветнік Сымон Будны выпусціў на беларускай мове толькі «Катэхізіс», а ўсе астатнія свае працы надрукаваў на польскай мове? Каго ж ён прасвятляў па-польску ў Клецку, Іўе, Заслаў'і, Вішневе? Ці Віленская езуіцкая акадэмія служыла духоўным мэтам Вялікага княства, узначаліўшы каталізацыю і паланізацыю ў сферы асветы? Ці ёсць у яе гісторыі хоць адзін прафесар, які чытаў свaім студэнтам або пісаў хоць нейкі курс на беларускай мове?

Ніяк не суадносіцца з атмасферай «залатога века» пакаранне пратэстанта Франкуса Франка ў Вільні ў 1611 годзе. Гэты чалавек падчас працэсіі Божага цела звярнуўся да яе ўдзельнікаў са словамі, што не трэба пакланяцца госціі як Богу. Праз некалькі тыдняў Франка быў асуджаны, і кат на рынкавай плошчы вырваў яму язык, чацвертаваў цела і падвесіў на крук. Усе спробы беларускіх кальвіністаў выратаваць італьянскага пратэстанта аказаліся дарэмнымі, таму што смерці для яго патрабавала польская каралева Канстанцыя і каралеўскі духоўнік Пётр Скарга.



Жыгімонт Аўгуст



Мікалай Радзівіл Чорны

## Час далучэння

У 1558 годзе Іван IV распачаў Лівонскую вайну за Балтыйскае ўзбярэжжа, а праз тры гады цар перанёс тэатр вайсковых дзеянняў на тэрыторыю Беларусі. Маскоўскія войскі захапілі Полацак. Усе габрэі былі патопленыя ў Дзвіне, каталікі высечаныя, тысячы палачан пагнаныя ў рабства, маёмасць разрабавана. Пераможныя бітвы з маскалямі пад Улай, Невелем, Чашнікамі стратэгічна сітуацыю не змянілі. Паколькі да этнічных польскіх тэрыторый рускім было яшчэ ісці ды ісці па ліцвінскіх землях, то польскія радныя паны адчулі, што надышоў момант для канчатковага далучэння ВКЛ.

Сумесны сойм Вялікага княства і Кароны Польскай пачаўся ў студзені 1569 года ў Любліне. Палякі настойвалі на безумоўным уключэнні ВКЛ у склад Польшчы. Нават сама назва «Літва» выключалася з назвы дзяржавы, манарх павінен быў мець толькі адзін тытул — «Кароль Польшчы». Ліцвіны, са свайго боку, патрабавалі федэрацыі і выбараў агульнага кіраўніка на сумесным сойме на памежжы двух краін, прапаноўвалася, што ў Кракаве манарха будуць каранаваць каралём Польшчы, у Вільні — вялікім князем літоўскім.

Вялікакняжацкія магнаты на такія ўмовы былі не згодныя, і таму пакінулі сойм. У адказ 5 сакавіка Жыгімонт Аўгуст выпусціў эдыкт аб «вяртанні», з неадкладным уключэннем у склад Польшчы Валыні і Падляшша. Праз тры дні ён аддаў загад панам і дэпутатам шляхты Валыні і Падляшша з'явіцца 27 сакавіка на сойм і прысягнуць на вернасць польскай кароне. На гэтыя землі былі ўведзеныя польскія войскі.

Гэта беспрэцэдэнтная польская анексія вялізнай тэрыторыі выклікала абурэнне ў Вільні, асабліва сярод магнатэрыі, ліцвіны нават намерваліся пачаць вайну з Польшчай. У Падляшша і Валынь былі разасланыя загады аб мабілізацыі на вайну. Але далей крыкаў справа не зрушылася: Вялікаму княству, аслабленаму вайной з Масковіяй, не заставалася нічога іншага, як вярнуць сваю дэлегацыю ў Люблін.

Да таго дня, калі дэпутацыя вярнулася на сойм, Вялікае княства Літоўскае ўжо пазбавілася ўсіх сваіх украінскіх уладанняў — гэта значыць, трацiны ўсяго насельніцтва. Гетман Хадкевіч слёзна прасіў сойм аб вяртанні ў ВКЛ адабраных абласцей, але справа была прайграна. Мікалай Радзівіл напісаў тады аб «пахаваннях і знішчэнні назаўжды раней вольнай і незалежнай дзяржавы, вядомай як Вялікае княства Літоўскае».

## Дзве дзяржавы — «адзін народ»

1 ліпеня 1569 года дамова аб уніі была падпісана, а 4 ліпеня зацверджана. І вось што самае дзіўнае: гэты гвалтоўны захоп земляў іншай дзяржавы, наўпростаую анексію, шматлікія беларускія гісторыкі не кваліфікуюць як першы падзел Вялікага княства. Ваенна-палітычная аперацыя, якая падарвала дзяржаву, змяніла плынь жыцця на вялізных тэрыторыях, згадваецца ў заўвагах. Між тым, падпісанне Люблінскай уніі з'яўляецца чорным днём у гісторыі ВКЛ. У Еўропе ўтварылася найбуйнейшая дзяржава — Рэч Паспалітая са сталіцай у Варшаве, якая па тэрыторыі саступала толькі Асманскай імперыі і Маскоўскаму царству, займаючы звыш 800 тысяч квадратных кіламетраў і маючы больш 8 мільёнаў чалавек насельніцтва.

Да 300-годдзя Люблінскай уніі мастак Ян Матэйка напісаў вялізнае палатно, прысвечанае гэтай гістарычнай падзеі. Яно экспануецца ў Люблінскім замку, уваскрашаючы даўнюю ўрачыстасць палякаў і змрочны смутак прадстаўнікоў пераможанага ВКЛ. На карціне ўсе літвіны пастаўлены на калені для клятвы каралю. Стаяць і енчаць ад смутку: рэальна Вялікага княства ўжо няма, гэта ўжо правінцыя Польшчы на чале з прызначэнцамі з ліку мясцовай магнатэрыі.

Акт Люблінскай уніі ад 1 ліпеня 1569 года абвяшчаў Польскае каралеўства і ВКЛ «адзіным непадзельным і неразрозненым целам», агульнай Рэччу Паспалітай, якае злучыла «ў адзін народ дзве дзяржавы і два народы». ВКЛ захавала за сабою некаторыя рэшткі аўтаноміі — войска, суд, адміністрацыю і асобныя законы. Сярод 140 сенатараў на вальных соймах толькі 27 былі ліцвінамі.

Старое пакаленне сыходзіла ў нябыт, маладое "адукаванае", спаланізаванае ў калегіумах, на сойміках, у касцёле, выходзіла да жыцця і будавала Рэч Паспалітую польскую, датоптваючы ўласную дзяржаўнасць.

Далёкі быў ад адчування «залатога веку» аршанскі староста Філон Кміта Чарнобыльскі ў сваіх характарыстыках уладарных сучаснікаў і прагнозах будучыні, што захаваліся ў яго лістах: «А людзі гэтай дзяржавы? Якіх паслуг яны патрабавалі? Якой шчодрасці? Толькі дай! Якая справядлівасць? Багатаму так, а ўбогаму сяк! Якое сумленне? Хто не заўгодны, таго праз нагу! А прагнасць? Хоць свет раздай, душ польскіх і літоўскіх гэта не насыціць, усё мала! ...А падзяка? Сёння аб тым добра гаворыць, а раніцой смердам, ублюдкам кліча! Усё паскудства, усё хлусня, няма Бога! Бі, забівай, дзяры, рабуй — то найлепшы пан і то рыцар! ...А некаторыя гавораць: «Не дай Бог ляху быць каралём! Выража Літву, а Русь і пагатоў!» Даўно рэзаць пачалі літвіна. А той па натуры прыроджанай сваёй так необачлівы, проста як авечка: дзе іх больш воўк хапляе, там яны далей за ім ідуць! Больш будзе служыць народу польскаму, чым свайму!»

## Польская мова

Леў Сапега ўдзельнічаў у падрыхтоўцы Статута 1588 года. Ён быў напісаны і выдадзены на беларускай мове. Яшчэ задоўга да Патопу (войны 1648–1651, 1654–1667 гадоў), з якім злучаюць пераход шляхецкай масы ВКЛ да выкарыстання ў побыце польскай мовы, беларускія выдаўцы ў 1639 года надрукавалі асноўны закон дзяржавы — Статут 1588 года — у перакладзе на польскую мову. Уласна, для каго? Не палякам жа ў Кароне ён быў патрэбны — ён быў выдадзены для чытання «народам» Вялікага княства.

Сумным падрахункам аб'яднання «двух народаў» сталася поўная адмова беларускай шляхты ад сваёй мовы і пераход на польскую. Якія сляды дзяржаўнасці пасля гэтага шукаць? Ні адзін з беларускіх магнатаў не асмеліўся арганізаваць хоць нейкі рух для выратавання Айчыны ад такой згубы, а калі хто вырашаў прасіць пратэкцыі ў шведаў або рускіх, дык толькі ў выпадках, калі падступаліся асабістыя няшчасці, як страта нерухомасці або важных пасад.

Беларуская мова ў справаводстве спачатку перайшла з кірыліцы на лацінку, а следам, натуральна, у "федэратыўнай" Рэчы Паспалітай, была выцеснена польскай мовай. Ужо пры Жыгімонце Старым лісты да літоўскіхураднікаў каралеўская канцылярыя афармляла лацінкай.

Але задоўга да таго, яшчэ ў 1529 годзе, «абаронца самастойнасці» ВКЛ Мікалай Радзівіл Чорны ў лісце да папскага легата Ліпамана просіць дазволу на ўвядзенне літургіі на польскай мове ў касцёлах Вялікага княства. Навошта гэта яму было трэба? Спяшаўся насустрач жаданням польскамоўнага кліру. Наша магнатэрыя першай перайшла на мову Кароны, за ёю рушыла ўслед «вольная» шляхта. У 1633 годзе ў Вільні выходзіць на польскай мове азбука для дзяцей. Не для польскіх жа дзетак — для сваіх, ліцвінскіх.

Генеральная канфедэрацыя шляхты ВКЛ, у першую чаргу беларускай, у 1696 годзе прыняла пастанову, каб пісар земскага ваяводскага суду, дзе будуць праходзіць Галоўныя Трыбунальскія суды, запісваў пастановы па-польску, а не па-беларуску. Так адно з важных дасягненняў канцлера Льва Сапегі было адпраўлена ў архіў. Беларуская мова перастала быць публічнай мовай органаў улады, яе юрыдычная і канцылярская лексіка перастала развівацца.

Такім чынам, 1569 год можна смела лічыць годам страты дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага. А ўжо пасля былі падзелы: тры рускіх, польскі і савецкія.



Ян Матэйка. Люблінская унія. Пачатак XVII ст.

▸ ВЫСТАВЫ

# АД РАФАЭЛЯ ДА СУЧАСНАГА МАСТАЦТВА

Аляксей ХАДЫКА

**Надыход восені хутка ажывіў музейна-выставачную панараму сталіцы пасля жнівеньскага заспакаення, прапанаваўшы жыхарам сталіцы відовішча living рознага кшталту — ад вяртання рэнесансавай класікі да сучаснага авангарднага мастацтва.**


Рафаэль Санці. Сіксцінская Мадонна. Пасля 1512

## БЕЛАРУСКІ СЛЕД РАФАЭЛЯ

Пачнём ад Рафаэля Санці (1483–1520), аднаго з трох найвядомейшых жывапісцаў італьянскага адраджэння, каб прыгадаць некаторыя сюжэтныя лініі, якія звязваюць гэтую постаць з Беларуссю. І дзеля гэтага адправімся ў XVIII стагоддзе.

Перыяд праўлення Аўгуста III ў Рэчы Паспалітай, распачаты ўмяшаннем суседзяў, Саксоніі і Расіі, недарма называюць часам палітычнай анархіі. Мноства сарваных соймаў, фавартызм і панаванне магнацкіх груповак падрывалі палітычную стабільнасць краіны. Але ж гэтыя гады агульнапрызнана лічацца часам уздыму эканомікі (менавіта тады расквітнелі мануфактуры) і культурнага пад'ёму — колькі магнацкіх палацаў аздаблялася намаганнямі заможных гаспадароў! А вось каралеўскія даходы ў значнай ступені пераразмяркоўваліся на саксонскія ўладанні, а ў тым ліку на развіццё Дрэздэнскага мастацкага збору, які Аўгуст прыняў ад бацькі, таксама караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II Моцнага, у складзе каля пяці сотняў мастацкіх твораў, а пакінуў нашчадкам пашыраным да пяці з паловай тысяч. І падобна да свайго наступніка, Станіслава Аўгуста Панятоўскага, нярэдка быў крытыкаваны менш прыязнымі да мастацтва сучаснікамі за неадпаведнае ўладару дзяржавы «марнаванне сродкаў».

Але зарobленыя мазалём жыхароў нашых земляў грошы не зніклі дарэмна, звязаўшы гісторыю самага знакамітага палатна Рафаэля, «Сіксцінскай мадонны», намаляванай пасля 1512 года для царквы Св. Сікста ў італьянскай Пьячэнцы, з нашай мінуўшчынай. Можна сказаць, нашы продкі фінансавалі набыццё абраза за рэкордную для XVIII стагоддзя суму ў 20 тысяч цэхінаў у 1754 годзе. Цэхін — назва венецыянскага залатога дуката вагой у 3,5 грама (ад назвы манетнага двара la Zecca), бітага з 1284 да падзення Венецыянскай рэспублікі ў 1797 годзе, манеты цяжкай і паўнавартаснай. Для параўнання прыгадаем, што выданне ці не самай дарагой беларускай кнігі, Берасцейскай Бібліі 1563 года, каштавала апекуну беларускіх пратэстантаў віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу Чорнаму 10 тысяч залатых дукатаў, эквівалент гадавых даходаў з усіх маёнткаў гэтага заможнага магната.

Прыгадаць беларускі след Рафаэля нас падштурхнула выстава «Жывапіс разцом», якая працуе з 2 верасня па 5 кастрычніка ў Нацыянальным мастацкім музеі на галерэі ў пераходзе да новага корпусу (куратар — Святлана Ракоп'ева). Адчыненая без вялікага шуму, экспазіцыя прапануе пазнаёміцца з гравюрамі мастакоў пераважна XVIII стагоддзя паводле выкананых вялікім Рафаэлем у тыя ж гады, калі і знакамітая Мадонна, фрэсак залаў Ватыканскага палаца — Лоджый (час стварэння 1517–1519) і г. зв. Станцаў (1508–1517), папскіх апартаментаў, а таксама жывапісных кардонаў, эскізаў для дываноў для Сікстынскай капэлы. Яны паступілі на выставу з прыватнага збору і калекцыі музея.

Менавіта XVIII стагоддзе — час росквіту рэпрадукцыйнай графікі. У тыя ж часы гравюра зрабілася падставай праслаўлення мастацкай спадчыны Рафаэля Санці. Над стварэннем серыі гравюр «Лоджы Рафаэля ў Ватыкане» працавалі вядомыя рымскія майстры-гравёры Джавані Вальпата (каля 1735–1803) і Джавані Атавіяні (каля 1735–1808), а таксама рысавальшчыкі — Гаэтана Саварэлі, П'етра Кампарэзі, Людавіка Тэсеа. Апублікаваныя ў 1772, 1776 і 1777 гадах у Рыме ў трох серыях і ў 46 гравюрах працы адлюстравалі дэкаратыўнае ўпрыгажэнне пілястраў, роспісы скляпенняў і люнетаў (біблейскія сюжэты, так званая «Біблія Рафаэля»), і гратэскі (трэцяя серыя), фантазіі гравёраў на матывы роспісаў мастака.

Пазней, у 1770–1780-я гады, з'явіліся лісты «Станцыі Рафаэля ў Ватыкане» Джавані Вальпата. Серыя ўключала 9 гравюр, што ўзнаўлялі такія класічна вядомыя зараз фрэскі Рафаэля ў Ватыканскім палацы, як «Афінская школа», «Дыспут», «Выгнанне Геліядора», «Парнас», «Пажар у Барго», «Імша ў Бальсэне», «Вызваленне апостала Пятра з вязніцы» і іншыя. Яшчэ адзін сюжэт на выставе — гравюры з кардонаў Рафаэля для ватыканскіх дываноў, зробленыя ў Англіі ў 1711–1719 гадах.

У цэлым высакародства першакрыніц і выключная якасць гравюр вартыя спецыяльнага з імі азнаямлення. Тым болей, што, як адзначаюць стваральнікі экспазіцыі, гэтыя серыі гравюр, якія былі вельмі папулярныя ў свой час. Даўно зрабіліся рарытэтамі калекцыянерскага рынку, і сама магчымасць сабраць іх разам у адзінай экспазіцыі — унікальная з'ява. І гравюры зрабіліся тым мастком, праз які спадчына Рафаэля глыбока прасякла мастацкую культуру еўрапейскіх краін. Нават у беларускіх народных абразах Усходняга Палесся адным з самых папулярных сюжэтаў у XIX стагоддзе зрабілася «Мадона ў крэсле» паводле Рафаэля.

## З ГІСТОРЫІ ДАХУ

Што тычыцца міжнароднай выставы сучаснага мастацтва — жывапісу, графікі, інсталяцый, паказу перформансаў і відэаарту «ДАХ–IX», то гэтая поліфанічная і шматкаляровая дзея, якая афіцыйна пачалася з 25 жніўня, і доўжылася да 20 верасня. Гісторыя праекта «ДАХ» пачыналася ў 2001 годзе ў Берліне, калі ў незалежным артцэнтры Тахелес (Tacheles, ці то — «вышэйшая кропка яднання людзей») беларускія мастакі Алесь Тарановіч і Ігар Ермакоў арганізавалі выставу «ДАХ–1». Ужо тады вызначыўся сінтэтычны характар «ДАХаў»: жывапіс, інсталяцыі, а таксама перформансы, паэтычныя чытанні.

Пазней вядомы жывапісец і адзін з першых перформераў Беларусі Алесь Родзін, які займеў у Тахелесе майстэрню і правёў там шэраг сваіх выставаў, арганізуючы чарговыя «ДАХі», прывозіў іх і ў Беларусь: «ДАХ–7» з твораў яго сяброў па гэтым доўгатэрміновым праекце ў Германіі дэманстраваўся год таму ў Музеі сучаснага мастацтва. На сёлетнім этапе яго куратары Алесь Родзін і Зміцер Юркевіч супрацоўнічаюць з Саюзам мастакоў, дзякуючы чаму праект набыў незвычайны размах у прасторы і часе, зліўшыся з выставай «Ахвяры мастацтва», чарговым фестывалем перформансу «Навінкі», шматлікімі тэатральнымі і музычнымі вечарынамі і паэтычна-літаратурнымі прэзентацыямі.

Цэлую серыю выданняў прэзентавала літаратурнае выдавецтва «Галіяфы». Дастаткова новага і нябачанага, і ўсё разам, у агульным памяшканні выставачнай прасторы і працягласці ў часе — ствараючы адчуванне незвычайнай для Мінска творчай свабоды, хіба што падзабытай з пачатку 1990-х гадоў. «ДАХ-IX» сабраў каля 150 аўтараў з 11 краін: Беларусі, Германіі, Нарвегіі, Італіі, Польшчы, Украіны, Расіі, Нідэрландаў, Японіі, ЗША і Ізраіля, зрабіўшыся рухомым праектам, дзе экспазіцыя рэгулярна абнаўлялася. Дзе побач з замежнымі творцамі (іх работы прадстаўляў як суарганізатар фестывалю сам берлінскі Kunsthaus Tacheles) і паказамі эфемернага і хуткаплыннага віджэйнга прыстойна экспанаваліся і працы беларускіх «саюзных» мастакоў — тых, хто патрапіў дапасавацца ў праект.

Сэнс удзелу ў мерапрыемстве Саюза мастакоў, як заўважыў адзін з яго кіраўнікоў Рыгор Сітніца, у тым таксама, што творчасць маладых, якія ўспрынялі ідэі мастацтва найноўшага часу, з працягам «ДАХу» ў далейшым знойдзе сабе дарогу ў Берлін.


У залах выставы «ДАХ–IX»

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 25.09.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.